Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 11 (4506) 20 сакавіка 2009 г.

У нумары:

Як Акопы — для Купалы...

Рагачоўшчына і Уладзімір Караткевіч — непадзельнае.

Стар. 4

Са Швецыі — па беларускі лес

Новыя вынікі пошукаў «шведскага следу» ў Беларусі.

Стар. 5

А крытык працуе з тэкстам

Новы раман Л. Дайнекі — пад пільнай увагай чытачоў і крытыкаў.

Стар. 6

Галоўнае — добры настрой

Старадаўнія музычныя інструменты ад віцебскага майстра.

Стар. 10

У Беларусі ёсць і начныя, і стрып-бары

Пісаць можна пра ўсё, вось толькі як пісаць?..

Стар. 12—13

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 7390 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 9580 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 4950 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры і адукацыі: 1 месяц — 7500 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Атуленыя таемным

Праца даўніх майстроў, чые імёны ў большыні сваёй для нас невядомыя, сілкавалася верай, малітвай, божым бласлаўленнем. І выходзілі з-пад рукі іканапісца ці разьбяра сакральныя творы — натхнёныя подыхам нябёсаў і ўкаранёныя ў зямное жыццё. Многія гады і нават стагоддзі знаходзіліся яны ў алтарах праваслаўных цэркваў, касцёлаў, уніяцкіх храмаў; дзівілі, вабілі, атулялі сваёй невытлумачальнай таемнасцю. Наш міралюбны і шматканфесійны беларускі край, насуперак волі свайго талерантнага люду, спазнаў і агрэсіўна-бязбожныя часы: храмы рабаваліся, спаганьваліся, руйнаваліся; агонь і цвіль знішчалі драўляную скульптуру, абразы; цемрашальства засціла здаровую свядомасць, разбурала душы. Вядома, варварства мусіла ўрэшце адступіць перад народнай мудрасцю, глыбокай верай і навуковым розумам. Страчанага не вернеш. Аднак...

На выстаўку "Алтарны жывапіс Беларусі XVIII — пачатку XIX стст." запрашае Нацыянальны мастацкі музей

У сярэдзіне XX стагоддзя, калі па ўсёй рэспубліцы разгарнулася ганебная "барацьба з рэлігіяй", навукоўцы, у тым ліку супрацоўнікі Дзяржаўнага (цяпер Нацыянальнага) мастацкага музея Беларусі, пачалі ладзіць экспедыцыі да зачыненых і "перапрафіляваных" помнікаў культавага дойлідства. З цягам часу ўдалося забраць адтуль і захаваць нямала хрысціянскіх ды агульначалавечых каштоўнасцей, уратаваць ад глуму ці продажу замежным калекцыянерам нашы нацыянальныя святыні — абразы, фрагменты маляўнічага дэкору і драўлянага аздаблення алтароў...

Праца па рэанімацыі самабытнага беларускага іканапісу вядзецца гадамі. Гэта бясконцы, карпатлівы і, можна сказаць, запаволены (і не танны!) навукова-творчы працэс, які ўключае экспертызу, скрупулёзнае даследаванне, вытанчанае мастацтва рэстаўратараў. Дарэчы, перш чым убачыць старажытныя ўзоры выяўленчай творчасці, якія набылі другое жыццё, наведнікі музея знаёмяцца з фотаэкспазіцыяй адноўленага алтарнага жывапісу ў аўтэнтычных храмавых інтэр'ерах Беларусі. Гэтую ўражлівую серыю здымкаў зрабіў М. Мельнікаў. А яго калега Д. Казлоў сфатаграфаваў рэстаўратараў за працай — падчас падрыхтоўкі музейнай выстаўкі. Вось іх імёны: Святлана Дзікуць, Дзмітрый Карлёнаў, Эла Пашкіна, Святлана Алішэвіч, Святлана Ішмаева, Сяргей Шаціла.

Паказ нашых адроджаных духоўных каштоўнасцей з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея прымеркаваны да яго 70-годдзя, зладкаваны пры падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі і кампаніі "Брытыш Амерыкан Табака". Падчас адкрыцця выстаўкі з кароткімі прамовамі выступілі дырэктар музея Уладзімір Пракапцоў, намеснік міністра культуры Беларусі Віктар Кураш, намеснік ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей Уладзімір Ламека, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь Святлана Сухавей, кіраўнік аддзела адукацыі і катэхізацыі Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы іерэй Аляксандр Шымбалёў і каталіцкі арцыбіскуп Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч, які, між іншым, адзначыў, што "такія выставы — гэта час і месца, дзе можна сустрэцца са святасцю".

Алтар — слова дахрысціянскага лацінскага паходжання: altaria (altus — высокі, alta ara — узвышанае месца) у літаральным сэнсе азначае "ахвярнік". Старажытныя народы Еўропы і Бліжняга Усходу будавалі яго ва ўшанаванне багоў — у выглядзе агменя на свяшчэнных месцах. У раннім хрысціянстве алтаром называлі стол, на якім гатавалася і размяркоўвалася прычасце. У праваслаўных і каталікоў алтар — месца, дзе святары правяць сакральныя дзеянні, — усталёўваецца на ўзвышэнні ва ўсходняй частцы храма.

У экспазіцыі прадстаўлена 33 творы, многія дэманструюцца ўпершыню. Стваральнікі унікальнай выстаўкі мелі на мэце паказаць шматстайную прыгажосць сакральнага айчыннага жывапісу, характэрную для стылю барока. І падкрэсліць пры гэтым, што духоўнае жыццё ў Беларусі здавён развівалася ў суіснаванні розных канфесій, а мастацтва засноўвалася на дзвюх хрысціянскіх традыцыях: праваслаўнай і каталіцкай.

Удумлівы наведнік прасочвае тут вытокі беларускай школы іканапісу, на фарміраванне якой істотна паўплываў рэнесансны жывапіс Еўропы (асабліва гэта выявілася ў алтарных творах для касцёлаў). А яшчэ — засяродзіцца на выразных прыкладах фальклярызацыі касцельнага і царкоўнага мастацтва, насычэння сакральных сюжэтаў рэаліямі навакольнага жыцця, выкарыстання пазнавальных мясцовых штрыхоў у кананічнай іканаграфіі. Вядома, што такі відавочны жыццёвы, народны ўхіл надаваў выявам большую пераканальнасць, рабіў біблейскія сюжэты зразумелымі для простых парафіян. Нездарма сакральнае мастацтва пэўны час трактавалі як "біблію для непісьменных": маўляў, што адукаваным людзям дае Святое пісанне, то людзям простым — маленны абраз.

Аглядаючы выстаўку, звяртаеш увагу на эвалюцыю беларускай іканаграфіі, якая ўражвае сваёй самабытнай разнастайнасцю: тут і разгорнутыя, з элементамі пейзажу, рэлігійныя карціны, і непаўторны, надзіва дасканалы абраз "Маці Божая Жыровіцкая" (1751 г.) з вясковай царквы, і рэдкасны ўзор жыційнага абраза — "Святы Ануфрый у жыцці" (сярэдзіна XVIII ст.)... Некаторыя гледачы, прыпыняючы крок, ціха моляцца ля таемных выяў, у якіх рукатворная дасканаласць спалучылася з ўзнёсласцю духу, вернасць традыцыям быцця зямнога — з верай у жыццё вышняе і вечнае.

▼

Выстаўка "Алтарны жывапіс Беларусі XVIII — пачатку XIX стст." адкрылася ў мінулым месяцы і працягнецца амаль да канца красавіка.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Фота Кастуся Дробава

Пункцірам

• У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрылася выстава "Белая ружа", прысвечаная супраціву студэнтаў Мюнхена гітлераўскаму рэжыму ў 1942 — 1943 гадах. "Белая ружа" — гэта моладзевая група, якая распаўсюджвала на тэрыторыі Германіі антыфашысцкія ўлёткі. Да нядаўняга часу ў краінах былога Савецкага Саюза пра групу было практычна нічога невядома, хоць адзін з яе арганізатараў Аляксандр Шморэль і лічыў сваёй радзімай Расію. Яго маці была рускай па нацыянальнасці.

• 16-19 сакавіка ў Магілёве прайшоў XII фестываль польскага кіно. Праграма фестывалю прысвячалася мінуламу Дню жанчын. Спецыяльна для іх былі прадэманстраваны тры рамантычныя стужкі рэжысёра Рышарда Заторскага — "Толькі кахай мяне", "Ніколі ў жыцці!", "Чаму не!". Для аматараў вясёлага жанру была паказана камедыя Юліуша Махульскага "Грошы — гэта яшчэ не ўсё". Арганізатарам фестывалю выступіў магілёўскі Дом польскі.

• Распачата праца па падрыхтоўцы праекта ўзнаўлення фрагментаў Мінскага замчышча XI—XVII стагоддзяў. Пра гэта 11 сакавіка на прэс-канферэнцыі паведаміў Дзмітрый Яноўскі, намеснік дырэктара КУП "Мінская спадчына". Гаворка ідзе аб музеефікацыі часткі замчышча. Але пакуль няма заключэнняў праекціроўшчыкаў і даследчыкаў, цяжка гаварыць якім будзе канчатковы праект. Заключэнні павінны з'явіцца ў другой палове гэтага года. І тым не менш, ужо цяпер разглядаецца магчымасць экспаніравання вядомых Мінскіх варотаў, рэшткі якіх былі знойдзены падчас будаўніцтва станцыі метро "Няміга".

Мінскі замак быў узведзены ў другой палове XI стагоддзя на правым беразе Свіслачы для абароны паўднёвых межаў Полацкага княства. У XII—XIII стагоддзях у замку пражывала каля 500 чалавек. На яго тэрыторыі размяшчаліся цэрквы Мікалаеўская і Раства Маці Божай. У канцы XVII стагоддзя замак пачаў прыходзіць у заняпад.

• У выдавецтве Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта ў Вільні выйшла кніга Захара Шыбекі "Гарадская цывілізацыя: Беларусь і свет. Курс лекцый". Вучэбна-метадычны дапаможнік распавядае пра станаўленне гарадской цывілізацыі ў Беларусі. Кніжка складаецца з трох раздзелаў — "Горад", "Урбанізацыя", "Гараджане". Аўтар знаёміць чытачоў, найперш студэнтаў, з гісторыяй гарадоў ад старажытнасці да канца XX стагоддзя, з роляй сталіцы ў існаванні краіны, з урбанізацыяй і эканамічным прагрэсам.

• Дабрачынны фонд Арсенія Яцэнюка Open Ukraine абвясціў прыём заявак на атрыманне гранта на пераклад сучаснай украінскай літаратуры. Удзельнікі конкурсу — замежныя выдавецтвы. Праграма павінна стаць штуршком да знаёмства з украінскай літаратурай у замежжы і наладжвання міжкультурных сувязяў. На атрыманне гранта могуць прэтэндаваць пераклады твораў, што выходзілі цягам апошніх 50 гадоў у такіх жанрах, як эсэістыка, дакументальная проза, публіцыстыка. Паэтычныя пераклады не разглядаюцца. Кантактная інфармацыя на сайце bukvoid.com.ua.

• У гістарычным цэнтры Мінска з'явіцца пешаходныя зоны. Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Беларусі Ігар Чарняўскі. З сеткі транспартнага руху плануюць выключыць частку праспекта Пераможцаў і вуліцу Леніна. Пешаходнымі стануць вуліцы Рэвалюцыйная і Гандлёвая. Але гэта не выключае прысутнасці на іх тэхналагічнага транспарту. Таксама прадугледжана будаўніцтва двух пешаходных мастоў праз раку Свіслач. Разглядаецца магчымасць злучэння Троіцкага прадмесця з тэрыторыяй 2-й клінічнай бальніцы мастом над вуліцай.

Падрыхтаваў Павел РАДЫНА

Неабыякава — пра крытыку і паэзію

Сустрэчы

Як мне здаецца, разняволеныя, імправізаваныя адказы пісьменніка на пытанні аўдыторыі — найлепшая форма інтэрв'ю. Студэнты філфака БДУ, на сустрэчу з якімі нядаўна былі запрошаныя супрацоўнікі тыднёвіка "ЛіМ" Леанід Галубовіч, Янка Лайкоў, Ціхан Чарнякевіч і Жанна Капуста, прасілі выступоўцаў распавесці пра асабістую творчасць і стаўленне да жыцця, цікавіліся іх меркаваннямі наконт сучаснай беларускай літаратуры, распытвалі пра наклад, афармленне і шляхі папулярызацыі газеты. І, вядома ж, прасілі Леаніда Галубовіча прачытаць новыя вершы.

Ён, як заўжды, дэманстраваў дасціпнасць: "Паэт павінен пісаць недзе да 46 гадоў. А калі нехта ў пажылым узросце піша вершы пра каханне, то для мяне гэта смешна... Хай бы дома жонцы шаптаў, навошта бянтэжыць публіку?".

Адказваючы на разнастайныя пытанні студэнтаў, Леанід Галубовіч распавёў пра сваё стаўленне да крытыкі: "Памятаю, у 30 з гакам я надрукаваў у "ЛіМе" свае першыя артыкулы і адразу пасыпаліся адмоўныя водгукі. Я, зразумела, працягваў гнуць сваю лінію, але і прыслухоўваўся, намагаўся зразумець памылкі. Напачатку дазваляў сабе жорстка крытыкаваць аўтараў, але сёння лічу, што не трэба выходзіць за рамкі этыкі, пазбягаю занадта рэзкіх выказванняў. Аднак у "ЛіМе" часам бываюць і жорсткія, разбуральныя рэцэнзіі, але ёсць рубрыкі "Дзве думкі", "Палеміка", дзе мы імкнёмся згладзіць гэты працэс, падаць розныя меркаванні, а не пакідаць аўтара сам-насам са сваёй крыўдай".

Сярод самых цікавых сучасных аўтараў Галубовіч вылучыў Уладзіміра Някляева, Андрэя Хадановіча, Алеся Наварыча, Алеся Каско, Алеся Разанава, Андрэя Федарэнку, Марыйку Мартысевіч і Галіну Дубянецкую... А на пытанне пра стан сучаснай дзіцячай літаратуры адказаў: "Якасных беларускіх кніг для дзяцей сёння выдаецца досыць шмат, галоўнае, каб былі беларускамоўныя дзеці".

Леанід Галубовіч пазнаёміў студэнтаў з маладымі лімаўскімі крытыкамі, якія яшчэ зусім нядаўна самі сядзелі на лекцыях ва універсітэцкіх аўдыторыях: "Калектыў у нас баявы, але мы яшчэ не разгарнуліся на поўную моц, бо Жанна Капуста і Ціхан Чарнякевіч працуюць нядаўна, так што загартоўка ідзе. Акрамя таго, мы імкнёмся развіваць пазаштатны актыў маладых крытыкаў, і, зразумела, вялікія спадзяванні ў гэтым ускладаем менавіта на філалагаў". Рэдактар аддзела паэзіі і прозы Янка Лайкоў адзначыў, што студэнты філфака з'яўляюцца частымі аўтарамі і на літаратурных старонках газеты — напрыклад, маладыя паэты Ігар Кананoвіч, Маргарыта Латышкевіч ды іншыя. Ён таксама заклікаў студэнтаў не саромецца і прыносіць свае творы ў рэдакцыю тыднёвіка.

Напрыканцы сустрэчы філфакаўцы атрымалі ў падарунак ад супрацоўнікаў "ЛіМа" кнігі Васіля Гадулькі і Міколы Купрэева, што выходзілі ў РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Саша ДОРСКАЯ

На здымку: на ўспамін аб сустрэчы.

Фота аўтара

У Бішкеку цікавяцца Беларуссю

Сувязі

Адметна, што ў Вячаслава Шапавалава ёсць цікавасць і да Беларусі. Вось ёмісты том перакладаў "Гарачы ядловец". Пад адной вокладкай — урывак з эпасу "Манас", вершы кіргізскіх літаратараў Субайылды Абдыкарава, Насірдзіна Байцемірава, Асана Джакшылыкава, Мусы Джангазіева, Раміса Рыскулава, паэтаў Узбекістана, Францыі, Украіны, Таджыкістана... І сярод іншых твораў — вершы народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна "Лісты ў Хельсінкі".

— Напісаныя ў 1998-1999 гадах і адрасаваныя перш-наперш Васілю Быкаву гэтыя вершаваныя пасланні не маглі мяне не ўсхваляваць, — гаворыць Вячаслаў Шапавалаў. *— Тэма радзімы, тэма тугі па роднай прыродзе — самая што ні ёсць шчымлівая старонка любой нацыянальнай лірыкі. Пакуль што я пераклаў толькі пяць вершаваных лістоў з вялікага цыкла. Але спадзяюся, што да гэтай работы яшчэ вярнуся.*

Не так даўно расійскі прэзідэнт узнагародзіў паэта, перакладчыка, прафесара Кыргызстанскага універсітэта Вячаслава Шапавалава ордэнам "Дружба народаў". Такім чынам адзначана праца таленавітага творцы па прапагандзе рускай мовы, рускай літаратуры, развіццю расійска-кыргызстанскіх стасункаў.

Некалькі слоў пра перакладчыка. Вячаслаў Шапавалаў (адзіны сярод рускамоўных паэтаў не толькі Кыргызстана, але і ўсіх краін Цэнтральнай Азіі) адзначаны званнем народнага паэта Кыргызстана. Аўтар дзесяткаў кніг перакладаў. Вялікі ўклад зроблены ім як вучоным у даследаванне славутага эпасу "Манас".

— У мяне вельмі сімпатычныя адносіны з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Кыргызстане Валерыем Брылёвым, — расказвае Вячаслаў Іванавіч. *— Нядаўна пашчасціла прыняць удзел у адкрыцці выставы мастацкіх палотнаў Валерыя Брылёва, прысвечаных Беларусі, у Нацыянальным мастацкім музеі выяўленчага мастацтва імя Гапара Айціева. Усе 35 работ беларускага дыпламата напісаны ў Беларусі і пра Беларусь. Аўтар карцін валодае каласальным пачуццём святла, умела спалучае колеравыя гамы. І мы проста рады, што чулае беларускае сэрца б'ецца на зямлі Кыргызстана...І калі час і лёс дазволяць мне вярнуцца да перакладаў, хацелася б ізноў адкрыць для сябе Беларусь...*

Дарэчы, у Вячаслава Шапавалава добрыя і даўнія стасункі як у навукоўца з беларускім даследчыкам пытанняў тэорыі мастацкага перакладу доктарам філалагічных навук Вячаслам Рагойшам.

— Мы сустракаліся з Вячаславам Пятровічам у Маскве на пасяджэннях савета па пытаннях перакладу, што існаваў калісьці ў Саюзе пісьменнікаў СССР, — узгадвае Вячаслаў Шапавалаў. *— Добра ведаю кнігу беларускага „даследчыка "Паэтычны слоўнік", іншыя яго працы па літаратуразнаўстве. Зрэшты, ведаю пра вашы часопісы "Нёман", "Всемирная литература". З радасцю гатовы прапанаваць ім свае пераклады паэзіі сучасных і старажытных паэтаў Усходу.*

Кастусь ЛАДУЦЬКА

Магія мастацкага слова

Імпрэзы

Імя Пятра Васючэнкі добра вядомае ў літаратурным асяроддзі: літаратуразнаўца і пісьменнік, кандыдат філалагічных навук, аўтар шматлікіх літаратуразнаўчых манаграфій, крытычных артыкулаў, зборнікаў прозы і паэзіі, п'ес і казак, а яшчэ — загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта.

Нядаўна ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры з нагоды 50-годдзя пісьменніка і выхаду ягонай новай кнігі "Ад Тэксту да Хранатопу" адбылася літаратурная імпрэза, на якую прыйшлі студэнты, сябры і знаёмыя, літаратуразнаўцы і пісьменнікі.

Сам юбіляр выказаў жаданне, каб вечарына ператварылася ў размову пра літаратуру, паколькі ў новай кнізе, па яго словах, "сабрана сума думак пра сутнасць літаратуры". Некалькі экземпляраў кнігі, што выйшла накладам трыста асобнікаў у выдавецтве "Галіяфы", аўтар атрымаў непасрэдна на імпрэзе. З гэтай жа нагоды праводзіў вечарыну дырэктар выдавецтва "Галіяфы" Міхась Башура.

Леш за ўсё чалавека характарызуюць словы, сказаныя пра яго іншымі. Пісьменнік і літаратуразнаўца Уладзімір Гніламёдаў, да прыкладу, адзначыў: "Асоба Васючэнкі шматгранная, цікавая, таленавітая і нечаканая. Ён працуе ў розных жанрах і ў ніводным не адчувае сябе выпадковым. Пятро Васючэнка — адзін з лепшых нашых крытыкаў і літаратурзнаўцаў. Доказам з'яўляецца і выдадзеная кніга. У сённяшнім літаратурзнаўстве адчуваецца ўсё большая прысутнасць мастацкага пачатку. Збліжэнне навуковага, літаратуразнаўчага і мастакоўскага ў беларускай крытыцы можна прасачыць на прыкладзе Пятра Васючэнкі. Ён ідзе ў сферу таямніцы пісьменніка і яго твора."

Літаратурны крытык Ганна Кісліцына заўважыла, што для яе Пятро Васючэнка існуе ў першую чаргу, як казачнік, бо "ён не толькі піша казкі, але і любіць дзяцей, што таксама немалаважна".

Зборнік "Ад Тэксту да Хранатопа" складаецца з аўтарскага роздуму над творчасцю нашых класікаў — Янкі Купалы і Якуба Коласа, Максіма Багдановіча і Максіма Гарэцкага, Алеся Гаруна і Вацлава Ластоўскага, Францішка Багушэвіча, Канстанціна Вераніцына і Уладзіміра Караткевіча. Кніга будзе цікавай не толькі філолагам, выкладчыкам і студэнтам, але і ўсім, каго вабіць магія мастацкага слова.

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

Да ведама

«Паненка» з вёскі Камаровічы

Значны ўклад у жыццё пісьменства і асветніцкай дзейнасці ў Беларусі, у тым ліку і на Гомельшчыне, унесла Эма Яленская-Дмахоўская, якая нарадзілася 29 лютага 1864 г. у в. Камаровічы Мазырскага павета (цяпер в. Камаровічы ўваходзіць у склад Петрыкаўскага раёна).

Яленская атрымала добрую адукацыю за мяжой. У 1890 г. яна разам з мужам Казімірам Дмахоўскім пераехала ў Вільню, дзе пражыла ўсё астатняе жыццё. Пісьменніца пакінула нашчадкам шэраг празаічных і драматычных твораў. Асаблівай папулярнасцю карысталася яе аповесць "Паненка". Але найбольш яскрава яе талент праявіўся ў грамадска-палітычнай і асветніцкай дзейнасці. Эма Яленская збірала, друкавала і вывучала вусную паэтычную творчасць сваіх землякоў-палешукоў.

У 1891—1892 гг. на старонках Варшаўскага краязнаўчага часопіса "Вісла" друкавалася яе асноўная этнаграфічная праца "Вёска Камаровічы ў Мазырскім павеце", якая праз некаторы час выйшла асобным выданнем.

Клара БІРУКОВІЧ

Ад відавочцы

Прыродная і духоўная прыгажосць

"Мара жанчыны — быць жанчынай мары". Пад такім дэвізам у Грамадскім прэс-цэнтры "Дома прэсы" прайшло пасяджэнне "круглага стала" напярэдадні свята Дня 8 Сакавіка. Удзельнікамі яго былі вядомыя не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі жанчыны — Ганна Лаўрукевіч, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў; Рыма Філіпчык, суддзя Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь; Сауле Алімкулава, першы сакратар Пасольства Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь; Валянціна Гаявая, мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля "Харошкі"; Маргарыта Касымава, рэжысёр-пастаноўшчык кінастудыі "Беларусьфільм"; Аляўціна Сідарэнка, прафесар кафедры фізікі і электронікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар тэхнічных навук; Наталля Янкова, старшы прапаршчык адной з воінскіх часцей ды іншыя.

Жаночая тэма, напярэдадні жаночага свята, была ўзнята зусім невыпадкова. Як сведчыць статыстыка, у нашай краіне пражывае 5160,1 тысяч жанчын, ці 53,4 працэнта ад агульнай колькасці насельніцтва. 74 працэнта прадстаўніц прыгожага полу жывуць і працуюць у гарадах і гарадскіх пасёлках і толькі кожная чацвёртая — у сельскай мясцовасці. Трэба адзначыць, што па-ранейшаму жаночы пол лідзіруе і ў атрыманні сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. У большасці "жаночымі" з'яўляюцца калектывы прадпрыемстваў гандлю і грамадскага харчавання, культуры, асветы, аховы здароўя. Колькасць жанчын у гэтых галінах складае ад 70 да 86 працэнтаў. Сярод 13 тысяч жанчын-педагогаў, якія працуюць у вышэйшых навучальных установах — 233 дактары навук, каля 4 тысяч кандыдатаў навук, 220 — прафесараў і 2,6 тысячы дацэнтаў.

Аб духоўнай і прыроднай прыгажосці беларускіх жанчын распавядала падчас "круглага стала" Сауле Алімкулава, якая ўжо другі раз у якасці консула Пасольства Рэспублікі Казахстан працуе ў Беларусі.

Аб жаночым пачатку ў творчасці разважалі рэжысёр-пастаноўшчык кінастудыі "Беларусьфільм", якая зняла 16 мастацкіх і 40 хранікальна-дакументальных фільмаў, заслужаны дзеяч культуры Таджыкскай ССР (1976) Маргарыта Касымава і мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля "Харошкі", які дастойна прадстаўляў нашу краіну ў Францыі, Японіі, Індыі, Кітаі, Італіі, Іспаніі, Амерыцы, Бельгіі, Вялікабрытаніі і іншых краінах, народная артыстка Беларусі Валянціна Гаявая.

Вядучы "круглага стала" Рыгор Сакалоўскі, палкоўнік ў адстаўцы, пісьменнік, воін-"афганец" і былы рэдактар ваеннай газеты "Во славу Родины", прысвяціў каханню і жаночай прыгажосці нямала вершаў, у тым ліку і "Начинаю день с молитвы, начинаю день с тебя". Вось і падчас сустрэчы з прадстаўніцамі прыгожага полу краіны, нібыта перасыпаючы гутарку жанчын яркімі пацеркамі паэзіі, ён цытаваў вершаваныя радкі з уласных твораў, падарыў кожнай з жанчын толькі што выдадзеную ім кнігу "Горсть надежды и любви".

Атрымалі жанчыны — удзельніцы "круглага стала" — і падарункі ад кампаніі "Faberlic", прамыславага аб'яднання "Белмастпромыслы", а на перадсвяточны пачастунак прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва запрасілі працаўнікі КУП "Віцьба".

Валянцін БАРЫСЕВІЧ

На здымку: падчас святочнага мерапрыемства.

Фота Кастуся Дробава

Выставы

Жыццё — Айчыне, гонар — нікому

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё гісторыка-мастацкай выстаўкі "Эмерык фон Гутэн-Чапскі на фоне эпохі", прысвечанай 180-годдзю з дня нараджэння гэтага славутага асветніка, бібліяфіла, мецэната, калекцыянера, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча.

Падрыхтавана выстаўка Прылуцкім цэнтрам народнай творчасці "Прылуцкая спадчына", гістарычным музеем Станькаўскай сярэдняй школы імя Марата Казея, Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі пры актыўнай дапамозе Польскага Інстытута ў Мінску.

Пра жыццё і дзейнасць Эмерыка Чапскага расказаў кіраўнік Прылуцкага цэнтра народнай творчасці "Прылуцкая спадчына" Ігар Гатальскі. Сваёй дзейнасцю на карысць Айчыны вызначыўся не толькі граф Эмерык Чапскі, але і ягоныя сыны. Так, старэйшы сын Караль падчас знаходжання на пасадзе губернатара Мінска зрабіў шмат добрых спраў: пабудова электрастанцыі, рэстаўрацыя піўзавода "Аліварыя", будаўніцтва тэатра (зараз Нацыянальны тэатр імя Янкі Купалы), пуск коннага трамвая ("конкі"). Нямала добрых спраў і на рахунку малодшага сына Эмерыка Чапскага — Ежы (Юрыя).

У экспазіцыі выстаўкі — кнігі на беларускай, польскай і рускай мовах, буклеты, архіўныя дакументы, партрэты Эмерыка Чапскага і іншых прадстаўнікоў ягонага роду, габелены з выявамі маёнткаў і палацаў. Асаблівую ўвагу прысутных прыцягнула генеалагічнае дрэва радаводу Чапскіх у 11-і пакаленнях, графічнае выкананне якога зрабіў мастак, архітэктар, навуковы кіраўнік праекта рэстаўрацыі Станькаўскай Свята-Мікалаеўскай царквы Алег Маслеў. Ён жа — аўтар шматлікіх партрэтаў прадстаўнікоў роду Чапскіх.

Звяртае на сябе ўвагу таксама герб радаводу Чапскіх, дзе ёсць наступныя словы: "Жыццё Айчыне, гонар нікому". Менавіта гэтым дэвізам кіраваўся Эмерык Чапскі і яго сыны.

Выстаўка з'яўляецца своеасаблівым пралогам да навуковай канферэнцыі, прысвечанай Чапскім, якая адбудзецца ў сакавіку з удзелам прадстаўнікоў роду Чапскіх з многіх краін свету.

Лявон ЦЕЛЕШ
г. Дзяржынск

На здымку: сярод прысутных на выставе — сваячка графаў Чапскіх, мовазнаўца, кандыдат педагагічных навук Валянціна Выхота.

Фота аўтара

Нямцэвіч загаварыў па-беларуску

Прэзентацыі

У Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага адбылася прэзентацыя кнігі Анатоля Гладышчука «Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі», якая выдадзена ў РВУ "Літаратура і Мастацтва". Але пачатак сустрэчы аўтара з чытачамі арганізатарам давялося крыху адцягнуць. Як паведаміла на прэзентацыі дырэктар бібліятэкі Тамара Данілюк, такога не здаралася даўно: у зале прыйшлося паставіць шмат дадатковых крэслаў, а вялікую выставу кніг перанесці на новае месца.

Цікавасць да кнігі загадчыка кафедры фізікі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта, кандыдата фізіка-матэматычных навук Анатоля Гладышчука сапраўды вялікая. І справа не ў тым, што даследаванне, годнае кандыдацкай дысертацыі, напісаў "тэхнар". Выступаючы на сустрэчы, вядомы берасцейскі паэт Мікола Пракаповіч узгадаў пра дыскусіі паміж фізікамі і лірыкамі ў 1960-я гады. І заўважыў, што ў апошні час адметныя даследаванні па гісторыі Берасцейшчыны часцей выходзяць з-пад пяра не прафесійных гісторыкаў, а аматараў мінуўшчыны свайго краю.

Сам Анатоль Гладышчук лічыць, што, хаця на тытульным лісце значыцца толькі яго прозвішча, на самай справе гэта праца вялікай колькасці людзей: і супрацоўнікаў РВУ "Літаратура і Мастацтва", і літаратурнага кансультанта, загадчыка кафедры беларускай мовы БрДУ імя Пушкіна Марыі Новік, і аблвыканкама, які прафінансаваў выданне, і шматлікіх краязнаўцаў, якія дапамагалі парадамі.

Аб каштоўнасці выдання можна гаварыць доўга. Напрыклад, Анатоль Гладышчук сваёй настойлівасцю дамогся права карыстацца дакументамі, якія захоўваюцца ў закрытым Баварскім хатнім каралеўскім архіве. А там матэрыялаў па гісторыі Беларусі — безліч. І, як трапна заўважыў краязнаўца з Жабінкі Анатоль Бензярук (дарэчы, аўтар шматлікіх прац па гісторыі роднага краю), менавіта Анатоль Антонавіч «дапамог» Юльяну Урсыну Нямцэвічу, выдатнаму публіцысту і ад'ютанту Тадэвуша Касцюшкі, загаварыць па-беларуску: дзённікі Юльяна ўпершыню ўбачылі свет на мове нашай краіны, дзе ён нарадзіўся і вырас.

Юрый РУБАШЭЎСКІ

На здымку: супрацоўніца Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Ірына Паўлючук і аўтар кнігі Анатоль Гладышчук.

Фота Руслана Кабяка

За падзеяй

Перспектывы аграгурызму

У Мінску прайшла другая спецыялізаваная канферэнцыя "Аграэкатурызм у Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця", якую арганізавалі БГА "Адпачынак на вёсцы" і ААА "Белаграпрамбанк".

Сярод гасцей і ўдзельнікаў мерапрыемства былі намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Іван Бамбіза, намеснік міністра спорту і турызму Чэслаў Шульга, намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур, а таксама эксперты з Латвіі, Польшчы, Расіі, Украіны і Італіі. У межах канферэнцыі прайшла прэзентацыя "Каталога сядзіб-2009", у які ўключана інфармацыя пра 250 аграсядзіб з усіх абласцей нашай краіны. Плануецца распаўсюдзіць гэты каталог па рэгіянальных упраўленнях спорту і турызму, а можа, і выпусціць у продаж.

Адбылося падвядзенне вынікаў конкурсу "Лепшая аграэкасядзіба 2008 года". За гэтае званне змагаліся 25 сядзіб. Журы, старшынёй якога быў Ч. Шульга, прысудзіла Гран-пры гаспадарам сядзібы "Над Нёманам" (Гродзенская вобласць) Валерыю і Аксане Салькоўскім. Уладальнікам дыплома ў адной з самых перспектыўных намінацый "Захаванне беларускіх традыцый" стала Вольга Маханенка, гаспадыня сядзібы "Прыазёрная" (Віцебская вобласць).

Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ

З-пад пяра

У школе № 199 г. Мінска прайшоў конкурс аратарскага майстэрства. У наш час мала падлеткаў, якія ўмеюць прыгожа і правільна размаўляць. Часта ў маўленні вучня, які адказвае ля дошкі, можна пачуць словы-паразіты "э-э...", "ну" і г.д. Таму конкурс, паводле меркавання яго арганізатараў, стане для слухачоў добрым стымулам размаўляць лепш, а для ўдзельнікаў — карыснай трэніроўкай.

Выступоўцы не заўсёды думаюць пра слухачоў, не заўсёды ўлічваюць іх погляды і інтарэсы, аднак сапраўдны аратар ніколі не павінен забывацца пра тое, што кантакт з аўдыторыяй вельмі важны. Бо яго задача не толькі перадаць інфармацыю, але і зацікавіць, пераканаць слухачоў. Удзельнікі конкурсу, вучні старэйшых класаў, абіралі для сваіх выступаў самыя разнастайныя тэмы. Пераможцамі конкурсу сталі Марына Агафонава, Аня Маісевіч, Каця Данілецкая.

Дар'я ПАШКЕВІЧ

Пад назвай "Тут, толькі тут маё натхненне" ў Смольгаўскай сельскай бібліятэцы Любанскага раёна прайшоў літаратурны вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння Ніны Маеўскай.

На вечары гучалі вытрымкі з празаічных твораў аўтара "Наддзеевіч", "Холад доннай вады", "Арніка". Апісанне родных мясцін зацікавіла, узрушыла слухачоў. Простыя сяляне, апісанне родных вёсак, жыццёвыя шляхі герояў — усё было так блізка і знаёма.

Але больш за ўсё палюбіліся чытачам вершы Ніны Васільеўны. Паэтычныя зборнікі "Мая ўлюбёная краіна", "Падаюць даспелыя ранеты", новыя вершы з часопісаў "Маладосць", "Полымя", газеты "ЛіМ" гучалі пранікнёна, чула, шчыра.

Дзесяццю гадамі раней, да 60-годдзя Ніны Васільеўны на беларускім тэлебачанні быў зняты дакументальны фільм "Маналог". Менавіта яго праглядам закончыўся вечар.

Алена СКУРКО

Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва запрашае да ўдзелу ў IX Узвышаўскіх чытаннях, якія адбудуцца 26 мая 2009 года. Яны прысвечаныя 100-гадовым юбілеям С. Дарожнага, М. Лужаніна, А. Адамовіча, Л. Калюгі.

Удзельнікам чытанняў прапануюцца наступныя тэмы:

1. Жыццё і творчасць узвышэнцаў Сяргея Дарожнага, Максіма Лужаніна, Антона Адамовіча і Лукаша Калюгі. **2.** Дакументы па гісторыі літаратуры, мастацтва 1920 — 1930-х гадоў у архівах, музеях, бібліятэках.

IX Узвышаўскія чытанні будуць праходзіць у памяшканні Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (вул. Кірылы і Мяфодзія, 4). Пасля завяршэння чытанняў плануецца выданне зборніка матэрыялаў.

Заяўкі на ўдзел у чытаннях просім накіроўваць да 15 мая 2009 года на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 4. Электронная пошта bdamlim-@tut.by. Тэлефон/факс: 227-47-81.

Ул. інф.

Выйшаў у свет тэлефонна-адрасны даведнік грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі". У ім змешчаны не толькі тэлефонныя нумары літаратараў, старшынь абласных аддзяленняў Саюза пісьменнікаў, рэдакцый часопісаў "Алеся", "Вожык", "Вясёлка", "Народная асвета", "Новая Немига литературная", "Беларуская думка", "Роднае слова", але і склад прэзідыума, праўлення пісьменніцкай арганізацыі. Ёсць у даведніку і нумары тэлефонаў рэдакцый рэспубліканскіх газет "Белорусская нива", "Звязда", "Народная газета", "Рэспубліка", "Краязнаўчая газета".

Думаецца, тэлефонна-адрасны даведнік будзе неабходны не толькі літаратарам, але і кіраўнікам дзяржаўных органаў і ўстаноў.

Валянцін БАРЫСЕВІЧ

Горад фестываляў

Працягваем знаёміць чытачоў з кіраўнікамі ўстаноў культуры Беларусі. Сёння наш суразмоўца — начальнік аддзела культуры Віцебскага гарвыканкама Віктар Кібісаў.

— Віктар Дзмітрыевіч, Віцебск з упэўненасцю можна лічыць горадам з высокай культурай. Тут праводзіцца шмат мерапрыемстваў і рэгіянальных, і рэспубліканскіх, і міжнародных. Каб гэты статус падтрымліваць, трэба шмат працаваць...

— Віцебск найперш фестывальны горад. Сёння тут штогод праходзіць васемнаццаць фестываляў рознага рангу. Завяршаецца, да прыкладу, "Славянскі базар", і ўсе службы горада пачынаюць адразу рыхтавацца да наступнага свята. Трэба не толькі падрыхтаваць арыгінальную праграму, але прывесці ў парадак і горад.

— Так, самы "раскручаны" брэнд Віцебска — "Славянскі базар". Як вы лічыце, ці дасягнуў фестываль сваёй найвышэйшай кропкі развіцця, ці яшчэ ёсць вяршыні, да якіх трэба імкнуцца?

— Мяжы ўдасканаленню не існуе. "Славянскі базар" пакуль што не дасягнуў свайго апагея. Мы не можам сказаць, што выпрацаваліся дакладныя схемы яго арганізацыі. Шмат новага яшчэ трэба ўнесці ў працу. І рэспубліканскім аргкамітэтам пастаўлены ўжо задачы, каб кожны наступны фестываль быў не падобны да мінулага.

— Ці паўплывалі на далейшую працу з маладымі талентамі ў Віцебску паспяховыя выступленні беларусаў на дзіцячым "Еўрабачанні"?

— Безумоўна, перамогі на дзіцячым "Еўрабачанні" ўнеслі свае карэктывы ў падрыхтоўку таленавітых дзяцей. Зараз у цэлым па рэспубліцы праходзіць конкурс па пошуку маладых талентаў. Мы ў Віцебску таксама вышукваем, так бы мовіць, рэзервы творчай моладзі. І, спадзяюся, знойдзем іх. Ёсць у нас годная змена, якая сёння толькі пачынае спяваць, а праз некалькі гадоў настойлівай працы зможа прадставіць Беларусь не толькі на "Еўрабачанні", але і на іншых міжнародных конкурсах ды фестывалях.

— Як у аддзела культуры складваюцца адносіны з творчымі аб'яднаннямі — Саюзам пісьменнікаў, Саюзам мастакоў?..

— Заўсёды сябравалі і сябруем з імі. З пісьменнікамі ладзяцца сустрэчы і ў школах, і ў працоўных калектывах, і ў бібліятэках. У падпарадкаванні аддзела культуры гарвыканкама ёсць некалькі выставачных залаў, якія мы з радасцю прадастаўляем для выстаў мастакоў. З Саюзам кампазітараў патрабуецца ўзнаўленне былых адносін. Але ўсё яшчэ наперадзе.

— Установам культуры па ўсёй Беларусі прыйшлося пачаць аказваць насельніцтву платныя паслугі. Наколькі гэты крок апраўдвае сябе ў вашым горадзе?

— Культура ва ўсім свеце затратная. У нас яна заўсёды ўтрымлівалася за кошт бюджэтных сродкаў. Самой культуры зарабляць складана. Тым не менш за мінулы год нашымі ўстановамі культуры на платных паслугах зароблены немалыя грошы. Але гэта дзесьці 40 працэнтаў ад агульных затрат. І таму даводзіцца шукаць рэзервы. На гэты год у нас у план унесена большая сума, якую мы павінны самі зарабіць. Будзем імкнуцца выканаць план. Чым больш заробім, тым больш зможам патраціць. Нядаўна пабудавалі новы цэнтр народных рамёстваў і мастацтваў "Задзвінне". Маем намер праз яго эксплуатацыю атрымаць дадатковыя сродкі. Паспрабуем больш актыўней выкарыстоўваць залы музычных школ горада, музеі. Адназначна трэба актыўней выкарыстоўваць амфітэатр. Па-за "Славянскім базарам" ён часта прастойвае без працы.

— У Віцебска добрыя сувязі склаліся з нямецкімі гарадамі...

— Даўняе сяброўства ў нас з Нінбургам і Франкфуртам-на-Одэры. З гэтымі гарадамі рэалізоўваем цікавыя сумесныя праекты. У канцы мінулага года гарадскі моладзевы хор Віцебска пад кіраўніцтвам Віталя Раўзы наведаў Германію з канцэртам. У наш горад у свой час прыязджаў духоўны хор "Канторай" з Вецлара, якім кіруе Ёахім Айхгорн. Гэта з апошніх праектаў. Культурныя сувязі існуюць з латышскімі гарадамі: найлепшыя стасункі з Даўгаўпілсам і Рэзекнэ. Таксама супрацоўнічаем са шматлікімі расійскімі гарадамі.

— На плечы аддзела культуры кладзецца арганізацыя канцэртаў класічнай музыкі, моладзевых дыскатэк і г. д. Наколькі атрымліваецца задаволіць густы ўсіх жыхароў горада?

— Што тычыцца дыскатэк, то тут ніякага вынаходніцтва не трэба. Галоўнае, каб было памяшканне і, вядома ж, творчы падыход арганізатараў. Зараз вялікую працу ў гэтым накірунку праводзіць клуб "Энергія". Што тычыцца сур'ёзнай музыкі, у нас ужо на працягу семнаццаці гадоў праходзіць свята духоўнай музыкі. І да гэтага свята вялікая цікавасць. Напярэдадні яго правядзення цяжка знайсці свабодны білет. Фестывальнасць горада ўносіць свае карэктывы ў адносіны жыхароў да канцэртаў. Бо падчас "Славянскага базару" людзі могуць убачыць вядомых айчынных і замежных выканаўцаў эстрады, класічнай музыкі. І пасля ўжо з меншым энтузіязмам ідуць на іншыя канцэрты на працягу года.

— Давайце ўсё ж, Віктар Дзмітрыевіч, згадаем пра стан і сетку ўстаноў культуры горада...

— Самая вялікая праблема — упарадкаванне паркаў адпачынку. Гэты накірунак у свой час быў упушчаны. І на гэта сваю ўвагу звярнуў новы губернатар Віцебскай вобласці Аляксандр Косінец. Трэба закупляць атракцыёны для паркаў, рамантаваць аб'екты, якія там існуюць. Працы на некалькі гадоў. У выніку ў горадзе колькасць паркава-забаўляльных зон павінна дасягнуць адзінаццаці.

— Якіх устаноў культуры яшчэ не хапае гораду?

— Некалі ў Віцебску быў свой цырк. І сёння яго не хапае гораду. Калі мы арганізоўваем гастролі беларускіх і замежных цыркаў, то на іх шоу ахвотна ходзяць дзеці і дарослыя. Не хапае таксама дзіцячага музычнага тэатра. Між тым, тэатр быў бы вялікай дапамогай у выхаванні эстэтычнага густу моладзі і ў падрыхтоўцы гледача для шматлікіх фестываляў.

Гутарыў Дзмітрый БЕРАЖНЫ

Фота аўтара

Прадметы, якія паступаюць у музейныя зборы ў выніку экспедыцый, становяцца, як вядома, аднымі з самых любых і дарагіх. Доўгі час супрацоўнікі Аршанскага музея У.С. Караткевіча марылі аб вандроўцы на Рагачоўшчыну. І вось для супрацоўнікаў музея Галіны Юркевіч, Вольгі Пашковіч і галоўнага захавальніка фондаў "Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны" Ірыны Воранавай мара здзейснілася.

Як Акопы — для Купалы...

Вандроўка пачалася з наведвання тых мясцін, з якімі звязаны лёс маці пісьменніка. Надзея Васільеўна пасля заканчэння Марыінскай гімназіі ў Магілёве нейкі час працавала настаўніцай у вёсцы Збароў каля Рагачова. Гэта даволі вялікая вёска. Мы запыталіся ў мясцовага жыхара, дзе знаходзіцца Збароўская школа. Ён патлумачыў, што старога будынка няма, а на месцы старой школы стаіць новы двухпавярховік.

Настаўнікі, пачуўшы, што мы прыехалі з Оршы, гасцінна запрасілі ў школьны музей.

Наступным нашым прыпынкам стаў Рагачоўскі музей Народнай Славы, дзе сустрэў дырэктар музея Андрэй Чарняўскі, які правёў экскурсію па музеі і аглядную экскурсію па мясцінах, звязаных з імем У. Караткевіча. У Рагачове ўвагу прыцягвае дом на вуліцы Чкалава, 59, які яшчэ ў 1914 годзе пабудаваў дзед пісьменніка, Васіль Юльянавіч Грынкевіч, бацька маці, які стаў прататыпам старога Данілы Загорскага ў рамане "Каласы пад сярпом тваім". Пісьменнік заўсёды з радасцю прыязджаў у гэты ўтульны дом: папрацаваць і адпачыць, палавіць рыбу і хадзіць на паляванне, сустрэцца з роднымі і сябрамі. Нельга не пагадзіцца са словамі даследчыка творчасці пісьменніка А. Вераб'я: ёсць падставы сцвярджаць, што Рагачоў быў для Караткевіча тым, чым былі для А. Пушкіна Міхайлаўскае, ці для Янкі Купалы Акопы. Супрацоўнікам Аршанскага музея пашчасціла — дзверы дома на вуліцы Чкалава, 59 гасцінна адчынілі нявестка пісьменнікавага дзядзькі Ігара Васільевіча Грынкевіча, Тамара Іванаўна. І вось мы ў гэтым знакамітым доме з высокай столлю, з той жа мэбляй і тымі ж прадметамі побыту. Зайшлі ў той вялікі пакой, які належаў пісьменніку, нават пасядзелі за сталом, дзе ў далёкія 60—80-я гады рука Караткевіча ледзь паспявала за думкай. У Рагачове былі завершаны раман "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", напісана аповесць "Чазенія", нарыс пра Латвію "Казкі Янтарнай краіны", аўтабіяграфія "Дарога, якую прайшоў", апавяданне "Дрэва вечнасці" і іншыя творы, прысвечаныя беларускім мясцінам.

З дазволу сваячкі пісьменніка ўзялі 16 арыгінальных фотаздымкаў, паштоўку, уласнаручна падпісаную У. Караткевічам сваім родным за чатыры месяцы да смерці. Падчас размовы Тамара Іванаўна распавяла шмат цікавага, узгадала выпадкі з жыцця дзеда Васіля, расказаныя ёй дзядзькам Ігарам, і пра самога Уладзіміра Караткевіча.

У адной з запісных кніжак пісьменнік адзначыў, што пачатак рамана "Каласы пад сярпом тваім" прыйшоў у галаву 7 жніўня 1959 года ля Азарышча на Рагачоўшчыне, дзе на стромкім адхоне высокага правага берага Дняпра ён убачыў грушу. "Груша цвіла апошні год. Усе галіны яе, усе вялікія расохі, да апошняга пруціка, былі ўсыпаны бурным беларужовым цветам. Яна кіпела, млела і раскашавалася ў пчаліным звоне, цягнула да сонца сталыя лапы і распасцірала ў яго ззянні маленькія, кволыя пальцы новых парасткаў. І была яна такая магутная і свежая, так утрапёна спрачаліся ў яе ружовым раі пчолы, што, здавалася, не будзе ёй зводу і не будзе канца".

Калі мы апынуліся ў тым самым Азарышчы, то адразу ўбачылі гэтую грушу... Магчыма, гэта было і зусім не тое дрэва, але маляўнічасць прыроды, велічнасць Дняпра так уразіла, што адразу яскрава ўсплылі шматлікія сцэны рамана, вобразы герояў. Няма сумнення, што гэтае месца не магло пакінуць пісьменніка абыякавым. Яно ўскалыхнула яго сэрца, падаравала яму вобраз Бацькаўшчыны, з'яднала ў адзінае цэлае легенды і паданні, гісторыю і прыроду. Зрэшты, цікавасць маленькага Валодзі да мінуўшчыны нарадзілася, калі ён слухаў сямейныя паданні. У яго сям'і захаваліся звесткі пра Тамаша Грыневіча, сваяка з боку маці, які з'яўляўся кіраўніком паўстання 1863—1864 гг. у Прыдняпроўі. Пісьменнік апісаў гэту гісторыю ў пралогу рамана "Нельга забыць" ("Леаніды не вернуцца да зямлі"). Пазней даследчыкі знайшлі ў архівах матэрыялы, якія сведчылі , што такі факт сапраўды меў месца.

Той, хто ўважліва знаёміўся з кнігамі пісьменніка, не мог не заўважыць такую назву населенага пункта, як Кісцяні. Ён знаходзіцца таксама на Рагачоўшчыне. А фігуруе гэта назва ў аповесці "Сівая легенда". Менавіта там размяшчаўся Кісцянёўскі замак, у якім разгортваюцца падзеі гісторыі кахання, як заўсёды рамантычнага і ўзнёслага, радаснага і сумнага, дваранiна Рамана Ракутовіча і прыгоннай дзяўчыны Ірыны. Калі вярталіся з вёскі Кісцяні, заехалі паглядзець на абарончыя валы ў вёску Янкаў Лог. Падняўшыся на ўзвышша, можна было бачыць выдатную панараму мясцовых краявідаў, цэнтрам якой з'яўляўся, бясспрэчна, магутны Дняпро, які быў добра бачны праз кустоўе і дрэвы. Але вялікі сум навявала сама вёска, якая пацярпела ад Чарнобыльскай аварыі: пакінутыя хаты, сады, поўныя яблык і сліў, і аглушальная цішыня.

У ліпені—жніўні 1964 года напісаны яшчэ адзін твор У.Караткевіча "Ладдзя Роспачы". Прыгадаем характарыстыку галоўнага яго героя Гервасія Вылівахі. "Быў ён багаты сябрамі і неабдзелены жаночай увагай. Сабою быў дзівосна гожы і пяшчотны, а паводзін — самых заганных. Хобаль, залётнік, піяка, задзіра, бітак, бабздыр несамавіты. Не было на ўсёй зямлі беларускай падобнага яму". Дарэчы, Андрэй Чарняўскі — дырэктар Рагачоўскага музея Народнай Славы — распавёў, што рагачоўцы жадаюць паставіць помнік каля гарадзішча гэтаму жыццялюбу, мастаку, абаронцу людзей, бунтару і шчыраму патрыёту роднай зямлі — Гервасію Выліваху.

Галіна ЮРКЕВІЧ,
загадчык Аршанскага музея У. С. Караткевіча

На здымках: хата дзеда Васіля ў Рагачове; магіла Ганны Францаўны, бабулі У. Караткевіча.

У № 2 "ЛіМа" быў надрукаваны артыкул Сяргея Макарэвіча "Карані шведаў на Беларусі: міф ці рэальнасць?.." Да пошукаў нашчадкаў гэтага скандынаўскага народа на тэрыторыі нашай краіны падшурхнула кніга Андрэя Катлерчука "Шведы ў гісторыі і культуры беларусаў". Мінулая паездка была на Чэрвеньшчыну. Сёння наш карэспандэнт знаёміць чытачоў з вынікамі далейшых пошукаў.

Са Швецыі – па беларускі лес

Пра шведскі род Сволкенаў (Свольгены, Свольгены, Svolcken) упершыню даведаўся зноў-такі ад Андрэя Катлерчука. Здаецца, ніколі не чуў, каб шведскія магнаты "асядалі" ў Беларусі. Каб паспрабаваць разабрацца ў прычынах іх пераезду да нас, разам з журналістам Антонам Трафімовічам паехалі ў Астравецкі раён.

На чыгуначнай станцыі Гудагай нас сустрэў жыхар вёскі Варняны, краязнаўца Алесь Юркойць. Алесь папярэджваў, што пра Сволкенаў вядома вельмі мала. Нават гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі "Памяць" Астравецкага раёна не праясніла сітуацыі. Але сабе за мэту мы паставілі наведванне былога маёнтка Сволкенаў. Размяшчаўся ён каля вёскі Клюшчаны, а назву меў Шайкуны.

Клюшчаны — знакавае для беларускай гісторыі паселішча. У мясцовым касцёле адпраўляў службу ксёндз Канстанцін Стаповіч (ён жа паэт Казімір Сваяк). Захавалася і плябань, у якой той жыў. З гэтай мясцовасцю звязаны лёс і роднага брата Канстанціна Альбіна, кампазітара, грамадска-палітычнага дзеяча. На Клюшчанскіх могілках пахаваны нацыянальны дзеяч 1920 — 30-х Адольф Клімовіч. Тут знайшла свой спачын літоўская мастачка Ірэна Яновіч. На гэтых могілках у 2002 годзе былі перазахаваны і парэшткі нашчадкаў Сволкенаў. Яны знаходзіліся ў склепе капліцы. Але адтуль іх неаднаразова выцягвалі. Перазахаваннем займаліся мясцовыя жыхары Алена і Алесь Марозікі. Тады з Польшчы прыязджала і нашчадак беларускай галіны шляхетнага роду — пані Магдалена Асухоўска. Першыя тры гады жыцця яна правяла ў Шайкунах. Не маглі не зайсці да сям'і Марозікаў на гарбату, каб распытаць пра шведскі род. Алена, як высветлілася, шмат чула пра Сволкенаў ад вясковых старажылаў. Сёе-тое падказаў і Алесь Юркойць.

За кубачкам гарбаты

У 1840 годзе Ігнацы Сволкен ажаніўся з Міхалінай Кучэўскай. У пасаг бацька дзяўчыны даў маёнтак Шайкуны. Так прадстаўнік шведскага роду "асеў" на Астравеччыне. Невядома, праўда, як ён з'явіўся ў Беларусі. Хроніка "Памяць" Астравецкага раёна падае, што Ігнацы працаваў суддзёй.

У Ігнацы і Міхаліны нарадзіўся сын Эдвард, да якога ў 1879 годзе адышло ўладанне маёнткам. Хадзілі чуткі, што пры родах Міхаліна памерла, а разам з ёй і дзіця. Ігнацы не хацеў пазбавіцца Шайкунаў. Таму падмяніў памерлае немаўля на іншае, сваё, але ад служанкі. Таму нібыта атрымліваецца, што Эдвард не сын Міхаліны, але нашчадак Сволкенаў. Толькі цесць пра падмену аднекуль дазнаўся. Быў суд. Але пан Кучэўскі нічога не змог даказаць. У бясіллі ён і праклёў свайго зяця: "Твае косці і косці тваіх нашчадкаў ніколі не знойдуць спакою".

Ігнацы Сволкен пабудаваў капліцу святога Міхала. Яе зрабіў і сямейным склепам. Нябожчыкаў муміфіцыравалі. У 1952 годзе савецкія салдаты капалі непадалёк бульбу і натрапілі на капліцу. Разрабавалі пахаванні. А нябожчыкаў дзеля жартаў паставілі да дрэваў. Чатыры разы затым Сволкенаў хавалі і столькі ж разоў іх целы адкопвалі. У 2002 годзе іх зноў перазахавалі на Клюшчанскіх могілках — праз 50 гадоў пасля разрабавання склепа. Сярод пахаваных у капліцы быў і Густаў Сволкен, сын Ігнацыя гвардзеец 2 грэнадзёрскага Свірскага палка, удзельнік руска-турэцкай вайны. Прымаў удзел у вызваленні Балгарыі, дзе і загінуў.

З часам Сволкены перабраліся жыць у Вільню. А на Астравеччыну прыязджалі як на лецішча. Вось невялікая гісторыя роду, якую мы пачулі за гарбатай у сям'і Марозікаў. Але гэта не ўсё. Алена паказала нам фотаздымак панскіх дзяцей. Раней яна думала, што на ім пані Магдалена Асухоўска, але полька сябе ні ў адной з трох дзяўчынак не прызнала. Яшчэ Алена падказала нам, дзе шукаць жывога сведку Сволкенаў. Вось гэта ўдача!

што адным з прадаўцоў лесу быў ніхто іншы, як пан Кучэўскі. Аднойчы, убачыўшы дачку партнёра, Сволкен закахаўся ў паненку. Калі швед папрасіў у бацькі рукі Міхаліны, у Кучэўскага, відаць, не ўзнікла ніякіх ваганняў. Швед той быў багаты і знатны. Як сведчыць Браніслава Масцяніца, Сволкены, якія жылі ў Швецыі, мелі права ездзіць у запрэжцы ці то з васьмі, ці то з дзевяці коней. Беларускія Сволкены такога права не мелі. Ездзілі толькі на пары. Але не гэта было галоўным, бо Кучэўскі і сам быў чалавекам не бедным. У пасаг за дачку даў 500 гектараў лесу і маёнтак Шайкуны. Быў швед па веравызнанні каталіком. Калі Міхаліна зацяжарыла, разам з мужам паехалі да сваякоў у Швецыю. Там паненка і нарадзіла сына. Нічога пра памерлае дзіця бабця Браніслава нам не распавяла. Магчыма, нічога пра тое і сама не ведала. Бо жылі ж Ігнацы і Міхаліна задоўга да яе нараджэння. А працаваць Браніслава Масцяніца прыйшла да Сволкенаў, калі маёнткам кіраваў Канстанты, унук Ігнацы.

— *Канстанты быў вельмі добрым і надта разумным. Вялікая ў іх была радзіна. Дзевяць братоў мелася ў пана. Усе ваенныя. Былі* дзілася дачка Ганна. Малодшым быў Эдвард.

— *Як памёр Канстанты, я на пахаванні была,* — працягвае жыхарка Петрашышкаў. — *Але я нябожчыка не бачыла. Труна стаяла высока. Вакол кветкі. Шэсць ксяндзоў сядзелі за сталом і пялі па лаціне. Памёр ён у Вільні, а хавалі ў Шайкунах, у капліцы. Прывезлі цягніком да станцыі Галедня, а затым коньмі да маёнтка. Але потым знайшліся людзі, якія шукалі багацце. І вывернулі ўсе магілы. Там ліпы вялікія былі. Надта доўга стаяў падпёрты да ліпы Канстанты. Баяліся па ягады хадзіць. Казалі, што пан хадзіў па маёнтку, як сонца заходзіла. Але ж гэта няпраўда, нас толькі страшылі. Затым знайшоўся чалавек, які сабраў усе парэшткі ў труну (яна была цэлая) і замураваў. Дні са тры пабыло, а затым зноў выцягнулі.*

Жылі Сволкены ў драўляным палацы. А як палац згарэў, паны перабраліся ў дом, дзе да гэтага жыла прыслуга. Для прыслугі паставілі іншы дом, на чатыры чалавекі. Паны, па словах Браніславы Масцяніцы, адчувалі, што хутка будзе ў свеце пераварот, і не сталі адбудоўваць палац. "*Адчувалі, што ўжо ад'елі, аджылі,*

Апошнія сведкі

Браніслава Масцяніца жыве ў суседняй з Клюшчанамі вёсцы Петрашышкі. Нарадзілася яна ў 1922 годзе. Працавала ў маёнтку. Рабіла ўсё, што прыходзілася. Пятнаццаць гадоў ужо як бабулька не ходзіць. Зусім дрэнна чуе. Хоць на момант, калі апошнія Сволкены пакідалі Беларусь, ёй і было ўсяго семнаццаць гадоў, але добра памятае паноў. З яе сведчанняў удалося ўстанавіць новыя факты пра збеларушчаны шведскі род. І галоўнае, стала вядома, з якой нагоды Ігнацы Сволкен у першай палове XIX стагоддзя наведваўся ў Беларусь. А было ўсё даволі проста. Ігнацы, як і многія шведы, прыязджалі да нас па лес. Яны куплялі беларускую драўніну, якую пасля перапраўлялі да сябе на радзіму. І ўжо лёгка здагадацца, *і генералы. А званне іх — графы,* — распавядае сведка тых часоў. — *Жонка яго Ванда. Мелі дзяцей, дачку Іаанну, але звалі яе Ганя-Анна, і сына Эдварда, а называлі Эдакам. Эдак вучыўся ў Вільні ў гімназіі імя Элізы Ажэшкі на вуліцы Міцкевіча. Вучыўся не надта добра. Але казалі, што ён пойдзе ў ваенныя. У Вільні мелі сваю камяніцу на вуліцы Каштанова, дом 2. Жылі там, а ў Шайкуны прыязджалі летам у асноўным.*

Быў у Канстанты і Ванды яшчэ адзін сын — Станіслаў, Стась. Ён служыў вайскоўцам. У "нейкім паўстанні" яго паранілі. Ад ранення Станіслаў памёр. Пахавалі яго ў сямейнай капліцы. Можна выказаць здагадку, што Станіслаў быў з дзяцей старэйшым. А параніла яго, верагодней за ўсё, на савецка-польскай вайне. Пасля Станіслава, магчыма, нараднасілі... *Канстанты казаў, што аддаў бы ўвесь маёнтак. Выйшаў бы ў адной кашулі ў поле і пайшоў бы хлеба шукаць*".

Як прыйшлі Саветы ў Заходнюю Беларусь, жонка Канстанты Ванда разам з дачкой выехалі. Куды — невядома. Хадзілі чуткі, што паехалі ў Каліфорнію ў ЗША. У Клюшчанах дзесьці пасля 1940 года з'явілася, як яе называлі, "пані генералова". Трохі ў ксяндза жыла, трохі па людзях хавалася. У капелюшы хадзіла. Прыгожая была, хоць і старая. Гэта нейкая сваячка Сволкенаў. Пра далейшы яе лёс ніхто не ведае.

Бабця Браніслава акрамя таго, што шмат сама расказала, дык яшчэ скіравала нас на чыгуначную станцыю Гудагай. Там жыве яшчэ адзін чалавек, які працаваў у Сволкенаў. Гэта Болесь Валуевіч. Балеслаў Францавіч таксама 1922 года нараджэння. У панскім садзе ён падлеткам прышчапляў дрэўцы. Яго аповеды пацвердзілі некаторыя факты, пра якія мы пачулі ад Браніславы Масцяніцы. Але даведаліся і новае.

— *Пры мне панам адразу быў Канстанты. Хварэў на сухоты. І памёр. Хавалі ў 1929 годзе. Пані засталася з дзецьмі. Сын Канстанты Эдвард да жанчын быў ахвочы. Але ажаніўся ў выніку. У яго нарадзілася дачка.*

У 1929 годзе пасля смерці пана згарэў палац. Так сведчыць Болесь Валуевіч. Астравецкая "Памяць" надрукавала іншую дату — 1938 год. Калі пыталіся ў бабці Браніславы пра пажар, яна не памятала гэтага. Маўляў, не на яе памяці было. Верагодна тады, што палац згарэў раней за 1938 год.

Па ўспамінах Болеся Францавіча, Сволкены прымалі ўдзел у руска-японскай вайне. Не ўсе жывымі вярнуліся. Як прыйшла Чырвоная Армія, па сведчаннях жыхара Гудагая, паны з'ехалі ў Польшчу.

Фамільная капліца

У 2-3 кіламетрах ад Клюшчан размяшчаліся Шайкуны. Скіроўваемся туды, у лес, дзе раней стаяў палац, дом для прыслугі, цагельня. Там выраблялі сваю цэглу. Усё рабілі ўручную. Пры цагельні быў дом, у якім жыў чалавек. Ён, напэўна, працаваў вартаўніком. Сёння ад усіх пабудоў захаваліся толькі падмуркі і часткова сцяна. Крыху далей у лесе стаіць фамільная капліца. Яна схавана за высокімі дрэвамі. Астравецкая "Памяць" дату пабудовы капліцы падае 1840 годам. Але на гэтым культавым будынку і сёння захавалася шыльда з надпісам. На ёй пазначаны два гербы, хутчэй за ўсё Сволкенаў і Кучэўскіх, дата смерці жонкі і дата пабудовы капліцы. 1 снежня 1840 года ва ўзросце 26 гадоў памерла Міхаліна, а капліца паўстала вясной наступнага года.

У капліцу ксёндз прыязджаў з Клюшчанаў. Служыў тут і Канстанцін Стаповіч (Казімір Сваяк). У капліцы, як расказвае бабця Браніслава, знаходзілася фартэпіяна. Пасля разрабавання капліцы па лесе былі раскіданы ксяндзоўскія рызы ды іншыя рэчы. Браніслава Масцяніца збірала тое. Сабранае передала ксяндзу ў Гудагай. Цяпер капліца знаходзіцца ў дрэнным стане. Абваліўся дах, тынкоўка. Унутры смецце. Яшчэ пару гадоў — парушацца і сцены. Звонку захаваліся чатыры нішы для дамавін. Захаваліся дзве труны. У адной і цяпер ляжаць чалавечыя косткі. Мо гэта і ёсць праклятае пана Кучэўскага?

Хацелася б, каб гістарычны помнік, капліцу, нягледзячы на тое, знаходзіцца яна ў лесе ў памежнай зоне, убаку ад турыстычных маршрутаў, атрымалася захаваць. Можа, на лета атрымаецца сабраць валанцёраў, каб упарадкаваць капліцу знутры і тэрыторыю вакол яе?..

Чакаем адказу

Паездка на Астравеччыну крыху адхіліла нас ад заяўленай першапачаткова тэмы — нашчадкі шведаў у Беларусі. Хоць і пашырыла нашы далягляды. Цяпер мы чакаем ліст ад пані Магдалены Асухоўскай з Польшчы. Фактычна ж яна з'яўляецца прамым нашчадкам беларускіх шведаў.

Далей мы хацелі наведаць вёску Шведы ў Слуцкім раёне, у якой па легендзе жылі шведскія жаўнеры. Але на нашы планы паўплываў ліст з Віцебска. Гэта была прыемная неспадзяванка. Што ў лісце? Пра гэта чытайце ў адным з бліжэйшых нумароў "ЛіМа". А едзем мы, зразумела, у Віцебск.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

На здымках: Касцёл у Клюшчанах; капліца ў Шайкунах; рэшткі сцяны ад гаспадарчай пабудовы ў маёнтку.

Фота аўтара

№ 11 20 сакавіка 2009 г. ЛіМ

Чарнавік?..

Калі сёння нашаму дапытліваму і дасведчанаму чытачу, аматару саліднай, спелай прозы давесці, што Леанід Дайнека ў часопісе "Маладосць" надрукаваў не раман "Назаві сына Канстанцінам", а толькі яго вялікі чарнавік, то ён, мусіць, гледзячы на сцвярджальніка такога, пакруціць ля скроні пальцам. "А ці не збіўся, дружа, ты з панталыку?.." — і не паверыць. І будзе мець рацыю, бо Л. Дайнека, фактычна заснавальнік беларускага гістарычнага рамана, каб хацеў нават, то наўрад ці здольны быў "учудзіць" такое пасля сямі раманаў, якія атрымалі папулярнасць не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Адным словам, аўтар рамана ў "Маладосці" — сталы майстра вялікага гістарычнага празаічнага палатна.

Сёння, прызнаем, існуе шмат твораў на беларускую гістарычную тэматыку, але яны празмерна скутыя летапіснымі фактамі — халодныя, апісальныя, таму што аўтары не маюць неабходнага ўяўлення ў паказе пэўных дзей, эпізодаў, стварэння атмасферы рэальнасці, у якой яны адбываліся, і, як вынік, не маюць таго настрою і псіхалогіі, хоць ужыты ўсе сродкі і скарыстаны ўвесь гарт аўтарскага таленту. Гісторыя патрабуе ад пісьменніка жывасці, духу эпохі і жыццявобразнасці. У Дайнекі ўсяго гэткага ўдосталь. Яго творы палоняць і хвалююць чытача: ён неадрыўна сочыць за ходам сюжэта, лёсамі герояў. Раманы Дайнекі раскуплены і не пыляцца ў бібліятэках. Яны ў Беларусі маюць такую ж пашану, як і вядомыя творы "Крыжакі", "Мячом і агнём", "Патоп" Г. Сенкевіча для палякаў.

Аўтар артыкула пра новы раман пісьменніка "У пошуках жанру" Ціхан Чарнякевіч у развагах пра Дайнекаў твор "Назаві сына Канстанцінам" непаслядоўны, нервозны і сам часта падводзіць сябе супярэчлівасцю тэзісаў і высноў. Ён на працягу ўсяго артыкула, быццам бы вельмі асцярожна, далікатна разбівае маналіт аўтарскага пісьма. Не жартачкі ж — ва ўрэзцы да артыкула абвясціў свой "маніфест" патрабаванняў да жанру. Ягоны "маніфест", бадай, увабраў усю тэорыю раманнай формы. З'яўляецца думка, што крытык глядзіць на жанр, як на незалежнае радовішча, дзе і бярэ пісьменнік матэрыялы для свайго твора. А як жа быць з тым, што і жанр, і яго напаўненне (змест, сюжэт, падзеі, вобразы і іншыя элементы палатна) — уласнасць толькі аўтара, якасць якой залежыць таксама толькі ад аўтара, бо спачатку, мусіць, нарадзіўся раман, а потым ужо ўздоўж і ўпоперак над ім шчыравалі крытыкі. На працягу ўсяго артыкула адчуваецца нейкая вучнёўская няўпэўненасць у вывадах, няструйнасць думак, спаўзанне на гістарычныя факты, спасылкі на аўтарытэты (у дадзеным выпадку неаднаразова на М. Бахціна). Свайго ж непасрэднага — малавата.

У пошуках жанру

Жанр як змястоўная форма ўсё больш цікавіць мяне. Чытаеш кнігу — асэнсоўваеш жанр. Само паняцце абмяжоўвае, вучыць цярплівасці, рэгулюе ... пісьменніка і пэўным чынам характарызуе творцу. Раман — гэта, бадай, ... найважнейшы жанр літаратуры, які сінтэзуе ідэалогіі, індывідуальнасці, ... прастору ў завершанае цэлае. Нездарма сёння яго часта вылучаюць ... (пасля лірыкі, эпасу і драмы) літаратурны род. Раман — паказчык ... сталасці пісьменства, і таму даследчыкі вельмі пільна ... ў яго. Паспрабуем угледзецца ў раман Леаніда Дайнекі ... сына Канстанцінам" ("Маладосць", 2008, № 4 — 8).

> **Рэакцыя крытыка — ужо за межамі аналізу рамана, высвечваецца яскравая тэндэнцыя, чаго імкнецца дасягнуць на справе крытык. У крытыка абурэнне, што аўтар у сваім рамане — за уніяцтва, за набліжэнне да Захаду, а не да Масквы. Таму такі вытанчаны і скрупулёзны вышук промахаў Дайнекі ў ягоным чарговым рамане. Чарнякевіч быццам забыўся, што уніяцтва ўсё-такі было на Беларусі.**

Прыцягненне гісторыі ў якасці непарушнага аргумента — не лепшы метад для аналізу. Мастацкі гістарычны твор, дзе дзейнічаюць і выдуманыя, і рэальныя героі, не абавязаны быць ва ўсім адэкватным хронікам ці летапісам. Добры гістарычны раман у нашчадкаў мусіць выклікаць захапленне, суперажыванне. У такім жанры аўтар мае права на асабістае бачанне падзей.

У пошуках жанру Чарнякевіч шматкроць збіваецца да пераказу лёсу герояў, месцамі зместу рамана з мэтай даведчыць свой погляд, кінуць разнастайныя заўвагі: што ён лічыць недахопам, упушчэнем аўтара. Але ж гэта яшчэ не доказ таго, што Дайнека не павінен быў такое рабіць. Па аргументах крытыка відаць, што ён глыбока пакапаўся ў архіўных тэкстах, узброіўся, каб даказаць свайму чытачу — Дайнекаў апошні твор не адпавядае запатрабаванням да абранага жанру. Аднак Чарнякевіч не дасягнуў пастаўленай мэты, што прызнае і сам. Пацвярджэнне гэтага — "не" ў многіх месцах артыкула.

"...Яшчэ больш дэталёва распрацаваны вобраз Канстанціна Астрожскага і *многія аспекты рускай гістарычнай сітуацыі пач. XVI ст.* Але зноў жа руская рэчаіснасць адлюстраваная *як выключна схізматычная, дзікая, цёмная*". Чаму ж верыць: што "дэталёва распрацавана руская гістарычная сітуацыя ці руская рэчаіснасць адлюстраваная як схізматычная, дзікая, цёмная? Якой жа сапраўды была тады руская рэчаіснасць?! Спасылка на тагачасныя рускія светлыя галовы, як ні пракручвай яе, — цьмяны аргумент на карысць крытыка. І яшчэ: Чарнякевіч прызнае, што Дайнека добра ведае гістарычны матэрыял з мінулага Беларусі, але падае "каштоўныя звесткі наіўна". Гэтую "наіўнасць" крытык бачыць "ва ўнутраным маналогу аднаго з герояў, дзе пракручваецца гістарычная сітуацыя асобнай краіны". А яшчэ горш — гэтыя дакументы аб'яўляцца толькі праз 400 гадоў. Дакументы цытуюцца неахайна: "яны вісяць, як аб'явы, прыклееныя да тэксту, не зладжаныя з празаічным рытмам". Во як успрынята мара героя пра вольную, незалежную Радзіму! Рэакцыя крытыка — ужо за межамі аналізу рамана, высвечваецца яскравая тэндэнцыя, чаго імкнецца дасягнуць на справе крытык. У крытыка абурэнне, што аўтар у сваім рамане — за уніяцтва, за набліжэнне да Захаду, а не да Масквы. Таму такі вытанчаны і скрупулёзны вышук промахаў Дайнекі ў ягоным чарговым рамане. Чарнякевіч быццам забыўся, што уніяцтва ўсё-такі было на Беларусі. Гэта факт, які нельга адмаўляць, як і факт, што беларускую уніяцкую царкву амаль цалкам знішчылі. І яшчэ многа высноў, якія Дайнека меў поўную рацыю браць ці не браць пад увагу. Пярэчачы сваёй тэхніцы, Чарнякевіч прызнае гэта: "Гістарычныя факты пісьменнік можа трактаваць па-свойму, а крытык — на гэта крыўдзіцца". На здароўе, крыўдзіцеся, але не вымазвайце за гэта аўтара дзёгцем.

Крытык у заключнай частцы свайго артыкула па рамане Дайнекі "Назаві сына Канстанцінам" выносіць свой вырак: рамана няма, а толькі яго чарнавік.

Гэтым самым забівае апошні цвік у труну сваіх разваг, лічачы, што ў іх захоўваў аб'ектыўнасць, справядлівасць, беспамылковасць. Калі ж паверыць, што рамана няма, а замест яго "Маладосць" надрукавала чарнавік, то прыходзіцца гадаць: як так сталася — у часопісе ж таленавітыя дасведчаныя літсупрацоўнікі... Цяжка ўявіць, што аўтар, па прызнанні самога Чарнякевіча, апісаў і штурм Канстанцінопаля, і Аршанскую бітву, "проста цудоўна". Што ж атрымліваецца: Дайнека, які дапусціў столькі хібаў у рамане (гуляў вольна па гісторыі, аднабока вымалёўваў герояў, цягнуў "гуму" ў сюжэце, збядніў псіхалогію, не выкарыстаў магчымасць апісаць цікавую ўнутраную барацьбу вялікага імператара), раптам выяўляе непараўнальны пісьменніцкі талент у мастацкім адлюстраванні бітваў пад Канстанцінопалем, пад Оршай і, несумненна, у іншым, пра што крытык лукава маўчыць. Хаця аб тым, што Дайнека выдатны майстра пабудовы сюжэта маштабнага твора, ён лёгка, па-мастацку вяртаецца ў самыя раннія перыяды сусветнай гісторыі і вырульвае да надзённай гаворкі, не дапускаючы будзённасці — нудэчы, аднабаковасці, захоўвае патрэбны пафас, без чаго твор не можа сцвердзіцца.

Мне здаецца, што стральба крытыка Чарнякевіча цалкам мае характар бумеранга: цэліш па некім, а трапляеш у сябе, у сваё бачанне, і яно ўжо высвечваецца для мноства вачэй у іншым, часам вельмі нежаданым для сябе ракурсе. Ёсць і ў самога крытыка каструбаватыя выразы, думкі тыпу: "скарыстаемся вопытам М. Бахціна", "душы іх рухаюцца следам за сюжэтам", "мастацкі свет твора схінаецца да голай сюжэтнасці" ды інш... У канчатковым выніку артыкул крытыка зрабіў больш карысці таленавітаму раманісту — раманы Л. Дайнекі набудуць яшчэ больш чытачоў.

Мікола ДУБОЎСКІ

А крытык працуе з тэкстам

Пры ўсёй адкрытасці да дыскусіі я вымушаны канстатаваць, што гаворку мой апанент вядзе выключна пра мой артыкул і пра мяне. Раман Дайнекі не разглядаецца. Узнікае думка, што сп. Дубоўскі нават не прачытаў твор перад тым, як уступаць у палеміку. Іначай былі б закранутыя спрэчныя моманты, указаныя добрыя ў мастацкім плане эпізоды, персанажы — своеасаблівыя "кропкі біфуркацыі", стоячы ля якіх апаненты могуць галантна раскланяцца, не пакрыўдзіўшы адзін аднаго. Нічога такога няма. Сп. Дубоўскі напісаў не альтэрнатыўную рэцэнзію на раман Дайнекі, а рэцэнзію на рэцэнзію Чарнякевіча. Як бачым, крытычныя жанры папоўніліся яшчэ адным сваім падтыпам.

Мне прыкра ўсё гэта ўсведамляць, бо я аддаў свайму артыкулу некалькі месяцаў уласнага вольнага часу. Таму, каб не быць адвакатам самога сябе, яшчэ раз паразважаю пра твор Дайнекі і патлумачу некаторыя думкі, што, магчыма, былі ўспрынятыя чытачом першага артыкула недастаткова поўна. Артыкул "У пошуках жанру" шмат што не праясняе, давялося скарачаць яго, каб патрапіць у фармат газетнай паласы. Далібог, матэрыялаў у мяне хапіла б на чатыры такія рэцэнзіі, калі не больш.

Я найперш хацеў сказаць, што раман "Назаві сына Канстанцінам" не выкарыстоўвае напрацоўкі класічнай літаратуры XIX і XX стст. Гэта авантурны раман з элементамі фантастыкі, ён эксплуатуе архаічныя раманныя формы (то бок — нічога сур'ёзнага ў літаратурным плане). У XX ст. аналагі такіх авантурных, зацыкленых на падзейным плане твораў — панарамныя раманы-эпапеі савецкага часу "Векапомныя дні", "Мінскі напрамак" і г.д. Але Мележ, дарэчы, сам лічыў першыя варыянты свайго твора чарнавымі і неаднойчы рабіў дапрацоўкі, перарабляў "Мінскі напрамак", каб зрабіць з яго нешта больш-менш мастацкае. Таму мае словы пра чарнавік не павінны крыўдзіць сапраўднага творцу.

Зрэшты, з увагі на мэтавую аўдыторыю (школьнікі-падлеткі), авантурнасць — гэта якраз нармальна. Проста ёсць розная авантурнасць...

Наконт маіх "маніфестаў". Тэорыя раманнай формы выдатна распрацаваная М. Бахціным, гэта ведаюць філолагі ўсяго свету, а ў славянскіх краінах без спасылак на Бахціна жанр рамана ўвогуле не аналізуецца. Таму абвінавачванні ў "спаўзанні" на тэорыю Бахціна я ўспрымаю толькі як камплімент. Магчыма, трохі нязвычна ў крытыцы бачыць цытаты з літаратурнай навукі, але, на маю думку, шматлікія класічныя літаратуразнаўцы былі нашмат лепшыя крытыкі за саміх крытыкаў. Працы Бахціна, Аверынцава, Лотмана, Скафтымава, Тынянава, Эйхенбаўма, Вінакура, Жырмунскага, Гукоўскага, Ліхачова, Міхайлава, Гаспарава дапамагаюць асэнсоўваць літаратуру, а не проста есці яе з селядцом і цыбуляй.

Па-другое, я адзначаў скразную маналагічнасць аўтара ў ажыццяўленні ідэі твора. Гэты аўтарскі дыктат з выкарыстаннем прамога нашэптвання аўтарскіх думак (як у Філдынга, Гюго), мне не спадабаўся. Не думаю, што гэта суб'ектыўны погляд. Калі вам настойліва прапаноўваюць нешта купіць, вы што — адразу купляеце? Вы спачатку разберацеся, што да чаго. Правільна? Я і разабраўся, падняў гістарычныя працы Рансімэна, Меендорфа, Болатава, Дворкіна і знайшоў шмат неадпаведнасцей. Паказаў яшчэ адзін бок медаля, які быў закрыты аўтарам. Што з гэтага вынікае? Што мяне хацелі падмануць. Гэта не суб'ектывізм, а чыста чалавечае пачуццё. Сваімі напрацоўкамі я і падзяліўся з чытачом. Напэўна, гэта заняло занадта шмат месца, але я люблю аб'ектыўнасць, а найноўшая гістарычная навука — найаб'ектыўнейшая, пазаідэалагічная. Таму так шмат гісторыі. Да таго ж факты заўсёды вельмі цікава чытаць. І яшчэ я свядома імкнуўся пазбегнуць абвінавачванняў у "маскоўскім уплыве". Гэта балючая для ўсіх адраджэнцаў тэма. Таму я і спасылаўся на Міхайлу Грушэўскага, украінскага гісторыка-эмігранта, каб не было ўпічак. Так, я праваслаўны. І думаю, што чырванець мне за гэта не трэба, як і іншым васьмі мільёнам праваслаўных беларусаў. Але ва "ўяўленні" беларускага дыскурсу быць праваслаўным — гэта грэх. Добра, я не буду браць "прамаскоўскія" кнігі Каяловіча і Каніскага. Вось англічанін Рансімэн, вось украінскі нацыяналіст Грушэўскі. Якія яшчэ пытанні?

Што да хрысціянскай рэлігіі, то яна знаходзіцца вышэй за любую сістэму каардынат "мира сего", нацыянальную ў нашым выпадку. Калі для кагосьці гэта не так, вельмі шкада такога хрысціяніна.

Маналагічнасць — аблудная рэч. Менавіта таму я лічу думкі Бахціна пра поліфанію і дыялог вельмі важнымі для беларускай культурнай сітуацыі. Не трэба цягнуць коўдру, багацець можна і з Захаду, і з Усходу, застаючыся беларусам, не з'яўляючыся тым ці іншым вучоным з вядомай купалаўскай п'есы. У гэтым унікальнасць нашага вопыту. Іншая справа, што не ўсе любяць вучыцца. Адсюль і архаічныя мадэлі творчага ўспрымання і мыслення.

Раман "Назаві сына Канстанцінам" адлюстроўвае няўдалую спробу ахапіць некалькі гістарычных пластоў. Задума была добрая, смелая, скажам так, але духу на тры гістарычныя эпохі аўтару яўна не хапіла: раздзьмутасць сюжэта пашкодзіла цэласнасці ўспрымання, знізіла мастацкасць твора, вялікі аб'ём рамана абумовіў і шэраг неахайнасцей, стылістычных памылак. Сапраўды, лепш было б тры творы напісаць, але кожны вычытаць і адсеяць усё "смецце". Я тут таксама нічога новага ў крытыцы не кажу. Пачытайце артыкулы С. Запрудскага (напрыклад, пра раман І. Навуменкі ў "Вобразе-90").

Антыпатыі да Леаніда Дайнекі ў мяне абсалютна няма. Крытык працуе перадусім з тэкстам, а не з чалавекам. Яшчэ ў школе я з задавальненнем чытаў гістарычныя творы пра князя Вячку і Усяслава (дарэчы, яны лунаді перада мной, калі думаў пра Канстанціна Палеалога на сценах Канстанцінопаля і пра Канстанціна Астрожскага ў зняволенні). Проста я лічу, што і паэзія, і проза, і драматургія, і крытыка павінны "жить не по лжи". Іначай — усё дарэмна. Будзе луска замест мастацтва.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Ад вацякоў вытокі...

Культура бібліяграфіі — адзін з паказчыкаў узроўню даследаванняў гісторыі літаратуры. Беларускае літаратуразнаўства мае багаты падмурак, трымаючы навідавоку шасцітомны біябібліяграфічны слоўнік "Беларускія пісьменнікі". А як жа складваюцца справы з біябібліяграфічнымі даследаваннямі ў іншых літаратурах..? Не буду браць у разлік вялікія літаратуры суседзяў — палякаў, украінцаў, літоўцаў... Звярну ўвагу на біябібліяграфічны даведнік "Пісьменнікі і літаратуразнаўцы Удмурціі" (Іжэўск, Асацыяцыя "Научная книга», 2006 год), які напрыканцы мінулага года атрымаў з Удмурціі ад народнага пісьменніка рэспублікі Вячаслава Ар-Сяргі. І перш-наперш звярну ўвагу на яго "беларускія старонкі"

Здавалася б, якая можа быць повязь паміж зацяснутай убаку ад вялікіх шляхоў Удмурціяй і Беларуссю... Ды повязь самая што ні ёсць грунтоўная. З разлікам на тое, што, мажліва, ужо і час наспеў даследаваць напоўніцу беларуска-ўдмурцкія культурныя і літаратурныя стасункі.

Давайце ж разам пагартаем даведнік, які ўклаў кандыдат філалагічных навук Анатоль Мікалаевіч Увараў (1933—2005). У першым раздзеле прадстаўлены заснавальнікі літаратуры Удмурціі, а таксама пісьменнікі — члены творчых саюзаў. Адразу звернем увагу на час нараджэння ўдмурцкай літаратуры. У 1889 годзе рэлігійны дзеяч і этнограф Рыгор Верашчагін друкуе верш "Чагыр, чагыр дыдыке" ("Шызы, шызы, галубок") — гэты факт і становіцца зыходным для адліку ўдмурцкай друкаванай мастацкай літаратуры.

Сярод пачынальнікаў нацыянальнай літаратуры — публіцыст, этнограф Трафім Барысаў (1891—1943). Чытаем у біяграфічным нарысе пра літаратара наступнае: "...у 1914—1916 гг. — студэнт медыцынскага факультэта Казанскага універсітэта. Пасля завяршэння вучобы быў мабілізаваны на Мінскі фронт і прызначаны ўрачом эвакапункта, шпіталя, санітарнага цягніка. На фронце ўступіў у партыю бальшавікоў (чэрвень 1917). У дні Кастрычніцкага перавароту арганізаваў рэвалюцыйны камітэт пры станцыі Асіпоўшчызна (?) пад г. Мінскам..." Жыццё Барысава завяршылася ў Акцюбінскім лагеры ў горадзе Чымкенце ў Казахстане.

Нядаўна пайшоў з жыцця рускі празаік Удмурціі Валерый Болтышаў (нарадзіўся ў Віцебску 26 чэрвеня 1956 года). Адна з першых яго кніг пабачыла свет у Маскве з прадмовай Сяргея Залыгіна.

Цікавая пазнака ў біяграфічным нарысе пра Кедра Мітрэя (1892 — 1949) — класіка нацыянальнай літаратуры. Першая яго сур'ёзная публікацыя — паэма "Эш-Тэрэк", выдадзеная ў 1915 годзе ў Благавешчанску. У аснове твора — запісаная Кедра Мітрэем народная легенда. Сярод літаратурных настаўнікаў удмурцкага класіка поруч з Пушкіным, Някрасавым названы і Адам Міцкевіч. Калі забягаць наперад, то перакладчыкам твораў Адама Міцкевіча на ўдмурцкую мову быў Міхаіл Пятроў (1905—1955).

Асобная старонка ў развіцці ўдмурцкай літаратуры — творчы лёс народнага пісьменніка рэспублікі Міхаіла Ляміна (1906—1978). Галоўная тэма ў яго літаратурнай рабоце — Вялікая Айчынная... Ваяваў Лямін ў складзе 357-й стралковай дывізіі, якая вызваляла і Беларусь. Пра гэта — старонкі кнігі франтавіка "Чатыры гады ў шынялі". Дарэчы, асобнік гэтай папулярнай ва Удмурціі франтавой споведзі земляка захоўваецца ў краязнаўчым музеі ў Лепелі.

У 1963—1966 гадах служыў у Беларусі будучы паэт Андрэй Самсонаў (1942—2005).

У другім раздзеле даведніка прадстаўлены пісьменнікі і творчы актыў Удмурціі. Карацей кажучы, тыя літаратары, якія маюць кнігі, але не ўвайшлі па розных прычынах у прафесійныя творчыя саюзы.

Цікавасць выклікае нарыс жыцця і творчасці Нічыпара Карнілава (1894—1976), паэта, журналіста. Чытаем старонку яго біяграфіі: " ...У 1914 годзе прызваны ў царскую армію. Вучыўся ў школе прапаршчыкаў у Пецяргофе, пасля яе заканчэння быў накіраваны на фронт, у раён Баранавіч (Беларусь). Удзельнічаў у рэвалюцыйным руху, быў абраны ў камітэт салдацкіх дэпутатаў. Стаў кандыдатам у члены РКП(б)..." Удзельнічаў у грамадзянскай вайне на баку белагвардзейцаў, болей як дваццаць гадоў правёў у эміграцыі, у Харбіне. Мо сустракаўся там з нашым земляком, ураджэнцам Ваўкавыска харбінскім журналістам Усеваладам Іванoвым?..Пасля Вялікай Айчыннай — у сталінскім лагеры, затым на спецпасяленні. Сам выказаўся пра ўласны творчы і жыццёвы лёс наступным чынам: "Я — ахвяра смутнага часу". Дарэчы, Карнілаў — аўтар слоў самай папулярнай удмурцкай песні "Сказаў "бывай" і паехалі". Але імя пісьменніка мала што гаворыць сучаснаму чытачу і ва Удмурціі. Такія законы лёсу, адарванага ад роднай старонкі...

Завяршае даведнік трэці раздел "Літаратуразнаўцы Удмурціі". І тут нас чакае сустрэча з унікальнай асобай. Чалавекам, якога жыццё выпрабоўвала многімі абставінамі, і ўсё ж ён захаваў сумленне і годнасць. У 1971—1983 гады кафедрай рускай і савецкай літаратуры Удмурцкага дзяржаўнага універсітэта загадваў ураджэнец Рэчыцы Барыс Восіпавіч Корман (1922—1983). Шкада, што пакуль біяграфія вучонага не ўведзена ў кантэкст "Беларускай Энцыклапедыі". Дзяцінства і юнацтва Барыс правёў у Рэчыцы. У 1939 годзе паступіў на факультэт рускай мовы і літаратуры Гомельскага педінстытута. У 1941 годзе быў эвакуіраваны ў Каканд (Узбекістан). У армію не ўзялі з-за дрэннага зроку. У верасні 1942 пачынае вучыцца на факультэце рускай мовы і літаратуры Ленінабадскага педагагічнага інстытута (сённяшні Душанбе). Пасля завяршэння вучобы працуе настаўнікам у Таджыкістане. Адначасова вучыцца ў аспірантуры. Пасля яе заканчэння Кормана пакідаюць выкладчыкам. А як пачаўся ўціск за "касмапалітызм", Барыса Восіпавіча звальняюць з інстытута і абвінавачваюць у антыпатрыятызме. Добра, што не пасадзілі... Год наш зямляк настаўнічае ў Нежыне ва Украіне. У 1951 годзе ў Акадэміі навук Беларусі абараняе дысертацыю "Паэзія Максіма Багдановіча". Доктарскую — "Лірыка М. А. Някрасава" — Корман абараніў у Ленінградскім дзяржаўным універсітэце ў 1965 годзе. Наступныя гады навуковай працы Барыс Восіпавіч прысвяціў даследаванню праблемы аўтара ў мастацкай літаратуры. Стварыў стройную навуковую тэорыю з разгалінаванай сеткай узаемазвязаных паняццяў, сфармуляваў метадалагічныя прынцыпы сістэмна-суб'ектыўнага падыходу да мастацкага феномена. Плён навуковых здабыткаў па сваёй значнасці вылучае нашага земляка ў адзін рад з Бахціным, Выготскім, вучонымі, чыю спецыялізацыю не заўсёды можна ўкласці ў межы пэўнай навуковай дысцыпліны. Цяпер ва Удмурцкім універсітэце праходзяць міжнародныя канферэнцыі "Корманаўскія чытанні", выдаюцца спецыялізаваныя зборнікі ў знак памяці даследчыка. А ў 2006 годзе ў Іжэўску пачата выданне трохтомнага збору твораў Барыса Кормана.

...Вацякі — старараская назва ўдмуртаў, карэннага насельніцтва Удмурцкай Рэспублікі. Агульная колькасць удмуртаў у Расійскай Федэрацыі — 746, 8 тысяч чалавек. Ва Украіне ўдмуртаў — 8,6 тысяч, у Казахстане — 15, 8 тысяч, ва Узбекістане — 2, 7 тысячы, у Беларусі — 1,2 тысячы чалавек... Выдаюцца ўдмурцкія літаратурна-мастацкія часопісы, грамадскія ўдмурцкія газеты. Саюз пісьменнікаў налічвае сёння болей 70 членаў. Штогод выходзяць кнігі паэзіі і прозы на ўдмурцкай мове. І растуць, шырацца беларуска-ўдмурцкія літаратурныя стасункі. Пазалетась сучасная беларуская проза і паэзія была прадстаўлена ў часопісе "Кенеш". Рыхтуюцца новыя пераклады, якімі апякуецца народны пісьменнік Удмурціі Вячаслаў Ар-Сяргі.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

«Нефарматная» рэцэнзія

На старонках беларускай перыёдыкі наўрад ці можна сустрэць рэцэнзію альбо водгук на аўдыёкнігу. "Не фармат,"— кажуць дасведчаныя ў гэтай справе людзі. Так, сапраўды, не фармат, бо сама культура аўдыёкнігі ў Беларусі пакуль не атрымала шырокага распаўсюджання. Калі такая кніга і з'яўляецца, то толькі як новая форма ўжо добра вядомага твора, а не як самастойная "падзея" ў літаратурным працэсе. Менавіта такой падзеяй стаўся выхад аўдыёкнігі "Народныя фрашкі. Супольны альбом". Яна, то бок ён (дыск), не мае папярэдніка ў фармаце звыклай друкаванай кнігі (папяровы варыянт мусіць стаць толькі паслядоўнікам лічбавага). Значыць, "Народныя фрашкі..."— першая паўнавартасная беларуская аўдыёкніга.

"У Беларусі слова "фрашка" ўвайшло ва ўжытак на пачатку 1990-х гадоў як азначэнне анекдота з рэальнага жыцця", — паведамляюць вокладка дыска і ўслед за ёй ва ўступе-прадмове Севярын Квяткоўскі, галоўны "фрашачнік-фальклярыст". Аўтарамі гісторый (як і іх персанажамі) з'яўляюцца розныя людзі: літаратары, музыкі, студэнты, простыя наведнікі некаторых інтэрнет-сайтаў.

У фрашках узгадваюцца разнастайныя падзеі: звычайная паездка ў грамадскім транспарце, вяселле ў вёсцы, прыезд у Беларусь замежных чыноўнікаў. Месцы, дзе адбываюцца дзеянні, таксама розныя: Мінск, экалагічны летнік, Вільня, вёска, аграгарадок. Усе гісторыі, змешчаныя на дыску, можна ўмоўна падзяліць на дзве вялікія групы: аўтарскія (С. Квяткоўскі, У. Ахроменка, М. Мартысевіч, А. Сапега) і народныя (хоць часам і тут за "нікам" хаваецца вядомы беларускі літаратар).

Фрашкі адрозніваюцца між сабою і па структуры, і па манеры чытання іх аўтарамі: народныя — кароткія і простыя — чытаюцца акцёрам Дзянісам Тарасенкам з адпаведнай інтанацыяй, са спробай увайсці ў вобразы дзеючых асобаў; гісторыі Марыйкі Мартысевіч — выкшталцоныя і доўгія, з прэтэнзіяй на інтэлектуальнасць — чытаюцца аўтаркай зацята і стрымана, нават строга; "музычныя" фрашкі А.Сапегі гучаць натуральна і дасціпна; У.Ахроменка расказвае ў большасці пра прыгоды беларусаў за межамі нашай краіны; фрашкі Севярына Квяткоўскага ў асноўным маюць складаную структуру: адна падзея з жыцця выклікае ўспамін пра іншую, але таксама смешную, яны не чытаюцца, а нібы расказваюцца аўтарам, лёгка і нязмушана. Гэта датычыцца і "бонус трэка" — запісу праграмы "Аўдыёкніга", у якой аўтар чытае некаторыя са сваіх "Фрашак да пляшкі".

Кароткія гісторыі хутка змяняюць адна адну, жыва і энергічна ўзнаўляючы карціны беларускай рэчаіснасці, ствараючы атмасферу нязмушанасці і сяброўскасці. Напісанае (і тут варта ўдакладніць — запісанае) застаецца, таму пры жаданні можна праслухаць любімыя гісторыі яшчэ некалькі разоў (сяброў жа часам бывае дастаткова складана ўгаварыць расказаць анекдот яшчэ раз). Да таго ж зусім не хіліць на сон (як у мяне гэта звычайна бывае пры слуханні аўдыёкніг).

Слухаеш фрашкі, і пачынае здавацца, што праглядаеш альбом з фотаздымкамі... або чытаеш вытрымкі з дзённікаў розных людзей... Гэта і ёсць своеасаблівы дзённік эпохі, фальклор XXI стагоддзя.

Марына ВЕСЯЛУХА

Кніжная паліца



У выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла ў свет кніга выбранай паэзіі **Міколы ФЕДЗЮКОВІЧА** (1943—1997) *"Красадзён"* (у серыі "Беларуская паэзія XX стагоддзя"). У свой час творчасць аўтара высока цанілі такія майстры мастацкага слова, як Я. Брыль, У. Караткевіч, М. Стральцоў. Менавіта пад такім назовам хацеў выдаць сваю чарговую кніжку М. Федзюковіч, ды не паспеў. І вось цяпер яна выйшла ў свет, амаль праз трыццаць гадоў пасля яго апошняга прыжыццёвага зборніка "Макаў цвет". Укладальнік і рэдактар кнігі вядомы паэт Віктар Гардзей.

У выдавецтве Логвінававыйшла ў свет кніга **Збігнева ГЕРБЕРТА** (1924—1998) *"Рэканструкцыя паэта"*, аднаго з найвыбітнейшых паэтаў Польшчы XX стагоддзя. У кнігу ўвайшлі выбраныя вершы. Большасць тэкстаў пабеларуску друкуецца ўпершыню. Некаторыя вершы прадстаўленыя ў новых беларускіх перакладах. Змешчана таксама драма "Рэканструкцыя паэта". Прадмова М. Казлоўскай. Пераклалі творы Ю. Бушлякоў, М. Казлоўская, С. Мінскевіч, Т. Слінка, І. Урбановіч-Саўка, А. Хадановіч.

У выдавецтве "Каўчэг" выйшла ў свет кніга вершаў і рускамоўных песенных тэкстаў **Генадзя РЫМАШЭЎСКАГА** *"Мелодыя цішыні"*. Наклад па сутнасці аматарскай кнігі складае ажно 800 асобнікаў і найперш разлічаны на блізкіх і знаёмых паэта, якім прысвечана пераважная большасць вершаў.

У выдавецтве Логвінава выйшла ў свет кніга ізраільскіх апавяданняў *"Чалавек, які скраў сцяну плачу"*. У кнізе змешчана 15 апавяданняў у перакладах **Паўла КАСЦЮКЕВІЧА,** прадмовы Пасла Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Зэеў Бен-Ар'е і аўтара перакладаў. Кнігу складаюць творы такіх пісьменнікаў, як У. Валь, Э. Керэт, Г. Амір, А. Озэ, Э. Кішон... Рэдактар В. Акудовіч.



У выдавецтве Логвінаў у серыі "Другі фронт мастацтваў" выйшла кніга **Сержа МІНСКЕВІЧА** *"Я з Бум-Бам-Літа"*. Кніга складаецца з літаратурных тэкстаў аўтара. Змешчаны таксама аўтарскі летапіс літаратурна-мастацкага руху Бум-Бам-Літ, а таксама дакументы, якія суправаджалі творчую дзейнасць згаданай "тусоўкі" цягам яе існавання.

Ніна МАЕЎСКАЯ

* * *

Белая вішня, як дзіва,
Насуперак слоце цвіце.
Хочацца быць мне шчаслівай
І птушкай да шчасця ляцець.

Дзе яно толькі, каб ведаць,
Каб крылаў мне зноў не зламаць.
Бо помню мінулыя беды.
Жадання вяртаць іх — няма.

Шчасце маё, азавіся
Хоць гэтаю слотнай вясной.
Бачыш — цвіце мая вішня
Бялюткай ужо сівізной.

Шчасце маё, не таіся.
Я знаю — ты побач са мной!

* * *

Тую зорку, што мне спачувала,
Што міргала прыязна на шчасце,
Я ў бяссонні дарэмна шукала,
Ці не хмара, —
я думала, — засціць?
І туман наплываў, нібы дым.
І зрабілася неба чужым.
Дом няўтульным мне здаўся, пустым,
Бы наогул жыву я не тым,
Дзе няўтомна я шчасце чакала,
Сваю зорку на небе шукала.
Не туды пазіраюць тут вокны,
Дрэвы, ветрам стамлёныя, мокнуць.

* * *

Стыла рыпіць аканіца.
Рве яе восеньскі вецер.
Шастае, шорхае вецце —
Дому старому не спіцца.
Цёмна-пустыя вачніцы.
Холад пакоі настудзіць.
Дом, што пакінулі людзі,
Ціхі, аглухлы і ніцы.
Боль, дзе душа мая стыне:
Дзетак тут босыя ногі
Не пацалуюць падлогі.
Казка дом гэты пакіне.
Музыка не заіграе...
Прывідным ценем на століе
Вецер кране жырандолі.
...Дом без людзей памірае.

Песня

Прыйшла нечакана,
Падобная цуду.
Сказала:
"Табе абярогам я буду".
Вясёла б смяяцца мне —
Не гараваць.
За песняй слязінкі
Свае захаваць.
Ды я адказала з падзякай:
"Не трэба.
Мяне ратаваць будзе
Зорнае неба.
Яно і сагрэе мяне, і атуліць.
Жыве цяпер там
Мая мама, матуля".

* * *

А восень сваволіла і жартавала,
Смяялася дзесьці грамамі апошнімі.
Лета багацце на вецер пускала.
Кідалася лісцем,
як меднымі грошамі.

Наіўнаю восень была, маладою.
З вятрамі гуляла
над колкаю пожняю.
Гарэза — не знала,
што станецца з ёю.
І думала быць маладой
ды прыгожаю.

Дайгралася,
ледзьве брыдзе ўжо ў згрызоце.
Азяблай,
ад хмелю знясіленай лотраю.
Заместа адзення —
рудое ашмоцце.
Стыдаецца шэрасці,
стану бядотнага.

Нагнала туману з нізін і балотаў
І хмараў сівых
на шляхі жураўліныя.
Каб скрасіць сваю галізну
і бядоту,
Каралямі ўбрала імхі —
журавінамі.
І плача яна... Як слязам дасі рады?
Зіме саступіць
сваё месца збіраецца.
І вецер, што з ёю важдаўся, не рады.
Ён пад парасоны
людскія хаваецца.

* * *

Г. В. Шаблінскай

Сцвярджаць я дасканала
не бяруся.
Скажу адно,
што чула ад людзей:
Ёсць Бога пасланцы
на Беларусі.
Навошта знаць вам,
Хто яны і дзе.

У гэта трэба проста
шчыра верыць,
Як у наяўнасць самаго Тварца.
Адкіньма ж мы ўсялякія хімеры,
Якім цяпер ні краю, ні канца.

Яны ж пакуль свае
не кажуць лікі.
І Бог на іх не ўкажа нам ані,
Балючыя яму людскія крыкі,
І злоснае: "Распні яго, распні!"

Нам трэба сёння жыць
адзіным мірам.
І адкрываць святло
ў сваёй душы.
І чуць іх галасы ў жывым эфіры,
Каб справы
несмяротныя вяршыць.

* * *

Дзень Ільёвы не лагодзіў,
Не хітрыў, бы жох.
А прыйшоў, як і прыходзіў,
З аблажным дажджом.
А салома не прыбрана,
І не скошан луг
У Міколы і Сцяпана...
Вунь сядзяць удвух
Пад страхою каля хаты
І пускаюць дым...
— На работу зухаваты
Быў ты маладым.
— Ды і ты такі ж упраўны.
Як стагі вяршыў!
— Мо Ілья прыйшоў зарана:
Хтосьці награшыў.
— Ды і мы цяпер не знаем
Толкам яго дня,
Робім тое, што, бывае,
Скажа старшыня...
Так сядзяць, успамінаюць
Маладосць сваю.
Часам, праўда, папракаюць
За дажджы Ілью.
Не дзівіся, не гнявіся
Ты на іх, Ілья!
Раз пара твая, то ліся,
Дождж! Ды без гнілля.

Алесь СПІЦЫН

* * *

Вятры ў нябёсах паліруюць
Свяшчэнны лазурыт.
Вясна аправу ім рыхтуе
З лістоты і травы.

Пяшчотна глебу саграваe
І абуджае сок.
І перамен душа чакае,
Рыхтуе новы крок.

Я з ветрам і вясною заўтра
Ўвайду ў Сусветны цэх.
Хай спраўдзіцца задума-мара —
Пачнецца працы бег.

Мы станем абрабляць ад ранку
Смарагды і сапфір
Паводле схем, якія даў нам
Спрадвечны Ювелір...

* * *

Барока — ў небе,
Вішні цвет — ля хатаў,
Лясы святыя — на пагорках.
І сведчыць
Зніч
Над вогнішчам
Гарачым —
І мкнуць малітвы
Ў фіміям вясновы
На крылах
Ашалелага
Вятрыскі.

У Менску — розум,
Гонар — у Нясвіжы,
А у Жыровіцах,
Напэўна,
Сэрца...

* * *

Б'ецца, як полымя свечкі,
Рэгента ў цемры далоня,
Пальцаў супольнасць танцуе,
Такт адбіваючы слушна.
Гэтай рукі хударлявасць
Пасвіць, як статак авечы,
Зборы дыханняў шматлікіх,
Лучнасцю абдараваўшы.
І цеплынёю мелодый
Поўніцца храма прастора.
Ў гэтыя моманты верыш,
Еднасць адчуўшы святую:
Свет ад марозу не згіне,
Пакі ў гарачым адзінстве
Брацкія хоры спяваюць...

* * *

Бруіцца,
Пеніцца па краі
Малаком неабсохлым,
Як малады ручай,
Абноўленая Свіслач...
І качары,
Кавалачкамі пенапласту
Бялеючы на сонцы,
На хвалях люляюцца —
Горад
Пахне
Вясною...

* * *

Імя мне Трошачкі:
Я пакрысе паўсюль.
Я трошкі увайшоў
І трошкі выйшаў,
Я трошачкі бядняк,
Я трошачкі куркуль,
Я трошкі для сябе,
Крыху для іншых.
Я трошачкі прастор,
Я трошкі цесны кут,
Я трошачкі святы,
Крыху распуснік,
Я трошачкі з табой
І трошачкі не тут,
Я трошкі матылёк
І трошкі вусень.
Я трошачкі змагар,
Крыху калабарант,
Я трошкі цнота
І крыху загана,
Я трошачкі пяро
І трошкі атрамант,
Крыху нахабны
І крыху рахманы.
Я трошкі памаўчу,
Каб трошачкі сказаць,
Я трошачкі — адказ,
Крыху — пытанне
Я трошкі зачыніў,
Каб трошкі адчыняць,
Я трошкі веданне
І трошачкі нязнанне.
Я Трошачкі ва ўсім,
Мне Трошачкі імя,
І вось табе яшчэ
Адно прызнанне:
Я трошачкі чужы,
Я трошачкі не я,
І ў тым мая пакута
І адхланне...

Фота Кастуся Дробава

Лучок

Алесь ВЕТАХ

Апавяданне

Ужо некалькі дзён яго вярэдзіла адна-адзіная думка — і такая дробязная, мізэрная, што і казаць няёмка. Але яна засела стрэмкай, не давала спакою, забрала сон. Да апоўначы ён ляжаў, думаў і вымяркоўваў, што і як будзе рабіць. Галоўнае, разумеў: трэба тэрмінова ехаць на радзіму. Кінуць-рынуць літаральна ўсё — і вырвацца туды хоць на адзін цалюсенькі дзень. Да таго ж і ліст, атрыманы з сельсавета, прыспешваў, падсцёбваў аблуднага сына вёскі, які забыўся на бацькоўскую хату, апошні раз паказваўся тут напрадвесні, калі яшчэ пад маркотнымі яблынямі ляжалі лапікі снегу. У той афіцыйнай паперы ён са строгасцю папярэджваўся, што калі "ў бліжэйшы час не будзе наведзены парадак на прысядзібным участку", то давядзецца заплаціць штраф.

Уласна кажучы, Віктар Касцецкі думаў не столькі пра гэты ліст і саму паездку дахаты, колькі пра зусім канкрэтную, пэўную рэч. Калісьці яна спрытна хадзіла ў бацькавых сялянскіх руках і зразала траву, збажыну, бульбоўнік. Яна была неад'емным атрыбутам у клеці ці паветцы, адной з галоўных працоўных прылад, без якой бацьку немагчыма было б гаспадарыць, рыхтуючы харч для каровы, а значыць, нельга было б жыць-існаваць увогуле. З каровіным малаком дзяцінства Віктара не было галодным, а сям'я нават мела сякі-такі грашовы прыбытак: зроблены сыр і масла матка прадавала на кірмашы. Прылада тая — дзедаўская, старая, як свет, звыклая і мірная, хоць як і зброю яе калісьці нашы продкі скарыстоўвалі: хапалі, як штосьці даймала, дапякала так, што трываць не было рады. Яна — вось сялянскага свету, акурат на яе, як уяўлялася Віктару, можна было б вялікі шар у выглядзе глобуса насадзіць — атрымаўся б адмысловы знак-сімвал. Фантазія разняволілася, і ён, супрацоўнік гістарычнага архіва ў сталіцы, падумаў пра тое, як цудоўна было б на якім-небудзь высокім кургане паставіць помнік селяніну з касой. Віктару нават прымроілася ўрачыста-святочнае адкрыццё гэтага пастамента ў роднай вёсцы: быццам ён разам з нейкім старым дзедам у белай світцы разразае вялікімі нажніцамі чырвоную стужку. Віктару думалася пра надзвычай патрэбны, як сказалі б дачнікі, інструмент у садова-агародным інвентары. Без гэтага інструмента не было сэнсу ехаць на радзіму, дзе вакол бацькоўскай хаты шугае травастой. Яму вельмі пільна, неадкладна патрэбна была звычайная каса, дакладней, не ўся, бо лязо і касільна ён меў, а надзвычай яе істотная дэталь — лучок, а менавіта гэтак называюць у яго мясцовасці ручку касы. Летась Віктар вёў апошні пракос у садзе, і каса натрапіла на невялікі яблыневы сук у траве, які ён проста не заўважыў, а па гэтай прычыне лучок не вытрымаў — і трэснуў, разляцеўся папалам. Ён ездзіў у горадзе па спецыялізаваных крамах і там пытаўся пра гэтае прыстасаванне, без якога каса — не каса, а так сабе: кій з сагнутым жалезным носам. Шораз ён чуў адмоўны адказ, пры гэтым гандляркі тлумачылі, што асобна ручка для касы ніколі не прадавалася, ды і косы цалкам да іх не завозяць, у наяўнасці маюцца толькі стальныя палотны. Віктар паехаў на прыгарадны базар, але і тут пошукі поспеху не мелі. Ён разгубіўся, не ведаючы, дзе знайсці ці набыць ручку-лучок, каб зноў зрабіць працаздольнай гэтую бацькаву памочніцу, якая і яму, Віктару, дапамагала да пары да часу, пакуль не здарылася тое, што здарылася. І вось трава, мусібыць, стаіць пры хаце вышэй калена, захінае кусты парэчак і агрэсту, а мо нават параўнялася з плотам, бо хапала і спорных дажджоў з навальніцамі, ды і сонца нястомна шчыравала, гнала ў рост зеляніну. Дзіва-дзіўнае, але каса яму ўжо снілася: лётала, круцячыся бумерангам, у бязважкай блакітнасіняй прасторы, а ён, Віктар, у бліскучым серабрыстым скафандры рухаўся па сваёй арбіце, усё хутчэй і хутчэй аддаляўся ад гэтай так патрэбнай і жаданай прылады. Раптам на ёй лопнуў лучок — і разваліўся на часткі, на адной з якіх матляўся пасак. Разламаны лучок у выглядзе дзвюх драўляшак пачаў з касмічнай вышыні хутка падаць і набліжацца да Зямлі...

Віктар прахапіўся а палове шостай, на самым досвітку, калі гарадскую прастору ў спальным мікраёне пачаў запаўняць напорысты, назойлівы шум машын і тралейбусаў. Звечара ён вырашыў як мага хутчэй ехаць на радзіму, і гэтае імкненне мацнела ў яго начных згадках ды роздумах, зрабілася ўнутраным поклічам, нават усёпаглынальнай думкай-страсцю. Віктар адчуваў, што, як толькі пачне абкошваць вакол хаты і пры самым плоце ад вуліцы колкі дзядоўнік з лапухамі, то душа адразу вернецца на месца, інакш кажучы, супакоіцца, палагоднее, а сам ён набудзе ўпэўненасць клапатлівага і адказнага гаспадара.

Адно, што перашкодзіць яму адразу ўзяцца за працу, — адсутнасць гэтага злашчаснага лучка. Віктар не мог прадбачыць, што яго напаткае. Ён спадзяваўся на спрыянне каго-небудзь з суседзяў або аднавяскоўцаў. Магчыма, нехта мае лучок пра запас і выручыць яго, Віктара: калі не пагодзіцца прадаць, то на дзень-другі дасць ім пакарыстацца. У іншым выпадку, патлумачыўшы сітуацыю, давядзецца пазычыць касу цалкам, хоць Віктар цудоўна ведаў: на вёсцы не любяць, калі заходзіш у хату з працягнутай рукой. Але калі такая нявыкрутка, то нічога не паробіш — трэба ісці ў пазыкі ці па дапамогу. Па дарозе на радзіму ў рэйсавым аўтобусе безупынна думалася, як адрамантаваць касу.

Прагноз Віктара наконт відовішча пры хаце спраўдзіўся. З касьбой ён прыпазніўся тыдні на два. Праз высокую, крыху выгаралую на сонцы, непразазную і густую траву гарадскі прышэлец праціснуўся да дзвярэй хаты, адчыніў іх і, скінуўшы з пляча сумку з харчам на падлогу ў сенцах, пачаў адразу пераапранацца. Калі нацягваў выцвілы спартыўны касцюм, да яго даляцеў гнеўны і пагрозлівы голас суседа Ляховіча. Яго слоўны паядынак з жонкай распальваўся, абое лямантавалі на ўсе застаўкі, здавалася, зараз пачнецца бойка. Як толькі Віктар паказаўся на суседскім двары, то грозная сварка адразу сціхла: сівабароды Васіль Ляховіч зрабіў колькі крокаў насустрач і парукаўся, а ягоная Маруся паздароўкалася нехаця — кіўком галавы.

— Урэшце, завітаў, птах ты наш залётны! — выгукнуў сусед і ўсміхнуўся сваім вялікім ротам з праэджанымі зубамі: — Наколькі прыехаў?

— Трэба каля хаты абкасіць, травастой знішчыць, а там паглядзім, — адказаў Віктар і выклаў патрэбу, з якой прыйшоў: — Каса, дзядзька Васіль, летась падвяла, выбыла, як салдат-калека, са строю. Лучок не вытрымаў, хруснуў. Цяпер і не ведаю, як адужаць гэтыя джунглі.

— Бачна, братка, нічым табе не дапамагу, — развёў рукамі сусед, які затым прысеў на тоўстую калодку, прыпаліў цыгарэту і пачаў тлумачыць пэўныя акалічнасці, датычныя просьбы сталічнага госця. Ён гаварыў, нібы апраўдваўся: — Ведаеш, у мяне самога каса, як на тое ліха, паламаная. Сёлета цяжка было касіць, бо і я не паспеў у пару да касавіцы прыступіцца. Трава крыху зажарсцвела, далікатнасць і падатлівасць страціла. Касільна двойчы не вытрымлівала, давала трэшчыны і расколвалася. А калі лучок пэнкнуў, то выкручвацца давялося. Узяў стары веласіпедны насос, адкінуў ад яго ручку з помпачкай. Алюмініевую трубку пасярэдзіне крышку распляскаў, сагнуў і на касільна прымацаваў. Можна сказаць, пратэз зрабіў. Неяк з горам папалам сшоргнуў клін. Каса не слухалася, пратэз гэты раз за разам вылузваўся. А дзе траву пагамтаў, бароды пазаставаліся, то там Маруся з сярпом прайшлася. Яна ў мяне ўвішная, як бачыш парадак навяла. Так што мая каса цяперака, як казала некалі нябожчыца маці, "адно ўбейства".

— Што ж рабіць? — не чакаючы адмовы, з нейкай дзіцячай разгубленасцю амаль прашаптаў спахмурнелы Віктар.

Гэтае яго пытанне адгукнулася цэлым маналогам прастадушна-шчырага суседа, які гаварыў з веданнем справы пра ўзніклую складаную сітуацыю:

— Спагадаю, братка, але на вёсцы сёння наўрад ты лучок знойдзеш. Нават за долары не прыдбаеш. Я вунь усе ногі збіў, шукаў хоць каго, каб паказаў, як той лучок вырабіць. Думаеш, знайшоў? Не, дулю з макам. Чаму? Бо ты, мусібыць, не ведаеш, што ў нашай Калінаўцы мужыкоў старых засталося менш, чым пальцаў на руцэ: усяго трое. Адзін — глухі, другі — Рудакоўскі, ён у калгасных бухгалтарах хадзіў — паняцця не мае, як зрабіць гэтую штуковіну, кажа, што косы раней на базары купляў, а тых базараў гадоў трыццаць як ужо нямашака; і толькі Адась Клімчэня толк у лучках ведае, але дапамог, як хваробе кашаль. Калі ты, братка, забыў, у таго снегу зімой не дапросішся. А я тут пра лучок яго даймаць пачаў. Тлуміў ён мне галаву, доўга не па справе гаманіў. Пасля ўсё ж сказаў, што трэба з сырой лазы выразаць лучок. Кажа, ідзі сабе і высякай лазіну, пасля згінай яе і шчыльна абціскай касаўё. Вось і ўся навука. Кажу, што прынясу яму лазу, і прашу, каб паказаў мне, як лучок зрабіць. Адгаворку пачуў: вочы не бачаць, рукі не слухаюцца. «Ідзі і вучыся», — сказаў. Нічога ў мяне з той лазы не атрымалася. Для гэтай справы руку трэба прывучыць, каб яна слухалася. Кінуў — марны занятак. Можа, вальнейшы буду, дык сяду на ровар ды па суседніх вёсках праеду — глядзі, у каго і напытаюся лучок.

Віктар Касцецкі ад суседа ўведаў, што адрамантаваць касу тут, у вёсцы, не атрымаецца, адшукаць так патрэбны лучок — гэта праблема з праблем. І яго, чалавека ўвогуле ціхага, апанавала вялікае хваляванне: няўжо перастаялая трава пры бацькоўскай хаце так і застанецца некранутай? Усю яго істоту пачалі да краёў запаўняць злосць, крыўда і іншыя адмоўныя эмоцыі. Сердаваў і злаваў Віктар немаведама на каго, але больш за ўсё дакараў і ганьбіў самога сябе: бо і лучок не ведае, як зрабіць, і няма яго дзе папрасіць ці набыць, і ў Калінаўку, як з прывязі сарваўшыся, прымчаў дарэмна. З'явілася нядобрае прадчуванне: давядзецца кудысьці ехаць, магчыма, спатрэбіцца вяртацца назад у горад, каб там прадоўжыць пошукі крамы або базару, дзе можна прыдбаць касу ці хаця б ручку да яе. Што і казаць, лучок — маленькая рэч, але ён падвёў няшчаснага сына вёскі, завязаў праблемны вузел, давёў да кіпення і адчаю.

І ўсё ж Віктару Касцецкаму ў той дзень пашэнціла. Дапамагла цётка Тумашыха, з якой ён загаманіў, ідучы ад Васіля Ляховіча. Тая, калі ўведала пра ягоныя мітрэнгі, падказала выйсце. Віктар падаўся за вёску да рабочых у аранжавых камізэльках, якія абкошвалі бензакасілкамі пустазелле пры шашы. Ён дамовіўся, каб тыя прывялі ў прыстойны выгляд заросшую сядзібу. Так і атрымалася: два дзябёлыя мужыкі паклалі сцяну травастою. Віктару гэта каштавала некалькі бутэлек гарэлкі, але аддаваў ён «вогненную ваду» з лёгкім сэрцам і радаснай усмешкай на твары. Назаўтра падаўся да самага сумнага месца на зямлі. На могілках ажарсцвелую, шорсткую траву ён абрываў рукамі: сям-там парэзаў і паздзіраў скуру.

У гарадскую кватэру Касцецкі вярнуўся пануры і заклапочаны. Ён ведаў, што праз месяц, а то і раней мурава зноў падымецца і пачне буяць, як зялёны гай. У аўтобусе пачуў прагноз сіноптыкаў, што ліпень чакаецца дажджлівы, а гэта значыць — трава будзе расці, быццам на дражджах. Думка пра кассё-лучок не пакідала яго. На працы па падказцы свайго калегі знайшоў сайты ў Інтэрнеце, дзе паведамлялася, што ў маскоўскіх гіпермаркетах і спецыялізаваных крамах можна набыць набор касца № 7 з металічным касаўём. І ён вырашыў, што паедзе па касу ў Маскву. Калі сказаў пра свой намер жонцы, тая адрэагавала нервова, з абурэннем і гняўлівасцю:

— Колькі ты будзеш мітусіцца, як збянтэжаны Саўка?! Месца сабе знайсці не можаш. Хутка звар'яцееш са сваёй кулькай. Спыніся!

Тут трэба заўважыць: у вуснах жонкі Касцецкага, якая была родам з-пад Мастоў, слова «кулька» — мясцовая назва той жа самай ручкі касы.

Віктар пакрыўдзіўся на Валерыю, з якой пражыў у шлюбе амаль дваццаць гадоў, але, здавалася, не прычакаў сапраўднага ўзаемаразумення ў такія вось бязрадасныя, нават пакутлівыя для яго хвіліны жыцця. Ён ужо трызніў паездкай па набор касца. Жонку пачаў непакоіць і палохаць яго дзіўны стан, і ёй падалося, што з Віктарам дзеецца штосьці анамальнае. «А мо гэта выдаткі пераходнага ўзросту?» — думала-разважала яна пра мужчынскі век свайго Віктара, якому летась мінула сорак вёснаў і зім. Валерыя, калі пабачыла, як той, лежачы на канапе, падоўгу глядзіць у столь, зразумела, што нешта трэба рабіць, і ў яе на сподзе душы зварухнулася шкадоба. Віктар не зважаў на жонку, маўчаў і думаў пра сваё.

— Віцечка! — ціха і ласкава абмовілася Валерыя, затым прыхінулася да мужа і лёгкім дотыкам рукі кранулася яго шчакі, пацалавала ў лоб і пачала гаварыць: — Не трэба так маркоціцца, даймаць сябе. Няўжо на Маскве ўсё клінам сышлося? Ехаць за трыдзевяць зямель, у трыдзевятае царства — гэта не сур'ёзна. Ды і навошта табе цяжкая металічная каса? Рукі адарвеш. Лепш давай адшкадуем грошай і набудзем бензакасілку.

Гладзячы рукой мужа па галаве, як малое пакрыўджанае дзіця, Валерыя з пяшчотай у голасе нараспеў прамовіла: «Закасі, мае вёсны, касец малады...». Яна яшчэ мацней прытулілася да Віктара...

У Маскву Касцецкі не паехаў. Аднаго разу суботнім ранкам ён з радасцю сказаў жонцы:

— Здаецца, фартуна ўсміхаецца, можа і пашэнціць. Учора ў наш архіў патэлефанаваў мой аднакурснік Раман Дземідовіч. Ён цяпер жыве каля Слуцка, у вясковай школцы працуе. Ён свой клопат меў, дробязную праблему прасіў дапамагчы вырашыць, а я таксама паплакаўся, сказаў, што застаўся без касы. Раман паведаміў сенсацыю: ён ездзіў у мінулую нядзелю на слуцкі базар і бачыў там цэлую гару лучкоў, якімі гандляваў стары дзед. Галоўнае, каб іх не паспелі расхапаць. Трэба ляцець!

— Ты хіба птушка? Віктар!.. — толькі і выгукнула жонка.

Але Віктар быццам і не чуў яе, похапкам апрануўся, не выпіў нават кубачак сваёй любімай кавы. Выходзячы з кватэры, на развітанне кінуў:

— У Слуцк. Па лучок.

У Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры адбыўся вечар памяці заслужанага артыста Беларусі Паўла Пекура, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння гэтага адметнага акцёра-купалаўца.

Незабыўны купалавец

Яго памятаюць і сёння. Гонар знаёмства, лёгкі сум, настальгія па мінуўшчыне — усё гэта адчувалася ў выступленнях прысутных. Калегі Паўла Аляксеевіча — Зінаіда Зубкова, Ала Доўгая і Арнольд Памазан казалі пра сляпую хаду часу, што не пашкадавала сапраўдны талент, які застаўся не да канца выкарыстаны. На такіх вечарынах сустракаюцца людзі, якія добра ведалі героя ўспамінаў. Вось і тут: прыгадалі і заўсёдную цыгарку, і газету пад пахай, і дзівосныя вочы з прыжмурам, і ўсмешку — звычкі Пекура ў штодзённым жыцці, а яго акцёрскае аблічча паўстала з чорна-белых фотаздымкаў. У такой атмасферы імя з падручнікаў, звязанае з вобразамі персанажаў п'ес К.Крапівы, А.Макаёнка, А.Маўзона, У. Шэкспіра, Ж. Б. Мальера, А. Чэхава, А.Астроўскага, становіцца бліжэй...

"Гэта былі людзі незвычайнага пакалення, з якога пачыналася гісторыя Купалаўскага тэатра, — згадвае заслужаная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Зінаіда Зубкова. — Яны не іралі, а існавалі ў матэрыяле, жылі ў сваіх ролях. Калі слёзы, дык сапраўдныя. Прытым, што ў той час спектаклі ішлі на працягу трох гадзін, не менш. Я тады толькі прыйшла ў тэатр і вучылася ў Паўла Аляксеевіча акцёрскаму майстэрству. Ён вучыў на сцэне казаць так, як у жыцці, каб глядач не заўважаў, што знаходзіцца ў тэатры. Пекур быў індывідуальнасцю. Своеасаблівасць яго таленту выяўлялася і падчас працы над вобразам. У савецкія часы адмоўны герой мусіў быць адмоўным ва ўсіх сваіх праявах. Але для Пекура цалкам адмоўнага чалавека не існавала, ён і ў антыгероях шукаў станоўчае, чалавечае. Магчыма, гэта была нейкая ўнутраная патрэба, патрэба душы".

Шкада, што няшмат купалаўцаў прыйшло на гэтую вечарыну. Не было нікога з маладых артыстаў. А сувязь творчых пакаленняў не павінна губляцца. Зразумела, першыя пакаленні артыстаў-купалаўцаў сышлі ў гісторыю і для большасці ўжо асацыруюцца з афіцыйным сухім тэкстам энцыклапедый ды падручнікаў, але без іх немагчыма ўявіць сённяшні Купалаўскі тэатр...

Марына ДОЎГЕР

Вандроўныя клоуны

"Усмешка клоуна" — выстаўка пад такой назвай адкрылася ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі. Тут прадстаўлена калекцыя з унікальнага "Перасоўнага музея клоунаў", які належыць Мікалаю Чалнакову — былому акрабату, заслужанаму артысту Расіі, лаўрэату міжнародных конкурсаў, дацэнту Расійскай тэатральнай акадэміі. Збіраць гэтую незвычайную экспазіцыю М. Чалнакоў пачаў у 1993 годзе, калі падчас гастроляў у Нью-Йорку набыў першую сувенірную "цыркавую" статуэтку. Потым, вандруючы па краінах трох кантынентаў, ён папаўняў свой музей. Назбіралася ўжо каля 500 клоунскіх выяў: бронзавых, керамічных, шкляных — з розных іншых матэрыялаў. Бадай, самы адметны экспанат — клоун, які важыць больш як тону.

Я. КАРЛІМА

Жыў побач мастак...

Кожны дзень, ідучы па немудрагелістых бешанковіцкіх вуліцах, задумваешся: што за людзі жывуць за вокнамі дамоў? Чым яны адметныя? Пра тутэйшага мастака Івана Бабаедава я чула і раней, але не верылася, што гэта была адметная асоба. Напэўна, жыццё навучыла мяне правяраць усё сваімі вачамі і сваімі вушамі. Чакала школьных канікулаў, каб выдалася вольная гадзіна завітаць у гэты дом. Хацелася і вучняў сваіх далучыць да знаёмства з творчасцю земляка, члена Саюза мастакоў Беларусі Івана Бабаедава.

Мы прыйшлі з вучнямі майго класа ў дом, дзе яшчэ шэсць гадоў таму творца пісаў свае карціны. Нас сустрэла жонка мастака, а знаёмства з карцінамі, што запоўнілі ўсю хатнюю прастору, распачаў сын — Васіль Іванавіч. Убачанае ўразіла. Напісаныя алеем, у асноўным, пейзажы і нацюрморты прывабілі майстэрствам, багатай палітрай фарбаў, насычанай вобразнасцю. Сюжэты жывапісных твораў распавядалі пра любоў, якая жыла ў сэрцы мастака, — да сваёй радзімы, да родных краявідаў, да блізкіх яму людзей. Нейкім вострым болем адгукнулася "Апошняя вясна", дзе на фоне расквітнелай грушы намалявана старэнькая бабулька — маці жонкі І. Бабаедава. Стыль у мастака далёкі ад гладкапісу, таму не ўсе дэталі выпісаныя з вялікай дакладнасцю, але пры гэтым бачыш і адчуваеш самыя тонкія нюансы чалавечай душы і пачуццяў мастака.

"Кветкі і фрукты" — нацюрморт, які радуе вока асаблівай свежасцю, буйствам фарбаў. Такім, мабыць, успрымаў мастак гэты свет. А як "дыхае" зямля з-пад толькі што расталага снегу на карціне "Сакавік у лесе"! Здаецца, яшчэ ледзь-ледзь, і яна народзіць нейкае вялікае дзейства, якое абудзіць усё жывое.

"Сакавіцкі вечар у лесе", "Вечар на Прыдзвінні", "Крымскія горы", "Зіма", "Восеньскі дзень", "Лазня"... Шмат работ на сценах роднай хаты, пабудаванай самім мастаком. А многія проста няма куды вешаць. Ладная частка спадчыны мастака пасля яго персанальнай выстаўкі ў Віцебску ў 1990 г. трапіла ў Ізраіль, Канаду, Італію: везлі беларускія эмігранты памяць пра Беларусь за сабой, бо ў кожным творы — дыханне радзімы.

Партрэтным жанрам Іван Цімафеевіч не займаўся. Але вісіць над ложкам жонкі яе партрэт, выкананы натхнёна і з любоўю. А колькі прыгожых акварэльных і графічных малюнкаў: цэрквы, што яшчэ захаваліся на той час у раёне, бешанковіцкія краявіды і, канечне, Дзвіна. Яе мастак пісаў і плынную, і паўнаводную, і веснавую, і спакойную, і велічную.

Усе работы зберагаюцца сынам і жонкаю Івана Цімафеевіча. Карціны вісяць так, як было пры яго жыцці... І нават у вітальні на сцяне побач з пейзажам — шапка мастака. Здаецца, ён зараз выйдзе і распавядзе пра сябе. А жыццё ў яго, відаць, насычанае было: ваяваў, шмат медалёў мы ўбачылі на яго фотаздымках. Ды яшчэ, кажуць родзічы, багата дзённікаў пакінуў пасля сябе... Можа, хто з маіх сённяшніх вучняў, пасталеўшы, зацікавіцца імі, паклапоціцца, каб іх апублікаваць. Гэта ж наша гісторыя. Трэба ведаць яе, каб звацца людзьмі.

Наталля БОНДАР-ГАЛАВАЧ,
выкладчык школы мастацтваў

г. п. Бешанковічы

На здымку: Васіль Бабаедаў ля карцін свайго бацькі — мастака Івана Бабаедава.

Першыя музычныя інструменты Уладзімір Козак зрабіў для жонкі Веры, музыканта, якая з 1970-х гадоў кіравала дзіцячымі аркестрамі народных інструментаў, іншымі музычнымі калектывамі, а з 1995-га працуе мастацкім кіраўніком узорнага ансамбля народнай музыкі "Жалейка". У дзяцінстве бацька навучыў Уладзіміра рабіць лыжкі, з якіх яго творчасць, па сутнасці, і пачалася...

Для майстра галоўнае — добры настрой

Праўда, спачатку было нялёгка: без дакладна разліченых памераў створаныя музычныя інструменты проста не гучалі. Самы тонкі шлях да сэрца інструмента Уладзіміру і Веры практычна не ўдалося знайсці ні ў архівах гарадоў і вёсак, якіх яны аб'ехалі нямала, ні ў знакамітых майстроў, якія не хацелі дзяліцца сваімі сакрэтамі...

Ён працаваў над інструментамі днямі і начамі, а часам і суткамі ў сваёй маленькай хатняй майстэрні. У справе, асабліва пры настройцы інструментаў, майстру дапамагала жонка — яго галоўны заказчык. Уладзімір ужо вырабіў больш як паўсотні старадаўніх беларускіх музычных інструментаў. Адзін з іх — двайную трашчотку — прыдумаў сам, а яшчэ змайстраваў з казінай галавы мудрагелістую дуду, з мордачкай, рагамі, з мехам, вывернутым вонкі. Яшчэ адна вынаходка У. Козака — пластмасавыя муфтачкі і трубачкі ў дудках, жалейках, якія палягчаюць раздзьмуванне, судакрананне з губамі. І хаця майстар прызнаецца, што не чытае ні замоў, ні вершаў, калі працуе над інструментамі, усё-ткі казачна прыгожымі выходзяць яны з яго залатых рук. "Самае галоўнае для майстра — настрой. Я заўсёды іду працаваць у майстэрню толькі ў добрым настроі", — гаворыць Уладзімір.

На адным з аўкцыёнаў у Мінску ў 1990 годзе інструменты Уладзіміра Козака прыцягнулі ўвагу Уладзіміра Мулявіна, якога ўразіла лёгкасць "самаробнага" барабана. А ў 1991-м у Віцебск да Козакаў прыязджалі музыканты ансамбля "Песняры", каб набыць ударныя і шумавыя інструменты. Не так даўно "Песняры" заказвалі ў віцебскага ўмельца новую ліру. Падчас правядзення "Славянскага базару ў Віцебску" інструменты Уладзіміра Козака неаднойчы набывалі Надзея Бабкіна ды іншыя музыканты. Удзельнік многіх фестываляў і конкурсаў, гэты майстар станавіўся там лаўрэатам у сваім жанры.

Сакрэты бацькоўскага мастацтва вырабу інструментаў цяпер асвойваюць трое сыноў Уладзіміра і Веры Козакаў: Слава, Сяргей, Віталь. Акрамя таго, што хлопцы з дзяцінства віртуозна граюць на многіх інструментах, двое з іх — Слава ды Віталь — музыканты ансамбля "Жалейка".

Наталля ЗАХАРАНКА
г. Віцебск

На здымках: ансабль "Жалейка"; набор жалеек ды бубен, зробленыя У. Козакам.

Зачараваныя джазам

Беларускаму джазу сёлета 70 гадоў: як вядома, першы дзяржаўны эстрадны аркестр у Беларусі быў створаны пад кіраўніцтвам джазавага музыканта Эдзі Рознера ў 1939 годзе. Гэтай знамянальнай даце прысвячаўся XX Міжнародны фестываль "Мінскі джаз-2009", праведзены Нацыянальным канцэртным аркестрам Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.

У нашай сям'і зрабілася традыцыяй хадзіць разам на канцэрты джазавай музыкі. Гэта незабыўныя ўражанні і зарад бадзёрасці на некалькі дзён. На жаль, некаторыя падлеткі думаюць, што джаз — гэта нудотная музыка. Але тыя, хто аднойчы пабываў на такім канцэрце, разумеюць, што джазавая музыка поўная энергіі. І шораз яна гучыць па-рознаму, спалучаючы ў сабе і агністыя рытмы, і гармонію.

Я пабывала на адным з фестывальных канцэртаў. Запомнілася выступленне амерыканскага вакаліста Ty Stephens. Ён не толькі прыгожа і прафесійна спяваў (дарэчы, выступаць пачаў у падлеткавым узросце), але і танцаваў, "запальваў" публіку. А яна была ўзрушаная: Ty Stephens не стаяў на месцы, увесь час рухаўся, здзіўляў ледзь не акрабатычнымі нумарамі. Яркім шоу ўразіла "дуэль барабаншчыкаў", калі гучалі толькі ўдарныя інструменты. Музыканты саліравалі па чарзе, жвава і дынамічна падтрымлівалі неверагодны рытм, захапляючы гледачоў.

Вельмі прыемна, што ў зале былі і дарослыя, і дзеці. Пры канцы канцэрта маленькая дзяўчынка падышла з праграмкай і ручкай да Міхаіла Фінберга па аўтограф. Пэўна, гэта была юная прыхільніца джазавай музыкі.

Біг-бэнд Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі падараваў гледачам вясёлы і бадзёры настрой, вялікую асалоду. Людзі не шкадавалі авацый, каб аддзячыць выканаўцам. Пісьменнік Г. Гаўптман сцвярджаў: "Усялякая музыка ідзе ад сэрца і мусіць зноў дайсці да сэрца". Гледачы не засталіся абыякавымі, а гэта лепшая ўзнагарода для музыкантаў.

Дар'я ПАШКЕВІЧ

БЕЛАРУСКІ САЮЗ МУЗЫЧНЫХ ДЗЕЯЧАЎ

Несталічныя навіны

Гомельскае абласное аддзяленне БСМД

Леташняй восенню ў абласным цэнтры на базе Палацава-паркавага ансамбля Румянцавых і Пашкевічаў створана "Румянцаўскае таварыства", прызначанае садзейнічаць развіццю г.зв. "салоннай культуры", аб'яднанню творчай інтэлігенцыі Гомельшчыны, ладзіць адметныя сустрэчы і канцэрты. Агульныя мэты абумовілі цеснае супрацоўніцтва новага таварыства з Гомельскім абласным аддзяленнем Беларускага саюза музычных дзеячаў. 9 студзеня ў Белай зале Палаца на высокім духоўным і творчым узроўні з вялікім поспехам прайшоў дабрачынны Калядны канцэрт. У ім удзельнічалі заслужаная артыстка Беларусі, лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне", старшыня абласнога аддзялення саюза Галіна Паўлянок; лаўрэат міжнародных конкурсаў Камерны хор Гомельскай абласной філармоніі (мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор — член БСМД Алена Сакалова); лаўрэат рэспубліканскіх конкурсаў, член БСМД Вольга Мацкевіч (фартэпіяна); узорны хор ДМШ № 1 "Звонкія галасы" (мастацкі кіраўнік і дырыжор, член БСМД Галіна Крэс) і інш.

▼

16 лютага ў канцэртнай зале гомельскай Дзіцячай музычнай школы № 1 імя П.Чайкоўскага адбыўся канцэрт-рэквіем памяці заўчасна спачылага дырэктара школы Уладзіміра Курыліна. Уладзімір Віктаравіч у 1987 —2005 гг. быў бяззменным старшынёй Гомельскага абласнога аддзялення Беларускага саюза музычных дзеячаў. Перапоўненая зала і ўсё, што гучала са сцэны, сведчылі аб памяці пра гэтага незвычайнага чалавека, музыканта, кіраўніка, сябра. Яна — у сэрцах людзей, якія мелі шчасце жыць з ім побач, супрацоўнічаць, тварыць! У канцэрце бралі ўдзел члены БСМД, у тым ліку Г.Паўлянок, Г. Крэс, М. Казлоў, А.Склема, А. Мазепін.

▼

25 лютага духавы аркестр ДМШ № 1 імя П. Чайкоўскага адзначыў сваё 25-годдзе. Сёння гэты цудоўны калектыў, кіраўніком і галоўным дырыжорам якога з'яўляецца член БСМД Сяргей Дабрыдзеней, працуе на высокім прафесійным ўзроўні, шмат канцэртуе, удзельнічае ва ўсіх мерапрыемствах горада і вобласці, мае разнастайны і шырокі рэпертуар.

В. Н.

Сябры! На вашы пытанні, якія датычаць падрыхтоўкі матэрыялаў для гэтай старонкі, адказа першы намеснік старшыні Праўлення Беларускага саюза музычных дзеячаў Наталля Васільеўна ВІТЧАНКА. Тэлефоны:
(017) 222-37-33 — працоўны;
(029) (507-55-05 — МТС;
(029) 699-32-00 — Velcom.

Брава, капэла!

Капэла хлопчыкаў Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі святкуе юбілей.

У 1968 годзе на базе коліш-няй Сярэдняй спецыяльнай музычнай школы пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (сёння — гімназія-каледж пры БДАМ) быў створаны новы калектыў. Яго заснаваў вучань легендарнага А. Свешнікава, выхаванец Маскоўскай кансерваторыі, заслужаны артыст Расіі Ігар Жураўленка. Створаны паводле прыкладу Маскоўскага харавога вучылішча, першы хор хлопчыкаў у Беларусі стаў адной з маладых галін магутнага дрэва старажытнарускай пеўчай культуры, карані якой — у шматвяковым мінулым.

Пад кіраўніцтвам Ігара Жураўленкі калектыў заняў віднае месца ў беларускай культуры XX стагоддзя: сольныя канцэрты на галоўных сцэнах Савецкага Саюза, прэм'еры твораў І.Лучанка, Э.Тырманд, Г. Вагнера ды іншых беларускіх кампазітараў, запісы на радыё і тэлебачанні, выпуск пласцінкі на Усесаюзнай фірме грамзапісу "Мелодия". Бліскуча адукаваны музыкант, яркая асоба, эксперт старажытнай музыкі, Ігар Жураўленка ўзгадаваў калектыў і прывёў яго да вышынь выканальніцкага майстэрства.

Вялікі ўнёсак у развіццё хору зрабілі таксама незабыўны дырэктар каледжа, заслужаны дзеяч мастацтваў краіны Уладзімір Кузьменка і заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі хормайстар Ігар Мацюхоў.

З 1994 года мастацкі кіраўнік хору — Уладзімір Глушакоў. (З 2006 года ён узначальвае Асацыяцыю кіраўнікоў хароў хлопчыкаў і юнакоў Беларускага саюза музычных дзеячаў).

Уладзімір Глушакоў працягнуў адметныя творчыя традыцыі хору і свайго настаўніка Ігара Жураўленкі. Змястоўнасць і дасканаласць формы музычнага ўвасаблення, штодзённы творчы пошук — вось некаторыя рысы хормайстарскага почырку У. Глушакова. Пад яго кіраўніцтвам Капэла хлопчыкаў выканала больш як 200 твораў, сярод якіх шэдэўры сусветнай музыкі: "Літургія св. Іаана Залатавуста" С.Рахманінава, "Літургія Дамесціка" А. Грачанінава, "Магніфікат" Ё.С.Баха, "Магніфікат" А.Вівальдзі, "Шпаўэр імша" В.А.Моцарта, "Абрад Кэралаў" Б. Брытэна, "Чычэстарскія псальмы" Л.Бернстайна (першае выкананне ў Беларусі). Лепшыя творы з рэпертуару запісаныя на чатырох кампакт-дысках.

Асаблівае месца ў творчасці Капэлы аддадзена беларускай музыцы. Менавіта прадстаўляючы канцэртныя праграмы твораў нацыянальных кампазітараў А. Багатырова, А. Туранкова, А.Мдзівані, В. Кузняцова, Л. Захлеўнага, А. Атрашкевіч, В.Вараб'ёвай, калектыў вылучаўся на сусветных спеўных форумах і сабраў калекцыю прызоў найвышэйшай пробы: залатыя дыпломы на міжнародных конкурсах у ФРГ (1998, 1999 гг.); Гран-пры міжнароднага конкурсу "Магутны Божа" (2004 г.), Гран-пры канцлера ФРГ на конкурсе "Гармонія" (2006 г.). За прэзентацыю беларускай харавой культуры на міжнародных фестывалях і конкурсах Еўрапейская федэрацыя харавых саюзаў (Брусель, Бельгія) надала калектыву ганаровае званне "Культурны пасол Беларусі ў Еўрасаюзе", а ў 2006 годзе хор быў адзначаны Гранд-прэміяй спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Сёння Капэла хлопчыкаў радуе слухачоў выступленнямі на самых галоўных сцэнах нашай краіны: у Палацы Рэспублікі, у Беларускай дзяржаўнай філармоніі, ва ўсіх абласных цэнтрах, а таксама — у Вялікай зале Маскоўскай кансерваторыі, у Домскім саборы Рыгі, у канцэртных залах Польшчы, Галандыі, Францыі, Вялікабрытаніі, Бельгіі, Люксембурга, Італіі, Германіі, Швейцарыі.

З юбілеем цябе, Капэла!

Міхась ДРЫНЕЎСКІ, старшыня праўлення Беларускага саюза музычных дзеячаў, народны артыст Беларусі, прафесар

На здымках: на канцэрце капэлы пад кіраўніцтвам У.Глушакова; хор хлопчыкаў, арганізаваны І. Жураўленкам.

Гучыць класіка ў музеі

"Сакральная музыка Беларусі і Заходняй Еўропы XVI—XVIII стагоддзяў" — так называўся першы канцэрт з твораў класікі, праведзены ў межах творчага праекта "Музыка ў музеі", арганізаванага БСМД. Мастацкі кіраўнік праекта — старшы выкладчык Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Наталля Сазановіч.

Гэтая праграма прагучала ў філіяле Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь — музеі "Дом Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX ст.".

Філіграннае прачытанне стылю твораў эпохі барока (А. Скарлаці, Д. Пергалезі), малавядомых сакральных твораў беларускіх і заходнееўрапейскіх кампазітараў XVI — XVIII стст. (Л. Клары, Н.Ніко-Каро) вызначала выкананне дуэта Ірыны Гаўрылковіч (вакал) і Наталлі Сазановіч (фартэпіяна). Велізарнае задавальненне адчувалі слухачы ад мяккага і выразнага спявання маладой вакалісткі І. Гаўрылковіч.

Другі канцэрт адбыўся ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі пад назвай "Ад барока да рамантызму". У тонкай, стылістычна дакладнай манеры былі выкананыя творы кампазітараў адпаведных эпох (дуэт у складзе спявачкі І. Гаўрылковіч і піяністкі Н. Сазановіч). Фартэпіянны дуэт Н. Сазановіч — Н. Кірдань віртуозна выканаў "Усходнія малюнкі" Р.Шумана, "Звон-польку" А. Ельскага, а таксама складаны рамантычны твор малавядомага нямецкага кампазітара XIX ст. К.Маера "Вянок з руж". На завяршэнне паэтычна прагучалі мазуркі класіка рамантызму Ф. Шапэна (Н. Сазановіч).

Асноўная мэта новага праекта — упісаць класічную музыку ў духоўную прастору вялікіх музейных каштоўнасцей, стварыць мадэль жывога, дзейнага і адметнага творчага арганізму ў музеі, адрадзіць у гукавой інтанацыі свет музычнай эстэтыкі барока, класіцызму, рамантызму, мадэрну ды іншых культурных эпох мінулага, дасягнуць гармоніі чыстага эстэтычнага сузірання ў музейным сінтэзе мастацтваў.

Гэты праект ажыццяўляецца на працягу 2009 года ў розных музеях Мінска і іншых гарадоў краіны. Беларускі саюз музычных дзеячаў і аўтар творчага праекта "Музыка ў музеі" шчыра запрашаюць на будучыя канцэрты ўсіх, хто шануе гістарычную мастацкую спадчыну.

Наталля ВАСІЛЁНАК

На здымку: інтэр'ер Дома Ваньковічаў.

Беларускае — для фартэпіяна

З сакавіка Беларускі саюз музычных дзеячаў і Беларускі саюз кампазітараў арганізавалі канцэрт, прысвечаны 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Натхнёна і з высокім прафесіяналізмам вучні фартэпіяннага аддзялення Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі выканалі рэдкія ў сённяшняй канцэртнай практыцы творы айчынных кампазітараў Я. Цікоцкага, Л. Абеліёвіча, Я. Глебава, У. Алоўнікава, Г.Вагнера, У. Дамарацкага, К.Цесакова, В. Войціка, Г.Гарэлавай, В. Карэтнікава, Л. Мурашкі, А.Безенсон. Аўтар праекта і вядучая канцэрта — загадчыца аддзялення, вялікі знаўца і прапагандыст беларускай музыкі Ларыса Васільева.

Арцём КУМЕЛЬСКІХ

Нашы юбіляры

ЗЯЛЕНІН Вячаслаў Міхайлавіч — прафесар кафедры скрыпкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Аўтар шматлікіх вучэбна-метадычных дапаможнікаў, сярод якіх "Я і скрыпка", заснаваны на беларускім фальклорным матэрыяле ды інш. Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР, знакам "Выдатнік культурнага шэфства над Узброенымі Сіламі", Ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

ПРАВАТОРАЎ Генадзь Панцеляймонавіч — народны артыст Расіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, оперны і сімфанічны дырыжор. Пад яго музычным кіраўніцтвам пастаўлены шэраг спектакляў на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, ажыццёўлены канцэртныя праграмы ў сталічнай філармоніі, выкананне музычных прэм'ер беларускіх кампазітараў, радыёзапісы.

Сённяшні госць "ЛіМа" — прафесар факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар філалагічных навук, старшыня Рэспубліканскай экспертнай камісіі па прадухіленні прапаганды парнаграфіі, насілля і жорсткасці, кінакрытык Ніна ФРАЛЬЦОВА.



У Беларусі ёсць і начныя, і стрып-бары

— Ніна Ціханаўна, пазнаёмце, калі ласка, нашых чытачоў з дзейнасцю камісіі, хто ў яе ўваходзіць?

— Трэба адзначыць, што камісія створана пры Міністэрстве культуры Беларусі з мэтай рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі, скіраванай на прадухіленне прапаганды парнаграфіі, насілля і жорсткасці, абарону грамадскай маралі, фарміраванне здаровага ладу жыцця людзей. У яе ўваходзяць прадстаўнікі дзяржорганаў і арганізацый, спецыялісты ў галіне культуры, мастацтва, медыцыны, адукацыі, інфармацыйных тэхналогій і г.д. Прыкладам, намеснік начальніка Мінскай рэгіянальнай мытні Сяргей Алейнікаў, урач-псіхіятр Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансера Дзмітрый Капусцін, начальнік прававога ўпраўлення Міністэрства інфармацыі Лілія Богдан...

У сваёй працы мы кіруемся Канстытуцыяй, законамі Рэспублікі Беларусь, нарматыўнымі прававымі актамі. А яшчэ існуе Палажэнне, якое вызначае нашы задачы, функцыі, правы і абавязкі. Ёсць таксама Інструкцыя, згодна з крытэрыямі якой адбываецца ацэнка і наступныя нашы дзеянні ў залежнасці ад прадукцыі, якая да нас трапляе. Інструкцыя распрацавана ў мэтах упарадкаванага выпуску, тыражыравання, паказу, пракату, продажу і рэкламавання эратычнай прадукцыі або той, якая ўтрымлівае элементы эротыкі, насілля і жорсткасці на ўсіх відах носьбітаў, у тым ліку і камп'ютэрныя гульні, выдавецкая прадукцыя, перыядычныя ды электронныя СМІ, тэатральна-відовішчнае і выяўленчае мастацтва. Сюды ж дадаецца ўсялякая прадукцыя па сексуальнай адукацыі і палавым выхаванні, а таксама сексуальнага прызначэння.

У ранейшыя часы да нас часцей за ўсё везлі з Расіі кнігі, усялякія так званыя камасутры, прызначаныя для сексуальнага выхавання і асветы. А для некаторых людзей такія выданні — як чырвоны колер для быка. Але ж справа ў тым, што такая літаратура асветніцкага характару, хоць і датычыць пэўнага боку жыцця. Мы глядзім, як гэта кніга выканана. Калі ў ёй няма так званых індыкатараў, прапісаных у Інструкцыі, прыкладам, натуралістычных выяў, тэкстаў, то навошта на выданні ставіць крыж. Але цяпер на іх попыту практычна няма.

Некаторыя прадстаўнікі СМІ думаюць, што ў камісіі сядзяць асобы, якія ўсё забараняюць, або ўвогуле ў нашай краіне нічога не развіваецца і не робіцца. На самай справе гэта не так.

Камісія працуе на грамадскіх пачатках, заробкаў ніхто не атрымлівае. Але ў нас сапраўдныя прафесіяналы. Да слова, у кожнай краіне ёсць падобныя органы, толькі яны могуць па-рознаму называцца. Але функцыі ў іх не "адказы на скаргі працаўнікоў", а менавіта паступовае фарміраванне пэўнай атмасферы ў грамадстве, медыясферы, сферы мастацкай культуры, сацыяльных адносін.

Да нас прыходзіць шмат людзей прадстаўляць прадукцыю. Гэта і прыватныя прадпрымальнікі, распаўсюджвальнікі, вытворцы ды іншыя. Бо жыццё прыпыніць нельга, узаемапранікненне і міжкультурныя камунікацыйныя працэсы зноў-такі ніхто не спыніць. Таксама нельга не ўлічваць, як змяняюцца самі людзі, іх адносіны да таго, на што ўчора было табу, а сёння набывае іншае значэнне. Усё павінна адбывацца на натуральнай аснове.

Асобна варта адзначыць прадстаўнікоў праваахоўных органаў, ад якіх да нас паступаюць у асноўным сістэмныя блокі, медыяэлементы. У КК РБ існуе два артыкулы: 343, 343-1, дзе прапісаныя меры прыпынення па распаўсюджванні парнаграфіі, насілля і жорсткасці. Ёсць пэўныя прэцэдэнты, якія заўсёды разглядаюцца ў судзе на аснове гэтых артыкулаў. Але праваахоўныя органы, калі сутыкаюцца з распаўсюджвальнікам або вытворцам, у якога няма ліцэнзіі, ніколі не прадпрымаюць ніякіх дзеянняў, то бок ніколі не выносяць меры пакарання. Апячатаныя ўзоры прадукцыі прывозяць на разгляд камісіі, па форме, як і патрабуецца, робім экспертызу і даём сваё заключэнне. І толькі пасля гэтага справа перадаецца следчаму і трапляе ў суд. Ды і апошнія пяць гадоў такіх спраў у Беларусі практычна не назіраецца. Зноў-такі зазначу, што наша Міністэрства ўнутраных спраў вельмі добра і станоўча працуе ў гэтым кірунку.

— Работа начных клубаў таксама ў кампетэнцыі камісіі?

— Не буду займацца прапагандай, але ў Беларусі ўсё ёсць: і начныя бары, і стрып-бары (толькі ў Мінску іх сем), якія зарэгістраваныя і даўно працуюць на легальнай аснове. Уладальнікі гэтых устаноў прытрымліваюцца патрабуемых правіл. Які ж бізнесмен захоча рызыкаваць сваёй справай? Калі хочуць паказаць новую праграму ці прадстаўленне, пішуць нам ліст, каб мы прыйшлі, паглядзелі і далі сваё заключэнне. Калі нешта выклікае сумненне, мы заўсёды гэта выказваем, калі не — у канцы такой высновы пазначаем, што нельга змяняць месца прадстаўлення, склад удзельнікаў ці рэпертуар. А калі нешта ўсё-ткі зменена, то просім нам пра гэта паведамляць. Былі такія выпадкі ў практыцы, калі паміж двума гаспадарчымі суб'ектамі з адноль-кавай назвай узнікалі канфлікты.

— Як праходзіць экспертыза аўдыёвізуальнай прадукцыі, кінастужак, літаратуры?

— Зразумела, праз нас праходзіць уся прадукцыя. Справа ў тым, што кінапракатчыкі набываюць карціны ў пакеце. Часам нават не ведаюць, што набываюць. Кінарынак для пракатнай інфраструктуры цяпер поўнасцю абмяжоўваецца Масквой. Фільмы з элементамі эротыкі для масавай дэманстрацыі на вячэрніх сеансах пазначаем "Э18". Ёсць яшчэ адно пазначэнне — чатыры зоркі (****) — гэта для кінафільмаў, дзе ёсць сцэны насілля, жорсткасці...

Часам бываюць спрэчныя моманты. Так, кінавідэапракат набыў разрэкламаваную расійскую стужку "Самы лепшы фільм", а цяпер і яго працяг. Увогуле карціна дрэнная, і блізка не мае ніякай мастацкай каштоўнасці. Там ёсць ненармаваная лексіка, дзевяць эпізодаў налічыла. Параілі "запікаць" яе. Нам спрабавалі запярэчыць, сказалі, што будуць званіць прамоўтэру. Звані! Дык навошта браць такую стужку, ад якой — ёсць яна ці не існуе — кінематограф абсалютна нічога не страціць. Адна справа, калі глядзіш дома па тэлевізары і пачуеш, а можаш і не пачуць, пару такіх слоў. А хто ж цяпер ходзіць у кіно? Згодна з ўсімі даследаваннямі і апытаннямі сацыёлагаў, гэта маладыя людзі да 30 год. І большасць іх — нежанатыя, незамужнія 20 — 23 гадоў. А калі гэта не вячэрні, а дзённы сеанс, дык і старшакласнікі наведваюцца...

Ёсць і іншы, сёлетні прыклад. Пазванілі, што кінавідэапракат набыў у пакеце фільмаў стужку "Усе памруць, а я застануся". Там таксама прысутнічае ненармаваная лексіка. Я чула пра гэту карціну, пайшла глядзець у Дом кіно. У выніку мы далі станоўчае заключэнне. І каб толькі ад мяне залежала, я б гэту карціну паказала па ўсіх тэлевізійных каналах пасля адзінаццаці вечара. Для таго, каб яе ў першую чаргу ўбачылі ўсе бацькі. Каб яны больш увагі надавалі сваім дзецям і тым праблемам, якімі жыве сучасная моладзь. Таму што фільм вельмі павучальны і выхаваўчы. І ў школах паказала б яго ў старэйшых класах, толькі асобна для юнакоў і для дзяўчат. Можа, шмат што праяснілася б у іх галовах. Але такой магчымасці няма, бо жывём у іншы час і фактычна не займаемся, як раней, кінаадукацыяй.

Цяпер балышыні насельніцтва даступныя шматлікія тэлеканалы, кабельныя сеткі, відэамагнітафоны, DVD-прайгравальнікі. І, на жаль, кінатэатры не карыстаюцца тым попытам, які існаваў раней. Але ў параўнанні з некаторымі постсавецкімі краінамі, у нас не так усё і дрэнна.

Увогуле, праз нас праходзіць уся прадукцыя — кіно, часопісы, кнігі, нават скулыптуркі, фігуркі, прэзерватывы ды іншыя прадметы. Бо ёсць прыватныя арганізацыі, якія займаюцца продажам разнастайных тавараў, што належаць да сферы інтымных адносін. Гандлёвыя арганізацыі не дазваляюць распаўсюджваць такую прадукцыю, калі няма нашага заключэння. І мытня да нас звяртаецца, але даўно не было такіх тавараў, бо на іх няма попыту. Гадоў жа дзесяць таму людзі цікавіліся, у Мінску нават было некалькі сексшопаў, якія дзейнічалі легальна, як звычайныя крамы. Але цяпер ёсць Інтэрнет, каму нешта трэба, зайшоў на сайт і заказаў: рэч даставяць прама ў кватэру.

Часам міліцыя на чыгуначным транспарце затрымлівае так званых карабейнікаў, якія ходзяць па вагонах і прапануюць адмысловыя ігральныя карты, статуэткі... Па-першае, гэта незаконны гандаль. Па-другое, прыносяць такія рэчыўныя артэфакты нам на экспертызу, каб мы вызначылі — можна лічыць гэта элементамі эротыкі або парнаграфіі ці не.

Можа быць і друкаваная прадукцыя. Напрыклад, у нас распаўсюджваецца вельмі добры часопіс "MAXIM", у якім умела, па-мастацку выкарыстоўваюцца эстэтычныя прыёмы, каб пазбегнуць натуралізму. У ім утрымліваюцца выдатныя фотаздымкі, можа быць вельмі цікавая тэкставая інфармацыя, у тым ліку пра культуру. Таксама прадаецца і "Playboy", але ён, на мой погляд, класам ніжэй за "MAXIM".

— А што за праблема з прэзерватывамі? Іх жа можна набыць літаральна ў кожнай краме...

— Патлумачу: на ўпакоўцы можа змяшчацца адмысловая карцінка. Але дзякаваць Богу, што цяпер усё спакойна прадаецца, і наш народ дапяў, што гэтым трэба карыстацца. Жыццё ёсць жыццё, поперак яго не ляжаш, можна толькі ўздоўж...

— Як фармулююцца паняцці "парнаграфія" і "эротыка"? Бо, скажам так, у людзей пурытанскага выхавання нават дэманстрацыя абдымкаў і пацалункаў выклікае абурэнне. Тое ж датычыць і літаратурных твораў.

— Падкрэслю, калі СМІ пачынаюць абмяркоўваць гэту тэму, то ў недасведчанага чалавека складваецца ўяўленне, што тут няма адрозненняў, што гэта вельмі складаная праблема, якая да таго ж і штучна нагнятаецца. На шчасце не ў нас. Усё на самай справе проста, ясна і даўно вывучана. Нават у сучасным тлумачальным слоўніку прачытаеш: *ПАРНАГРАФІЯ (ад грэч. pornos — распуснік і grapho — пішу), вульгарна-натуралістычны, непрыстойны малюнак палавога жыцця ў літаратуры, выяўленчым мастацтве, тэатры, кіно і інш. ЭРОТЫКА (ад грэч. eros — каханне, страсць), у шырокім сэнсе — сукупнасць усяго, што звязана з палавым каханнем, у вузейшым — псіхалагічныя аспекты сексуальнасці, яе развіцця і праявы ў зносінах, модзе, мастацтве і г.д.*

У старажытнасці гэта праблема таксама існавала. Стагоддзямі фарміравалася тое, што складвае хрысціянскую мараль. А да хрысціянства былі ваганні, актыўныя пошукі: дзе бруд і распуста, а дзе каханне. Так адначасова ішло станаўленне такіх сацыяльных інстытутаў, як манагамная сям'я, шлюб. Тут час змяняе толькі адно: наколькі грамадства гатовае быць крытычным само да сябе.

Адна справа — літаратурныя помнікі. Паэзія, проза — умоўнасць, а жыццёвая практыка — зусім іншая справа. Пісаць можна пра ўсё, вось толькі як пісаць. У мяне ёсць выдатны поўны збор казак "Тысячы і адной ночы", які выйшаў яшчэ за савецкім часам. Там напісана пра ўсё, але напісана алегарычнай мовай. Вось прыклад добрай літаратуры, з добрым эратычным пачаткам, якая ўлучае і тып мастацкага мыслення таго часу, і беражлівыя адносіны да чытача. Па-першае, гэта кажа пра тое, што сапраўднае мастацтва мае бязмежныя магчымасці для адлюстравання дадзенага боку жыцця. Па-другое, мастацтва не можа быць без любові і кахання, без гэтага яно нецікавае. Пытанне ў іншым: які ўзровень аўтарскіх адносін да гэтага, і якімі мастацкімі сродкамі ён карыстаецца. Нават у эпоху, так бы мовіць, схаластычнага Сярэднявечча еўрапейская культура ўсё дазваляла, але — калі гэта твор мастацтва. Выкшталцона, па-мастацку пісалі свае карціны мастакі часоў Адраджэння.

Мне пашэнціла наведаць парыжскі музей Арсэ, дзе, ведала, экспануюцца знакамітыя тры работы Г. Курбэ, на якіх выявы пэўных жаночых частак цела. У даведніку, да слова, месцазнаходжанне залы не пазначана. Але я знайшла гэты невялічкі прыцемнены пакой. Карціны вельмі ўразілі сваёй прыгажосцю, майстэрствам выканання.

— А як царква на гэта рэагуе?

— Калі ўзяць любую рэлігію свету, у кожнай з іх ёсць пэўнае агульнае ядро: захаванне чалавека ў чалавеку — тое, што мы называем этыкай, мараллю. І кожная з рэлігій асуджае пралюбадзейства. А адносіны паміж мужчынам і

Адна справа — літаратурныя помнікі. Паэзія, проза — умоўнасць, а жыццёвая практыка — зусім іншая справа. Пісаць можна пра ўсё, вось толькі як пісаць. У мяне ёсць выдатны поўны збор казак "Тысячы і адной ночы", які выйшаў яшчэ за савецкім часам. Там напісана пра ўсё, але напісана алегарычнай мовай. Вось прыклад добрай літаратуры, з добрым эратычным пачаткам, якая ўлучае і тып мастацкага мыслення таго часу, і беражлівыя адносіны да чытача.

жанчынай вітаюцца. Таму што так уладкаваны свет, гармонія прыроды — усё падвоена: холад — цяпло, чорнае — белае, дзень — ноч...

— Насілле і жорсткасць — пад такія вызначэнні падпадае пераважная большасць расійскіх серыялаў, якімі, я б сказаў, перанасычаныя літаральна ўсе тэлеканалы...

— На жаль, гэта так. Узровень кінематографа вельмі панізіўся пад уплывам розных фактараў. І галоўны з іх — на тэлебачанні ўсім кіруюць людзі, у якіх на першым месцы толькі адно — прыбытак. У выніку маем тое, што маем. На такой прадукцыі ўжо выросла цэлае пакаленне. Шмат хто з сучаснай моладзі і студэнтаў "спажывае" яе і проста не разумее, што гэта дрэнна, гэта не мастацтва, а непрафесіяналізм, тэхніцызм. Вось пасадзі паглядзець "стужку" трыццаць хвілін абсалютна любога чалавека, а потым забяспеч яго відэаматэрыялам — за паўгадзіны на камп'ютэры ён злепіць такое ж "кіно".

У серыялах здымаецца шмат "мёртвых" акцёраў. Часам сустракаеш выдатных, як кажуць, са старай школы, але разумееш, што яны там з'яўляюцца не ад добрага жыцця. На мой погляд, рэжысёры ў большасці такіх карцін прысутнічаюць толькі ў цітрах. Гучыць як пераболышванне. Рэжысёр, канечне ж, ёсць, вось толькі на здымачнай пляцоўцы ён не ведае, што рабіць з акцёрам. А ўсё таму, што не прадумвалася драматургія фільма. Сцэнарый сцэнарыем, а калі ёсць прафесійны рэжысёр, які разумее, як паставіць работу з аператарам, з акцёрамі, то, як правіла, маем і станоўчы вынік. На жаль, цяпер кожны першы лічыць сябе "талентам". Вось толькі чаму ў Еўропе і ЗША разумеюць: не можам рабіць мастацтва — не робім, займаемся іншымі справамі?

Гляджу расійскае тэлебачанне і раблю выснову, што наша ранейшая агульная радзіма стала краінай крыміналу, спажыўцоў алкаголю і педафілаў. Вельмі ж зачасцілі на НТБ рэпартажы пра педафілію, вось нядаўні прыклад: дванаццацігадовая дзяўчынка нараджае ад айчыма, яго саджаюць у турму. А яе маці наведвае яго і кажа, што хутка ён вернецца і як добра мы тады будзем жыць... Адным словам — жах! Дык чаго ж тады вартыя так званыя дэмакратыя, свабода асобы, лібералізм? Які ж атрымліваецца імідж краіны? З аднаго боку, вось такі ён і ёсць: "пазітыўная" вайна Газпрама са сваімі залежнымі партнёрамі, прафаніраваная мастацкая культура, утрыманне розных прытонаў, п'яны народ... А з другога боку, мы не можам перашкаджаць людзям жыць так, як яны таго жадаюць. Як усё-ткі добра, што мы сталі суверэннай дзяржавай.

На мой погляд, у вырашэнні ўсіх праблем патрэбная палітычная воля. Кіраўнікі СНД павінны дамовіцца: не лабіруем крымінал, а падтрымліваем высокае мастацтва. Бо і тое, што напрацавана прафесійнай культурай, можам страціць з цягам часу.

Праз пэўны час будуць жа вывучаць эпоху канца XX — пачатку XXI стагоддзя і схопяцца за галовы: гэта ж страшэнны маральны заняпад.

— Лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры 2004 года стала аўстрыйская пісьменніца Эльфрыда Елінэк са сваім творам "Піяністка" (1983). Адносіны яе галоўнай гераіні Эрыкі Кохут да музыкі, да маці, да вучня кансерваторыі, дзе яна выкладае, — усё прасякнута насіллем і агрэсіяй. Крыху раней рэжысёр Міхаэль Ханэке экранізаваў гэту кнігу. І на Канскім фестывалі ў 2001-м гэты фільм атрымаў шмат узнагарод. Прычым у каталогу кінастужка была пазначана зорачкай (чацвёрты выпадак на фестывалі за апошнія дзесяць год), папярэджваючы, што фільм можа парушыць псіхіку эмацыйных гледачоў. Гэта што — поспех, тэндэнцыя ці выключэнне?

— Думаю, што ў сусветнай культуры, асабліва XX стагоддзя, складваюцца сітуацыі, калі нешта, што супярэчыць агульнапрынятаму, але зроблена па ўсіх законах мастацтва, — прыцягвае, акцэнтуе ўвагу на тым, што гэта не прыклад для пераймання. Што на тыпізаванае нешта ў сучасным чалавеку трэба звярнуць увагу, а не праходзіць міма.

Да Другой сусветнай вайны кіно ў сваёй большасці было забаўляльным. А пасля яе ў карцінах вядомых кінамайстроў ужо фіксуюцца крайнія, экстрэмальныя, часам эзатэрычныя рэчы, якія выходзяць за межы звычайнай свядомасці. Яны важныя, бо пры пэўных умовах і абставінах могуць ператварыцца ў тэндэнцыю.

І раман, і фільм "Піяністка" на гэтым і пабудаваныя, папярэджваюць: раптам гэта стане не выдумкай, а рэальнасцю. На жаль, грамадства, нягледзячы на ўсе выпрабаванні самага багатага на страшныя падзеі за ўсю гісторыю чалавецтва XX стагоддзя, не робіць пэўных высноў. Практычна за адно чалавечае жыццё адбыліся катаклізмы як для інтэлекта, так і для душы. Так, душа павінна "трудиться" і дзень, і ноч, але не павінна пакутаваць. Узяць хоць бы нашу нацыю: калі, маю на ўвазе XX стагоддзе, якое пакаленне беларусаў жыло нармальным жыццём? Рэвалюцыя, грамадзянская вайна, падзеі 30-х гадоў, Вялікая Айчынная; у часы "адлігі" вальней уздыхнулі, як кажуць, перасяліліся з зямлянак у "хрушчоўкі" і радаваліся, потым перабудова і г.д...

— Дык ці ёсць "лекі" для чалавецтва?

Трэба задумацца, што ж на самай справе з намі адбываецца. Цяпер усе гавораць пра фінансавы крызіс. Ды пройдзе ён, нікуды не дзенецца, цяпер усе краіны між сабой шчыльна звязаныя, нібы саўдзельнікі аднаго вялікага крадзяжу (смяецца — **аўт.**). Вы лепш падумайце пра людзей, як ім жыць. Услед за класікам лічу, што толькі культура можа выратаваць чалавека. Каб я была нейкай важнай асобай-палітыкам, то кожнаму прэзідэнту свету напісала б ліст з аднолькавым зместам. Прапанавала б ім сабрацца разам і прыслухацца да голасу шматмільённай душы. Вазьміцеся за культуру, дамоўцеся між сабой, праявіце калектыўную палітычную волю, пастаўце заслону бязладдзю. Менш грошай у вас тады будзе траціцца на барацьбу са злачыннасцю. Законы прымаюцца, але папера, на якой яны запісаныя, не пабяжыць сама сябе выконваць. Размовы толькі пра еўра, долар, нафту, газ і да т.п. Яны нікуды не дзенуцца. А вось душу трэба ратаваць. І пачынаць з самых маленькіх грамадзян. У адрозненне ад іншых, наш Прэзідэнт не баіцца і не саромеецца называць чорнае чорным і ў адкрытую змагацца з усімі ганамі.

Віктар КАВАЛЁЎ
Фота аўтара

Па родным краі

Возера Безназоўнае

На захадзе Кругляншчыны за мястэчкам Шапялевічы ў лясным бары ёсць возера з назвай Святое, а вось на ўсходзе, ля вёскі Азёры, возера — безназоўнае. Так склаўся ягоны лёс, што назву яму мясцовы люд не даў, не прыдумаў. Туманавае, Плоскае, Ядранае, Крынічнае, Круглае, Доўгае — колькі існуе тых назваў азёр, але ж аніводнае да памянёнага не прыклеілася. Але значнасць возера, яго неабходная прысутнасць у прыродным ландшафце, вясковым пейзажы, побыце, зрабілася натуральнай з'явай для вяскоўцаў.

Гэтае возера для вёсак Азёры, Палыкавічы, Рамшына (апошнія дзве вёскі — суседняга Шклоўскага раёна) для тубыльцаў — Божы дар, іх багацце, нават гонар. У даўнейшыя часы, у галодны год, калі не было хлеба, мяса, глядзелі на возера, як на сваё выратаванне. Бо ў глыбіні яго знаходзіліся касякі рыбы. Вясковыя каровы ў спякотны дзень уволю напіваліся азёрнай вады, задаволеныя ішлі на пашу. Стомлены працай вясковец, прысеўшы адпачыць, доўга глядзеў на возера як на месца спакою, своеасаблівага хараства. Летнім надвячоркам ад азёрнай вады падымаўся, плыў да вёскі цнатлівы водар, змяшаны з пахам траў, кветак. Вечар накрываў белай коўдрай туману яшчэ незаснулае возера. Калі цямнелася, на хвалях гойдаліся алмазныя зоры, шэпт хваляў ледзь улоўна чуўся над возерам.

...На пачатку 80-х, увесну, калі палявыя дарогі нагадвалі квашаніну, давялося пабываць ля возера. Дзень быў хмарны, і возера быццам бы забрала палову хмар ад неба сабе. Падавалася цёмным. Высокі стары, у вылінялай ватоўцы, шэрых портках, гумовіках, заклапочана папраўляў плот і даволі ахвотна распавядаў пра сваё возера, пра трагічныя здарэнні: як патануў, праваліўшыся пад лёд, малады хлопец, як перакулілася лодка ў прыезджых рыбакоў. І глыбіню возера стары адзначыў высокую — некалькі дзесяткаў метраў. Мне прыгадвалася проза Якуба Коласа і яго паэма "Рыбакова хата". І здавалася, стары адтуль, з твора, ён коласаўскі герой... У светла-шэрай вечаровай смузе, зводдаль ад супрацьлеглага берага, хаваліся падворкі вёскі Палыкавічы. Лявей, на ўвесь неабсяжны бераг (шырыню возера) — малінавага колеру кусты лазы. Былі голыя і, пэўна, чакалі з нецярпеннем майскіх дзён, каб прыбрацца ў зялёныя кашулі. На схіле берага, пакрытага дзірваном, драмаў падмурак некалі драўлянай Азярынскай царквы, заместа якой углядаліся ў неба стройныя ліпы. Вясковая вуліца бязлюдная, цяжка было ўгадаць, ці ёсць у хатах жыхары, альбо яны пустыя? Кожную засланялі кусты, дрэвы. Сустрэча з незвычайнай азёрнай мясцінай прыемна ўразіла. Праязджаючы ля вёскі Азёры на папутцы ці аўтобусе, абавязкова павернеш туды голаў, каб убачыць, як даўняга сябра, возера. Яно хаваецца за вёскай, дрэвамі, недзе там, у нізіне.

...У 90-я, зноў жа ўвесну, праўда, сушэйшым часам, ізноў была мая сустрэча з возерам. Ля берага — будоўля. Драмаў экскаватар. Па беразе раскіданы нейкія трубы. Як потым даведаўся — з возера даставалі сапрапель, які вывозілі потым на палі пад пасевы. Ураджайнасць падвойвалася. Возера стала прамысловым аб'ектам.

...Пачатак трэцяга тысячагоддзя. 2006 год... Па-афрыканску спякотнае лета. Вяртаючыся на веласіпедзе са Шклова, хоць і стомлены быў, захацелася наведаць возера. Як яно там? Дзённая спёка ўціхамірылася, але пясок на дарозе падаваўся цёплым попелам ад вогнішча, дрэвы, кусты задыхаліся ў нагрэтым паветры. Чамусьці і на гэты раз сонца не было бачна. Шэрыя, выпрамленыя аблокі засцілалі блакіт неба і само сонца. На схіле ля царкоўнага падмурка гучна і смачна хапалі густую траву навязаныя коні. Буйныя балотныя камары населі на потную скуру. Коні адчайна адбіваліся хвастамі ад іх. За плотам з жэрдак, пра якія некалі, на маёй памяці, клапаціўся сівы стары, густа зелянеў бульбоўнік. Бліжэй да возера на агародзе лапушылася маладая капуста. Чвэрць стагоддзя прамінула, тады яму было пад восемдзесят. Дзе ж цяпер стары?

Ля берага хлапчук з вудай спрабаваў рыбацкага шчасця. Вусаты бацька, у спартыўным адзенні, недалёка ад яго таксама глядзеў на паплавок на вадзе. Вада ў возеры была цёплая настолькі, што калі абліваўся, грэла твар, рукі. Пукі — так называецца ў народзе пашыраная водная расліннасць — былі зялёныя, прамыя, высокія, кустамі тырчэлі з вады ля берага. "Няўжо і гэтае возера абмялее?" — трывожна падумалася. Жаўцела пясчанае дно ля берага. Пукоў ля берага было багата. Дваццаць год таму іх тут не бачылася, і прыбярэжная паласа вады была чыстая без аніякіх кустоў, расліннасці. Кажуць, карысна абмыць азёрнай вадой твар, рукі. Гэта і зрабіў.

Над возерам у паветры заклубілася цемра, — адметны знак наступлення ночы. Хлапчук з вудай цёр нага аб нагу, суцешваў пакусанае камарамі месца. Стомленыя ногі нылі, дарэмна просячы адпачынку — да дому дванаццаць вёрст. Попельна-шэрая азёрная вада стаяла перад вачыма і тады, калі адольваў шлях дадому. І такое ж попельна-шэрае паветра над ім, як аблічча векавой, зношанай жыццём бабулі, доўга даганяла мяне. Глабальнае змяненне клімату, — думалася, — вось і на возеры ягоны ўплыў бачны... Парнасць, пукі, кусты, попельнае паветра... Дай Бог людзям розуму, зрабіць так, каб клімат не пагаршаўся, не рабіўся шкодным для ўсяго жывога, для таго ж возера...

Але чалавек пакуль жыве, спадзяецца на лепшае!..

Уладзімір ЦІШУРОЎ

Альбом пра вілейскае мастацтва



Пабачыў свет альбом "Художественные сокровища Вилейского края" (укладальнік Святлана Чабатар). Ва ўступным слове старшыня раённага Савета дэпутатаў Яўген Ігнатовіч напісаў: "Вілейшчына — край ціхі і ласкавы. Хоць да сталіцы рукой падаць, усяго нейкая сотня кіламетраў, тут свой фон цывілізацыі, свой этнічны каларыт, асаблівыя адносіны да гістарычнай памяці".

Адносіны да гістарычнай памяці тут і сапраўды асаблівыя. У раёне захавалася мала помнікаў архітэктуры. У самой Вілейцы адсутнічае выразны гістарычны цэнтр, які маецца, да прыкладу, у Навагрудку ці ў Гародні. "Вось чаму як сродак самаабароны ад рэцыдыву забыцця Вілейшчына ўзводзіць на сваёй зямлі памятныя знакі, стварае мемарыялы, — працягвае Яўген Антонавіч, — праз іх з вечнасці да нас вяртаюцца забытыя імёны".

"Художественные сокровища..." складзены такім чынам, каб спачатку пазнаёміць чытача з гісторыяй самой Вілейкі. Асобныя артыкулы прысвечаны святыням горада. І не дзіўна, бо менавіта храмы з даўніх часоў з'яўляюцца пляцоўкай для рэалізацыі майстэрства іканапісцаў, архітэктараў, скульптараў. А далей ідуць артыкулы пра мастакоў, чый лёс звязаны з гэтым кутком Беларусі, ды рэпрадукцыі іх карцін і фотаздымкі скульптур і помнікаў. Нікадзім Сілівановіч, Лейба Альпяровіч, Уладзіслаў Страмінскі, Анатоль Арцімовіч, Барыс Цітовіч, Юрый Герасіменка-Жызнеўскі, Уладзімір Слабодчыкаў... Усіх — шаснаццаць творцаў. Гэта — нямала, асабліва калі ўлічыць, што Вілейскі раён невялікі па памерах. Але і гэты пералік далёка не поўны. Няма артыкула пра народнага мастака Расіі Андрэя Сакалова (нар. у 1931), які ў канцы 70-х гадоў мінулага стагоддзя на беразе Вілейскага вадасховішча ў вёсцы Сосенка пабудаваў сабе лецішча. Гэтае лецішча ператварылася для яго ў майстэрню. Тут ён працаваў ад ранняй вясны да лістападаўскіх маразоў. Цяпер, праўда, Беларусь не наведвае — хварэе. У Вілейцы прайшло тры выставы Андрэя Канстанцінавіча. А карціну "Над Аралам", што пабывала ў космасе, ён нават падараваў мясцоваму краязнаўчаму музею. Не сустрэў і прозвішча жывапісца ды графіка Уладзіміра Гулецкага (1895—1948). Нарадзіўся ён у Вілейцы. Восенню 1928 года Уладзімір Васільевіч увайшоў у камісію для даследавання гістарычнай і мастацкай каштоўнасці Васкрасенскай ваеннай царквы ў Омску. У Паўночнай Караліне (ЗША) пахаваны мастак Пётра Нядзведскі (1918—2000), які паходзіў з Вілейшчыны... Але незавершанасць "Художественных сокровищ..." толькі дае падставы спадзявацца на з'яўленне другога, а мо і трэцяга альбома, якія на сваіх старонках цалкам адлюструюць развіццё мастацтва на Вілейшчыне ад старажытнасці і да нашых дзён. Але гэткія планы не на адзін год. А найбліжэйшыя турботы вілейскіх аматараў высокага мастацтва — адсвяткаваць у снежні 175-годдзе Нікадзіма Сілівановіча, аднаго са стваральнікаў мазаікі "Тайная вячэра" ў галоўным іканастасе Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу, за што мастак атрымаў званне акадэміка.

Сяргей МАКАРЭВІЧ

Навукоўца і педагог

У Рэспубліцы Беларусь і далёка за яе межамі шырокавядома імя доктара гістарычных навук, прафесара Эмануіла Рыгоравіча Іофе. 20 сакавіка 2009 года гэтаму неардынарнаму чалавеку спаўняецца 70 гадоў.

Педагагічная дзейнасць юбіляра пачалася яшчэ ў 1961 годзе. Апошнія 30 гадоў Эмануіл Рыгоравіч выкладае ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя Максіма Танка. Прайшоў шлях ад асістэнта да прафесара.

Пасля абароны доктарскай дысертацыі Э. Іофе атрымаў яшчэ два дыпломы аб вышэйшай адукацыі. У 1993 годзе ён скончыў Нацыянальны інстытут гуманітарных навук Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Палітолаг. Выкладчык паліталогіі», а ў 1996 годзе — Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы і гуманітарнай адукацыі па спецыяльнасці «Сацыялогія».

У 1995 годзе рэктарат Адкрытага універсітэта Ізраіля выдаў Э. Іофе сертыфікат, у якім гаворыцца, што юбіляр "паспяхова скончыў у 1993—1994 гадах курс "Катастрофа Еўрапейскага Яўрэйства".

Э. Іофе стаяў ля вытокаў Беларускай Асацыяцыі палітычных навук, членам якой ён з'яўляецца, Беларускага таварыства палітолагаў. Юбіляр — актыўны член праўлення рэспубліканскага гістарычнага таварыства і Міжнароднага фонду "Трасцянец".

З году ў год юбіляр павялічвае колькасць сваіх публікацый, стаў у выніку аўтарам больш як 1550 друкаваных прац, у тым ліку 39 кніг і брашур. Некаторыя з іх апублікаваны на англійскай, нямецкай, польскай, украінскай ды іншых мовах.

Найбольш значная праца навукоўцы ў савецкі перыяд яго навуковых пошукаў — манаграфія «З гісторыі беларускай вёскі (Савецкая гістарыяграфія сацыяльна-эканамічнага

развіцця беларускай вёскі сярэдзіны XVII — першай паловіны XIX ст.)", якая ўбачыла свет у 1990 годзе.

У савецкі перыяд юбіляр распрацоўваў таксама ваенна-гістарычную і культуралагічную праблематыку. Па гэтай праблематыцы ў яго выходзілі як навуковыя, так і навукова-папулярныя публікацыі.

З пачатку 1990-х ключавым элементам навуковых пошукаў Э. Іофе з'яўляецца гістарычная гебраістыка; сацыяльна-эканамічны аспект гісторыі айчынных яўрэяў; дзейнасць яўрэйскіх арганізацый, партый, фондаў на тэрыторыі Беларусі; катастрофа айчыннага яўрэйства ў гады Вялікай Айчыннай вайны; дачыненне беларускіх яўрэяў і іх нашчадкаў да гісторыі іншых краін.

Юбіляр займаецца адначасова і неяўрэйскай праблематыкай. Адзін з аспектаў — дзейнасць нямецкай разведкі, нацысцкіх спецслужбаў на тэрыторыі нашай рэспублікі ў перыяд Другой сусветнай вайны — у 1939—1945 гадах. А нядаўна, напярэдадні 90-годдзя з дня ўтварэння БССР выйшла кніга прафесара, у якой змешчаны звесткі пра жыццё і дзейнасць усіх кіраўнікоў БССР.

Э. Іофе выступіў з дакладамі і паведамленнямі больш чым на 300 міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях, у тым ліку ў Расіі, Украіне, Польшчы, Латвіі, Літве, Ізраілі, ЗША.

З канца 1990-х гадоў ён член трох навуковых саветаў: член савета па абароне доктарскіх дысертацый пры Беларускім дзяржаўным універсітэце і член савета па абароне дысертацый на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці "гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання" пры Беларускім навукова-даследчым інстытуце дакументазнаўства і архіўнай справы.

Навукоўца і педагог падрыхтаваў двух кандыдатаў гістарычных навук і аднаго магістра гісторыі. Юбіляр больш дзесяці гадоў на факультэце беларускай філалогіі і культуры БДПУ імя М. Танка кіруе праблемнай групай па тэме "Роля дзеячаў беларускай культуры ў станаўленні і развіцці грамадска-палітычнай думкі на Беларусі (XII—XXI стст)". Па выніках працы групы штогод праводзіцца студэнцкая навуковая канферэнцыя, на якой заслухоўваецца 15—20 дакладаў.

Эмануіл Рыгоравіч Іофе сустракае сваё 70-годдзе, маючы ўсе падставы для гонару за пражытае жыццё. Ён адбыўся як буйны навукоўца, даўно і трывала займеў рэпутацыю выкладчыка высокага ўзроўню, на працягу многіх гадоў прафілюе сябе як актыўны грамадскі дзеяч.

Шматгадовая добрасумленная праца навукоўцы і педагога высока адзначана органамі дзяржаўнага кіравання, рэктаратам роднай ВНУ. Ён узнагароджаны медалём "За воінскую доблесць", ганаровым знакам "Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь", ганаровымі граматамі і граматамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, мінскага гарана, рэктарата МДПІ імя А. М. Горкага и БДПУ імя М. Танка.

Міхаіл СТРАЛЕЦ,
доктар гістарычных навук,
прафесар

На здымку: Эмануіл Рыгоравіч Іофе з жонкай Элеанорай Ісаакаўнай і дочкамі Галінай і Жаннай. 1980 г.

Прасякнуты дабрынёй

Цяжка сказаць, якое прызванне Анатоля Дзялендзіка было першым — медыцына ці літаратура. Яшчэ студэнтам медінстытута ён пачаў пісаць. Газета з першым апавяданнем Дзялендзіка хадзіла сярод студэнтаў — яе зачытвалі да дзірак. Пасля заканчэння інстытута ён адзінаццаць год працаваў урачом у псіханеўралагічнай бальніцы "Навінкі". Тады яго дэвізам сталі словы клініцыста мінулага стагоддзя: "Калі пасля размовы з урачом хвораму не стане лягчэй, гэта не ўрач". Такой запаведзі Дзялендзік прытрымліваўся і ў вытворчасці: яго кнігі, п'есы, сцэнарыі дапамагаюць чалавеку спазнаць сябе, а галоўнае — набыць веру і надзею.

Бясспрэчна, ваеннае дзяцінства паўплывала на станаўленне Дзялендзіка-драматурга. Ён абраў сабе высакародную прафесію ўрача, а з цягам часу змяніў яе на нялёгкі пісьменніцкі хлеб, каб словам лячыць душы людзей. Адбылося гэта ў другой палове 1950-х, калі ў друку з'явіўся фельетон А. Дзялендзіка "Наш Вова". З гэтага часу ён пачаў пісаць свае гумарэскі, апавяданні, казкі для дарослых. Паспрабаваў сябе А. Дзялендзік і ў драматургіі. Дарэчы, ужо будучы ўрачом, ён у 1963 г. завочна скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве.

Анатоль Дзялендзік упершыню звярнуў на сябе ўвагу чытачоў і аматараў тэатра п'есай "Выклік багам" ("Чатыры крыжы на сонцы", 1965). Яна зрабіла сапраўдны фурор у тэатральным жыцці рэспублікі. Гэта псіхалагічная драма ўбачыла святло рампы ў 109 тэатрах былога Савецкага Саюза, а таксама ў Польшчы, Чэхаславакіі, Югаславіі, Германіі. Па п'есе быў зняты тэлефільм "Спазнай сябе" (1972), які атрымаў Гран-пры на міжнародным фестывалі ў Варне. Анатоль Дзялендзік напісаў некалькі сцэнарыяў для тэлевізійных і мастацкіх фільмаў, сярод іх — славутая карціна "Анастасія Слуцкая" (2001). Цікавасцю да чалавека прасякнуты таксама і іншыя п'есы пісьменніка.

Пасля выхаду ў свет п'есы "Начное дзяжурства" Дзялендзік пераключыўся пераважна на камедыйныя жанры. Выпадковасць гэта ці заканамернасць? Хутчэй за ўсё — заканамернасць, бо драматург-Дзялендзік сваімі камедыямі робіць тое ж самае, чым займаўся Дзялендзік-псіхатэрапеўт. Толькі сродкі выкарыстоўвае розныя. Ледзь не панацэяй ад усіх хвароб ён лічыць... смех. Дзялендзік заўжды застаецца аптымістам, і яго камедыі "Амазонкі", "Аперацыя "Мнагажэнец", "Аўкцыён", "Дурнічка", "Султан Брунея" прасякнуты дабрынёй і святлом, а галоўнае — гумарам. Іх аўтар лічыць, што ў наш няпросты час "патрэбна суцяшальная драматургія".

Кацярына ВАРАНЬКО

Жанчына-легенда

Светлы юбілей Ларысы Лявонцьеўны Кароткай — яе 90-годдзе — добрая нагода асэнсаваць жыццёвы і творчы шлях жанчыны-легенды Беларусі, чулага і прынцыповага чалавека, удзельніцы антыфашысцкага падполля, партызанкі, глыбокага вучонага-медыявіста, таленавітага выкладчыка.

З цеплынёй і любоўю ўспамінае Ларыса Лявонцьеўна сваіх бацькоў — Лявонція Кандратавіча і Вячаславу Юльянаўну, якія вучылі дабру, спагадзе, узаемадапамозе і працавітасці. У 17 гадоў пасля заканчэння няпоўнай сярэдняй школы ў Астрашыцкім Гарадку пачала яна сваю працоўную дзейнасць як выкладчыца рускай мовы і літаратуры рабфака БДУ, а пасля заканчэння Мінскага педінстытута ў 1938 годзе і да Вялікай Айчынай вайны выкладала рускую і беларускую мовы і літаратуры ў школе Астрашыцкага Гарадка. У час ваеннага ліхалецця маладая жанчына, якая ў 1938 годзе нарадзіла свайго першынца (у будучым вядомага літаратуразнаўцу і крытыка Варлена Бечыка), змагалася ў складзе антыфашысцкага падполля ў акупаваным Астрашыцкім Гарадку, потым у складзе партызанскай брыгады "Штурмавая", была ўпаўнаважанай асобага аддзела партызанскага атрада "За Айчыну". В. Сіманава ў аповесці "Мы будзем жыць" (1971) паказала ўсе выпрабаванні і жахі фашысцкага гестапа, якія перажыла Ларыса Лявонцьеўна. Здзекі фашыстаў не зламалі мужную жанчыну, яна выжыла...

За баявыя заслугі Л. Кароткая ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені, шматлікімі медалямі. Партызанскія сябры — жаданыя госці ў яе хаце. Пасля вызвалення Беларусі Ларыса Лявонцьеўна працавала ў школах Астрашыцкага Гарадка, Талькаўскай і Прылуцкай школах Мінскай вобласці. Са сваімі былымі вучнямі яна сябруе і па сённяшні дзень. Першыя артыкулы прысвечаны праблемам школы — "Любіце працу" (1946), "За родную школу" (1947), "Абмен вопытам работы" (1948).

У 1955 годзе Ларыса Лявонцьеўна паступіла ў аспірантуру Беларускага дзяржаўнага універсітэта і ў 1963 годзе бліскуча абараніла кандыдацкую дысертацыю. У час працы над дысертацыяй яна шмат працавала ў бібліятэках г. Ленінграда, пасябравала з акадэмікам Д.С. Ліхачовым. З любоўю захоўвае Ларыса Лявонцьеўна кнігі вучонага, якія вылучаюцца не толькі глыбінёй і тэарэтычнай навізной, але і цёплымі надпісамі да яе як аднаго з першых беларускіх медыявістаў. За амаль пяцідзесяцігадовую працу на філалагічным факультэце БДУ яна таленавіта выкладала старажытнарускую літаратуру і рускую літаратуру XVIII ст. Лекцыі Ларысы Лявонцьеўны вылучаліся змястоўнасцю і яркім аратарскім майстэрствам, яна любіла студэнтаў, а далёкія старажытныя рэаліі і вобразы ажывалі, бо выкладчыца знаходзіла шматлікія аналогіі ў сучасным жыцці, валодала тонкім гумарам.

Неаднойчы яна гаварыла пра вялікую адказнасць выкладчыка і высакароднасць нашай прафесіі. Мы працуем з маладымі і таленавітымі людзьмі, таму ўвесь час трэба самаўдасканальвацца, каб данесці да студэнцкай аўдыторыі "съкровища вечныя жизни". Традыцыі аднаго з самых аўтарытэтных беларускіх медыявістаў працягваюць яе вучні, многія з якіх сталі вядомымі вучонымі — прафесар Т. Я. Аўтуховіч, кандыдат філалагічных навук Л. В. Ляўшун і іншыя.

Ларыса Лявонцьеўна напісала больш за 100 навуковых прац — манаграфіі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, хрэстаматыі, навуковыя артыкулы па праблемах рускай і беларускай літаратур, а таксама пра сучасных беларускіх пісьменнікаў і паэтаў — А. Лойку, Н. Гілевіча, П. Панчанку; з любоўю працавала над "Выбранымі літаратурна-крытычнымі артыкуламі Варлена Бечыка" (1989). Ларыса Лявонцьеўны , акрамя таго, — аўтар цудоўных вершаў для дзяцей, якія выходзілі асобнымі выданнямі, а некаторыя друкаваліся ў календары "Родны край".

Л. Кароткая заўсёды захапляе нас пошукам, творчасцю, высокай маральнасцю і шчырасцю. Кожны чалавек для яе цікавы і непаўторны, усё жыццё яна дапамагае слабым людзям, не церпіць хлусні і здрады. Колькі духоўнай сілы ў гэтай элегантнай і прыгожай жанчыны!

У гэтыя юбілейныя дні шчыра зычу дарагой Ларысе Лявонцьеўне моцнага здароўя, творчага натхнення і шчасця!

Таццяна КАЗАКОВА,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ

Старонка талышскай паэзіі

Чытаючы вершы іншаземных паэтаў, заўсёды думаеш пра тое, якой сілы гучання іх уласныя мастацкія адкрыщці на роднай мове, у прасторы роднага слова. Узнікае жаданне паслухаць мелодыку, разабрацца ў музычнай канструкцыі паэтычных знаходак. Ці дапамагае гэта зрабіць пераклад? Асабліва — у тым выпадку, калі пераўвасабленне адбывалася праз знаёмства з падрадкоўнікам? Але ж які іншы маем шлях, каб пачуць увесь свет?..

Прадстаўляючы талышскіх паэтаў (талышы — народнасць, якая жыве ў Азербайджане), узгадваецца перакладчыцкі вопыт вядомага рускага паэта Арсенія Таркоўскага. Самаахвярнасць, з якою аддаваў ён сябе Усходу, усходняй паэзіі, выклікае захапленне і здзіўленне. І, канечне ж, у каторы раз нагадвае пра веліч той, усё ж такі далёкай ад нас моўнай і нават увогуле інтэлектуальнай, культурнай прасторы, якую спрабавалі і спрабуюць асвойваць беларускія паэты ды перакладчыкі розных пакаленняў. Уладзімір Дубоўка (пераўвасобленыя ім газелі Саіда Шырвані гучаць наўздзіў свежа і сучасна), Алесь Звонак, Сцяпан Ліхадзіеўскі, Максім Танк, Эдзі Агняцвет, Сяргей Грахоўскі, Алег Лойка, Васіль Зуёнак, Рыгор Барадулін, Васіль Жуковіч, Любоў Філімонава...

Як перакладзены лепшыя здабыткі талышскай паэзіі, меркаваць чытачу, які ведае родную, беларускую, мову. Пэўна, усё ж гэта галоўнае, калі думаеш пра ўзбагачэнне ўласна нацыянальнага — пераканаўча сказаць пра іншы свет па-беларуску...

Зульфугар АХМЕДЗОДА

Мінулыя дні
(урывак з паэмы)

Мора з аднаго боку, з другога — горы.
Рай, пра які гаворыцца, вось ён тут.
Раніцай сонца ўзыходзіць з-за мора,
На вершалінах, на кветках творачы цуд.
Дрэвы цвітуць, заліваюцца птушкі.
Зіхаціць жывая раса на лістах.
Зіхацяць вяршыні гор небасяжных
Радаснае святло раскашуецца на лугах.
Зіхаціць вада, рупячыся без адпачынку,
На прапелер кола ліючыся ўвесь час,
Зіхаціць вясёлкамі вясёлае кола,
Рассыпаючы за алмазам алмаз.
Апавітыя сонцам талышскія сёлы,
Вокны ў вочы яму пазіраюць смялей.
Чоўны з белымі ветразямі на моры
Заплываюць за далягляд смялей.
Хвалі іх то сюды, то туды кідаюць.
Вітанні чоўнам шлюць берагі.
Рыбаловы ідуць на ўлоў багаты.
Мора для іх, як тыя лугі.

Жыццё талыша
(урывак з паэмы)

Талышскі край — мая Радзіма
Згубілі лік твае вякі.
Ды шмат яшчэ людзей, якія
Не ведаюць, хто ты такі.
Які багаты ты, якія
Твае лугі, твае лясы,
Сцяжыны горныя крутыя,
Сады — закладнікі красы.
Там салаўі гараць ад жарсці,
Там што ні дыня — шар зямны.
Нідзе не ўчуць такога рэха
І не сустрэць такой вясны.
Там яблыні, як маладухі,
Снег цёплы рысавых палёў.
Там, як алмаз неразгаданы,
Вада вясёлых ручаёў.
Хапіла б свету рыбы, качак.
Тут кветкі весняць твой настрой.
Сюды лятуць здалёку гусі
Знаёміцца з тваёй зімой.
Гасцей крылатых ты прымаеш,
Мясцін багатых досыць маеш.

Йадула САЙАД

Мая мова

Ты маё салаўінае слова,
Талышская мова.
Мова маці маёй,
Мова братоў і сясцёр.
У свеце між іншых моў
Не хавайся, не стань нямою.
Сягай да зор!
Талышская мова,
Ты мая душа,
Мая кроў.
Ты мой дом, майго роду,
Майго народа апора,
Духу майго прастора.
І калі ты некаму горкая ад бяды,
Мне ты салодкая заўсягды.

Калі ты знікнеш, дык не стане й мяне,
Цемра прадоння загльне.
Калі ты знікнеш, не перажыву загану,
Зданню ў свеце халодным стану.
Толькі ўпоплеч з табою.
Магу падужацца з Нябёсамі і з Зямлёю.

Мая салодкая Родная мова,
Асноў аснова.
Між іншых моў
не заўважаная пашанаю,
Чаму ты такая рахманая?
На сходах вялікіх дзе і калі
Месца табе далі?
Талышская мова мужная ў бараціьбе,
Не гоіцца лютая рана ў цябе.
Чаму баішся выгукнуць Слова сваё?
У сябе заглыбляешся, прэчыш абразу.
Скажы, цябе якое прынізіла гадаўё?
Ледзь успыхнула ты, цябе патушылі адразу.

Краявід талышскай зямлі.

Над калыскай маіх дзядоў
Спявай салодка.
Выкінь смялей
Абразлівую загародку!

Талышская мова,
Ты сонца майго жыцця.
Душа мая, лёс мой, сон вясновы
Святло ў цямрэчы, трывалыя карані,
што сілу даюць глыбіні.

Калі знікнеш ты, дык не стане й мяне,
Цемра прадоння загльне.
Калі знікнеш ты, не перажыву загану,
Зданню ў свеце халодным стану.
Толькі ўпоплеч з табою
Магу падужацца з Нябёсамі і з Зямлёю.

Талышская зямля

Вусны стагоддзяў славяць цябе.
Горны абсяг твой — мудраю кнігаю.
Гонар вяршыняў, сумленне маё,
Вера мая і мая рэлігія —
Талышская зямля.

Доўга жывуць тут, бо жыць не ў цяжар.
Тут і зімою, і восенню хораша.
Цела й душу лекуеш мілатой,
Шлях з нябёсамі зоркамі зорачы, —
Талышская зямля.

Маю адно жыццё, ды яго
Я ахвяраю Радзіме з ахвотаю.
Грэеш азяблых сваёю пяшчотаю
Родная наша матуля —
Талышская зямля.

Конь смерці

Ты гордачолых ставіш на калені,
Ператвараеш волатаў у цені:
Па трупах скачаш,
свет падступна йначыш,
Конь смерці.

Да кожнага ты грукаешся ў дзверы.
Каму на ўратаванне даў намеры?
На маладых для зубы точыш зубы,
Конь смерці.

Ты забіраеш лепшае з сабою,
А пакідаеш за сабой благое.
Хаціны рушыш, лёс нявінны душыш,
Конь смерці.

Ты звык, як злодзей, красціся патайна,
Раструшчваць сонцы мрояў капытамі.
Для змрочных напамінаў след пакінуў,
Конь смерці.

Лёс ахінецца чорнаю журбою,
Аднойчы мы сустрэнемся з табою.
Нам на пакуты люстасцю падкуты
Конь смерці.

Алі НАСІР

Спявай, талышскі салавей!

Вароны гнёзды ўюць на нашых дрэвах.
Сава штоноч кутіча без надзей.
Дакуль сарокі будуць нас даводзіць?
Спявай смялей, талышскі салавей!
Здаўна сцюдзёна
Каркаюць вароны.
З чужою моваю
Прыльтны грай.
Ты гаспадар адзіны ў гэтым садзе.
Нам па-талышску жарсна праспявай!

Галовы кветкі хіляць пад калючкай,
Бы сэрцы нашыя ў іх на плячах.
Лёг пыл і прах на векавое дрэва.
Спявай кунежна, наш салодкі птах!
Гэй, жаўтагрудзы, ўся твая арэна.
Хай спеў крыляе пад крылом начы.
Прысядзь пад выгінастаю галінай,
Трывогай нашы сэрцы апячы.
Тых скалынай, хто спіць, трасі рахманых,
Агонь у сэрцы ціхіх сып жвавей.
Апалены нязгасным парываннем,
Наш неспакой, талышскі салавей.
Ты верны нам, ён твой, увесь наш край.
Нам па-талышску, горда праспявай!

Талышскія палі лагодзіць поўня.
Гайдае вецер дрэвы, зябнуць цені.
Ўсё шчыра голасам тваім спявае,
Салодкі салавей,
ты ўвесь з натхнення.
Салодкі салавей,
ты ўвесь з пяшчоты,
Не ведай ні дакукі, ні журботы.
Будзь радасны,
Спявай для нас вясёла.
Хай расцвітае ўсё як ёсць наўкола.
Хай сэрцы шчодра поўняцца святлом.
Хай голас твой лунае з краю ў край.
Нам па-талышску ўзнёсла праспявай!

Пяюць пад поўняй качкі па-талышску.
Ім па-талышску пляскаюць лісціны.
Пяюць Ваяру воды па-талышску.
Салодкі салавей мой, ты адзіны.
Расплюшчы вочы,
Пачынай гаворку.
Заснулых разбудзі,
Тугу развей.
Уладна адамкні
Раты нямыя,
Наш жаўтагрудзы,
Родны салавей.
Звіні, вястун вясны,
Твой спеў прарочы.
Спявай у нашым краі
Ўдзень і ўночы.
Зняверaным прамень надзеі дай.
Нам па-талышску зорна праспявай!

Забіл МАДОЖ

Не бачу

Выміраем у свету ўсяго на вачах.
Нас сцігуюць рапіры і шаблі.
Скарацелі, як корцікі, мы і аслаблі.
Не скарыцца бязлюднікам — цвёрды шлях.
Не бачу іншага выйсця.

Барацьба — ад Прарока ў спадчыну нам.
Ён не меў аніколі да ворага жалю.
Да каго мы ўрэшце падобнымі сталі?
Не магу прачытаць у людскіх вачах.
Не бачу іншага выйсця.

Як сланечнік народ стаў. Чым хворы ён?
Свет як той чарназём, як крутая дарога.
Марна жыць, не спазнаўшы сябе самога.
Дзень і ноч кажу я пра кон і пра скон.
Не бачу іншага выйсця.

Львы, драконы — харобрыя нашы сыны.
Іх нязломных наперад мы пасылаем.
Як пагроза навісне над родным краем
Стаць апорай грознай мусяць яны.
Не бачу іншага выйсця.

Прачніцеся, ў ворага шмат рагатай радні.
З рагамі вострымі
злыдзень зрабіўся шалёным.
Два рагі яшчэ выраслі ў жываце ягоным.
Я не проста так кідаю ў яго камяні.
Не бачу іншага выйсця.

Я — Мадож. Я чытаю да начы ўваччу
Капаю магілу ворагу разам з вякамі.
Расчэсваю валасы народу сваімі рукамі.
Я Ўсявышняму дзякую,
няўдзячным быць не хачу.
Не бачу іншага выйсця.

Бахціяр РУШЫН

Маці родная

Для вандравання зімою, рэчы свае збірала,
Загарнула ўсе болі свету ў сціплы хатуль.
Не ведаў я, ў які ты край падалася.
Калі ты вернешся з вандравання адтуль.
Адгукніся на голас мой, маці родная!

Я прыйшоў,
калі твар твой зрабіўся халодным,
Пацалаваў прыгожыя вочы твае.
Я застаўся, як рэха ў гарах, сіратою.
Холад гнязда сірочага не адтае.
Адгукніся на голас мой, маці родная!

Вярталіся ўжо з магільніка людзі.
Не паспелі яны ў дом прыйсці да нас,
Я зноўку пабег да тваёй магілы,
Лямантуючы:
«Мама, мамачка, дзень мой згас!»
Адгукніся на голас мой, маці родная!

Той ноччу я задрыжэў
пад цёплаю коўдрай.
Як быццам сам я ляжу ў магіле нямой.
Я — восень, дзе з дрэў паабляцела лісце
Калі ж ты прыйдзеш да нас з вясной?
Адгукніся на голас мой, маці родная!

Руку тваю ўжо не абшчаплю абераў.
Пільнуе мяне жалоба сляпой савой,
З вачэй маіх слёзы ліюцца патайна і яўна
Без цябе аблівaецца сэрца маё крывёй.
Адгукніся на голас мой, маці родная!

Прысніў цябе ў апошні аўторак года
Аздабляў твае строі кветкавы спеў.
Ты маўчала адно, колькі б я не пытаўся.
Толькі прачнуўшыся,
што гэта сон, зразумеў.
Адгукніся на голас мой, маці родная!

Мая дачка малодшая
да цябе падобная дужа,
Напярэдадні свята Наўруза
малюе святочны пірог.
Цётка Феза дорыць ёй радасныя каралі,
Цёпла мовячы:
«Мама, бабуля, пачуй цябе Бог!»
Адгукніся на голас мой, маці родная!

Ты ніколі не ўкрыўдзіла і галінку на дрэве,
Асланяла сэрца пакрыўджаных ад бяды.
Ты наведвала ўсіх, боль іхны чула.
Панавітай паненкай
ачувалася заўсягды.
Адгукніся на голас мой, маці родная!

Я — Бахціяр,
сэрца маё перапоўнена болем.
Не баюся смерці, а яна мой парог не мінe.
І калі памру, дык у зямлі халоднай
Ты сагрэеш, як некалі на зямлі, мяне
На голас мой адгукніся, маці родная!

Пераклаў з талышскай мовы
Андрэй ГАЙКО

Уладзімір МАЦВЕЕНКА. Нарадзіўся ў 1928 годзе ў Мінску. Да вайны скончыў 5 класаў і жыў з сям'ёй у акупіраванай немцамі сталіцы. У 1946 годзе скончыў сямігодку і Мінскі політэхнікум. Служыў у СА (1948—1951). Працаваў рэтушорам-травільшчыкам, а пасля старшым інжынерам аддзела камплектацыі на Мінскім прыладабудаўнічым заводзе. Адначасна (завочна) скончыў медвучылішча (1956), атрымаўшы прафесію зубнога тэхніка. З 1958 года працаваў зубным тэхнікам у мінскай стаматалагічнай паліклініцы № 3, а з 1963 года — тэхнікам-артадонтам у Мінскай абласной стаматалагічнай паліклініцы.

Пісаць пачаў з 1973 года. Дэбютаваў як лірычны паэт, аднак перапыніў літаратурную дзейнасць і толькі ў даволі сталым узросце вярнуўся да яе як дзіцячы паэт і сатырык. Быў аўтарам шматлікіх калектыўных зборнікаў для дзяцей і зборнікаў сатыры. Выдаў кнігі "Лекі без аптэкі" (1987), "Азбука ў загадках" (1992), "Загаданачка" (1993), "Сябрынка" (1995), "Сорак скорагаворак" (1998), "Загадкі з хаткі дзеда Уладкі" (1999), "Дабранач (2003). Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра.

Нядаўна выйшла з друку яго рознажанравая кніга вершаў, песень, казак і загадак для дзяцей малодшага школьнага ўзросту "СТАРОНАЧКІ З МОЎНАЙ СКАРБОНАЧКІ" (выд-ва "Мастацкая літаратура", рэдактар Ю. Пацюпа, мастак Н. Кійко, 225 стар., 2000 экз.)

"Пісаць для дзяцей — гэта асаблівая радасць. Дзеці падоўжылі мне і мой век, цяпер ужо не ведаю — на шчасце ці на бяду, але ўпэўніўся і па сабе і па ўсіх, хто любіць дзяцей, душу за імі роніць — усе даўгалетнікі. Паміраем мы адзін раз, але затое колькі разоў нараджаемся! І не толькі разам са сваімі дзецьмі, унукамі і праўнукамі, але і з усімі тымі, каму служым, каму аддаём сябе ў кожным новым пакаленні."

Васіль ВІТКА



Не ведаю, наколькі блізка быў знаёмы Уладзімір Іванавіч з патрыярхам дзіцячай нацыянальнай літаратуры, уганараваным міжнародным дыпломам імя Х.-К. Андэрсена, Васілём Віткам. Але тое, што яны нават знешне падобныя, не кажучы ўжо пра асобныя характэрныя рысы, прынамсі ў мяне не выклікае абсалютна ніякіх сумненняў. Я добра памятаю Цімоха Васільевіча, быў апошнім, хто рабіў з ім жывую гутарку для часопіса "Крыніца", якую ён, на жаль, ужо не паспеў прачытаць. Памятаю яго мяккую лагоду ў голасе, цеплыню вачэй, душэўную раўнавагу і простасць у словах. Дык вось, калі ў мой лімаўскі рэдакцыйны пакой заходзіць Уладзімір Мацвеенка, я міжволі ўспамінаю Васіля Вітку, і мой самотны настрой адразу мяняецца да лепшага. Скажу пад сакрэтам, што Уладзіміру Іванавічу перакінулася за восемдзесят, але пабачыўшы яго чырванашчокі твар, фізічна выпраўленую рухавую постаць, жывасць і жыццярадаснасць у голасе, вы ніколі не дасце яму гэтага пашанотнага веку. Ну, семдзесят... А дзеці, пачытаўшы творы, пэўна, і не задумваюцца над яго гадамі. Зрэшты, а хто лепш за дзеда казку распавядзе, байку раскажа, верш пачытае? Бо ж нечым няўлоўным яго зборны вобраз напамінае нам яшчэ і казачнага "доктара Айбаліта" (прыгледзьцеся да фота).

А калі сур'ёзна, то літаратурны лёс У. Мацвеенкі складаўся не проста, фігуральна кажучы, зігзагамі. Бо пісаў ён і друкаваўся з перапынкамі. А пачаў сваю пісьменніцкую дзейнасць і ўвогуле ў сорак пяць гадоў. Некаторыя ў такім узросце, бывае, ужо закругляюцца. Але не такія, як ён.

Больш за тое, менавіта ў апошнія два дзесяцігоддзі, у гады нашай незалежнасці, ён і праявіўся ў сваёй творчасці як адзін з найбольш яркіх, арыгінальных і адметных дзіцячых пісьменнікаў. Думаю, сёння, апроч як з Міколам Чарняўскім, кажучы незабыўным стылем правадыра, яго і *параўнаць няма з кім*. І гэта справядліва, бо шмат творчай працы пакладзена ім на выхаванне маладога пакалення. Гуманная скіраванасць яго апантанай і напружанай работы ў галіне дзіцячай літаратуры, безумоўна, дае свой плён. Асабліва ў гэты наш "нялёгкі для пяра час", калі ёсць праблемы з нацыянальнай адукацыяй, калі ўжытак беларускай мовы звужаецца, калі фундамент патрыятызму закладваецца не на спрадвечных каштоўнасцях народа, а на прагматычнасці новых павеваў глабалізацыі, з якога б то ні было боку — з Усходу ці з Захаду. Выстаяць, не зрушыцца са свайго спадчыннага месца і, у рэшце рэшт, стаць годным апанентам "сваім" і чужым "варагам" і ўсім іншым духоўным заваёўнікам — вось юдоль сучаснага беларускага інтэлігента і пісьменніка, тым больш дзіцячага. Уладзімір Мацвеенка пра гэта не забывае. Ён заўжды на варце. Яго новая кніга "Староначкі з моўнай скарбоначкі" мае такі зачын:

Са слоў, як з фарбаў,
З веку ў век
Свой моўны скарб
Склаў чалавек.
Скарб не прапаў
Пад плынню год,
Бо ашчаджаў яго
Народ.

У. Мацвеенка піша ў класічнай традыцыі. Вельмі рэдка з'яўляюцца ў яго творах сённяшняя атрыбутыка, тыя цацкі і рэчы, з якімі маюць штодзённае дачыненне цяперашнія дзеці. Але ў той жа час паэт спрабуе захаваць у "банку" іх, пакуль каротка, памяці знакавыя характарыстыкі прамінулага часу, часу маленства іх бацькоў. А заадно непарушныя ва ўсякім часе дабрыню, любоў і спагаду... І тут трэба адзначыць своеасаблівую дапамогу мастачкі Наталлі Кійко, якая ўнесла сучасныя нюансы ў традыцыйны свет твораў У. Мацвеенкі. Самае дзіўнае, што спалучэнне аказалася даволі гарманічным і, як кажуць, не парушыла цэльнасці і не сапсавала агульнага прыемнага ўражання ад іх сумеснай творчай працы. А праца аказалася багатай на сапраўдныя творчыя ўдачы — і літаратурныя, і мастацкія.

Паэт працуе ў розных жанрах дзіцячай паэзіі. Тут і проста забаўныя вершы, і калыханкі, і загадкі, і скорагаворкі, і простагаворкі, і перакруткі, і лічылкі, і каламбуры, і казкі — усяго не пералічыць. Вось уводны верш да раздзела скорагаворак:

Тата
Папрасіў Ягорку
Вывучыць
Скорагаворку.
Стаў Ягор
Яе зубрыць,
Намагаўся
Пакарыць.
Ды яна
Не корыцца —
Не
Скорагаворыцца.

Ды ні адна з іх, можа, і не завучыцца на памяць, але лёгка запомніцца сваім павучальным і ненавязлівым зместам, як, да прыкладу, гэтая:

Плясь —
Маленькі Язь
У гразь
І трапеча,
Як Карась.
— Слухай, Язь,
Не лезь
У гразь.
Ты ўсё роўна
Не Карась.

І ў якіх бы жанрах дзіцячага верша ні выяўляў сябе У. Мацвеенка, ён застаецца арыгінальным і самабытным. Паэт не падладжваецца пад "капрызы" дзяцей, ён сам прыходзіць да іх са сваімі "капрызамі". Бо ведае, што поспех у дзіцячай аўдыторыі завяваць не проста, куды прасцей яго страціць. Таму заўсёды трымае сябе ў адмысловай творчай форме, не раўнуючы як у гэтым каламбуры:

Канапаты
Баксёр
Аб канаты
Бок сцёр.
Хоць
З'явіўся фінгал,
Ён прабіўся
Ў фінал.

У Мацвеенкі ёсць унутранае разуменне дзіцячай душы, ён, як камертон, адгукаецца на ўсе яе "запыты". У яго і пацешка, і забаўлянка, і суцяшанка на кожны нечаканы паварот тонкай дзіцячай натуры. А якія трапныя метафары і параўнанні, не адцягнутыя, а блізкія і зразумелыя:

Боты раптам
Захварэлі.
І праз дзірку
Дзед Мароз
Ткнуў у бот
Халодны нос.

Альбо гэтая, цудоўная, як выдыхнутая сама па сабе, загадка:

Трапіў цвік
У цвёрды сук —
Цвік уміг
Сагнуўся ў крук.
Пацягнулі
Раз, другі.
Не! Патрэбны... (абцугі).

Не забывае ён — без пафасу, на канкрэтных жыццёвых прыкладах — напомніць дзецям пра чарнобыльскую катастрофу і папярэдзіць іх пра звязаную з яе паследкамі небяспеку нават у сённяшні час:

Чорны Боль,
У той старонцы:
Кажуць — цэзій,
Кажуць — стронцый.
І хоць вельмі
Нам карціць —
Нельга
У той лес
Хадзіць!

Аднак іншым разам аўтар "загульваецца", відаць, у маленстве быў яшчэ тым жэўжыкам (прашу прабачэння)... І піша ў вершы "Прыгожы" ўчынак" пра ўчынак дрэнны, хоць і бярэ ў двукоссе слова "прыгожы". На маё разуменне, дзеці пры самастойным чытанні на гэтае двукоссе мала ўвагі звернуць, прачытаўшы, на першы погляд, пра даволі пацешнае, а на другі — пра небяспечнае дзіцячае свавольства:

Я з Рэксам каля станцыі гуляў.
Аж бачу —
адпраўляецца састаў.
А чалавек бяжыць
з пакункам у руках,
Разява, думаю,
адстаў ад цягніка.
Тут нацкаваў я Рэкса
наўздагон,
І пасажыр... дагнаў вагон.

Як і ў гэтай вось акразагадцы:

Ёлкі-палкі, лес густы.
Лёнік крочыў паўвярсты,
А пасля, атросшы снег,
Чык — і прыгажуню ссек.
Класам яе прыбіралі,
А цяпер красуня ў зале.

Думаецца, усё ж прыроду трэба любіць і зберагаць. Няхай сабе і пад Новы год. Ва ўсякім разе, пісьменнік, няхай і міжвольна, не павінен *захапляцца* яе згубай нават пры самай крайняй неабходнасці.

Аднак, буду шчыры, гэта рэдкія выдаткі, на якія я натыкнуўся (ды і заўвагі мае, магчыма, залішне суб'ектыўныя) у даволі аб'ёмнай па змесце кніжцы. Бо па ўсіх творах У. Мацвеенкі параскіданы залацінкі метафарычнай дасціпнасці, гумару і нажытай за доўгія гады мудрасці. Але мудрасці не дагматычнай, не безапеляцыйнай, а ненавязлівай і прастадушнай, за якой стаіць жыццёвы і літаратурны вопыт. Часам кажуць: стары чалавек здзяцінеў. А між іншым, не кожнаму дадзена. Бо адзін дзяцінее, а другі ў маразм упадае. Вельмі розныя рэчы. Уладзіміру Іванавічу, можна сказаць, пашанцавала — ён з дзецьмі на "ты". Нароўні з імі гаворыць, нібыта сябе маючы на ўвазе, ім распавядае:

Доўга бавіў ён свой час
За гарамі, за лясамі.
Ехаў цэлы год да нас.
Дом напоўніў галасамі.
Мы чакалі яго ўсе,
А ў яго такая торба —
Розных цацак нам нясе.
Ох, як многа! Ах, як добра!
Засынаем,засынаем,
засынаем пакрысе.

Яшчэ раз па прачытанні, вяртаючыся да адноснага параўнання Уладзіміра Мацвеенкі з Васілём Віткам, усцешана скажу, што яно не нацягнутае адно дзеля галантнасці гэтай гаворкі, а вытрыманае ва ўсіх творчых і чалавечых характарыстыках. Мы маем пісьменніка, які годна (на дзевятым-то дзесятку!) працягвае справу знаных **старэйшын** дзіцячага цэха нацыянальнай літаратуры. *"Творы У. Мацвеенкі вылучаюцца тонкім і добрым гумарам, забаўляльнасцю, вынаходлівасцю"*, — піша вядомы крытык Ганна Кісліцына. Я дадаў бы да сказанага, што яго творы нясуць у сабе зарад стойкасці і аптымізму, маральнасці і справядлівасці, пісьменніцкай годнасці і мастацкай вартасці — усяго таго, чаго нам, беларусам, часта не стае ў нашых надзённых справах і ў перспектыўных задумках. Дзеці, выхаваныя на кніжках У. Мацвеенкі, хочацца верыць, ужо не будуць мець такіх недахопаў. І лёс іх будзе шчаслівейшым за наш. Дай Божа. У тым і палягае задача пісьменніцкай творчасці.

ЛеГАЛ

Лім

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЕДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19
Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73
Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3577
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 18.03.2009 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 1420

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 09011